№ 12 (466) 24 сакавіка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

Такога ў Беларусі яшчэ не было: на цэнтральнай плошчы сталіцы стаіць наметавы гарадок пад бел-чырвона-белымі сьцягамі. Усё пра беларускі Майдан. **Старонкі 11—30.**

# Дні Волі






АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Рэдактар-хуліган

і іншыя вязьні лукашэнкаўскіх засьценкаў.

Як судзілі галоўнага рэдактара «НН» Андрэя Дынька. **Старонка 4.**

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

Калі ад тэленавінаў сьнег выпадае ў асадак,
хоць мала хто сумняваўся ў прагнозах на гэты конт;
калі мэтрапалітэн працуе безь перасадак,
а нехта па тэлевізары ратуе ўласны азадак
з экрана ля дому з надпісам ГАРЫЗОНТ;

калі шмат тысяч мабільнікаў разам лічаць гадзіны,
тым болей ад іх на плошчы ніякай іншай карысьці —
стаяць і чакаць свабоды, бо выбар цяпер адзіны,
у велькім і бардза пажондным —
хто б там ні трындзеў! — таварыстве;

абуць на тры пары шкарпэтак цяплейшыя боты,
на злосьць халоднай вайне й атмасфэрнаму фронту,
бо выбар цяпер адзіны — стаяць і чакаць свабоды —
ад лесьвіцы ў стылі ампір да самага ГАРЫЗОНТУ.



## У нумары

### воля і пятля

Рэдактар–хуліган .......... 4

### факты і камэнтары

Мілінкевіч і Казулін: плюсы і мінусы супрацы 7

Што далей будзе з плошчай? ........................ 7

Яшчэ адзін дохлы пацук КДБ ...................................... 8

Паралізавана праца друкарні «Мэдысонт» . 8

Дзіўны сьнег .................. 8

### тэма: дні волі

Ня страшна! .................. 11

Хроніка ......................... 12

Дні і ночы волі ........... 20

Дабыць да сьвітаньня 26

Як выжыць у намёце . 27

Як нас палохалі .......... 30

### гісторыя

Дзень Волі: традыцыі сьвяткаваньня .............. 34

### аўтарскія рубрыкі

Павал Севярынец: Беларуская ўлада ....... 12

Аляксандар Класкоўскі: Выбух на Кастрычніцкай плошчы ......................... 24

Лёлік Ушкін: Рэцэпт рапсавай рэвалюцыі ... 25

ВітальТарас: першы дзень рэвалюцыі ........ 34

### музыка

Мамантовас замест Мэладзэ ........................ 36

### літаратура

Марыя Вайцяшонак: Саскочыць з ровара і спыніцца ........................ 36

**АД РЭДАКЦЫІ**

# Абвастрэньне параноі

Дзён дзесяць назад мне пазваніў Віталь Сіліцкі. Выбіраючыся ў чарговую стажыроўку ў адзін з заходніх унівэрсытэтаў, ён папрасіў мяне аб сустрэчы. Гаварыў, што хоча сказаць нешта важнае. Таго дня я ад’яжджаў у Варшаву, і мы сустрэліся на менскім вакзале.

«Я баюся за вас, хлопцы, — упершыню ў жыцьці прамовіў мне такое Віталь. — Ходзяць чуткі, што ўсьлед за палітыкамі пачнуць садзіць аналітыкаў».

Наступнымі днямі я марна стараўся забыцца пра пачутае і ў нядзелю пайшоў на Кастрычніцкі пляц зь цяжкім сэрцам.

Гісторыя зь людзьмі на гэтым пляцы і іх блякадай спраўдзіла гэтае прадказваньне толькі часткова.

Усьлед за палітыкамі пачалі садзіць ня толькі аналітыкаў, але і журналістаў, культурных дзеячаў і проста людзей беларускай мовы.

Пасадзіць на 10, 15 ці 25 за неляяльнасьць да рэжыму, выражаную якім-заўгодна чынам, цяпер могуць кожнага. Проста так, у імя прафіляктыкі апазыцыйных настрояў.

Гавораць, гэта робіцца для запалохваньня. Інфармацыя пра затрыманых, асабліва калі чалавек больш-менш вядомы, Лябедзька ці Дынько, імгненна разыходзіцца сярод незалежнай супольнасьці.

Але гэта ня ўся праўда. Гэта робіцца для таго, каб навязаць новыя правілы гульні, па-новаму акрэсьліць межы дазволенага і недазволенага, паказаць, што прастора свабоды стала вузейшай. Акурат каб выпрацаваць у нескароных безумоўны рэфлекс, загрукатаў канвэер арышт-суд-турма, праз які ўжо цяпер прайшлі сотні людзей.

За перамогу Лукашэнкі ў 2001 годзе мы заплацілі зьнішчэньнем Ліцэю, увядзеньнем пахабнай ідэалёгіі і масавым закрыцьцём незалежнай прэсы.

За перамогу Лукашэнкі ў 2006 мы пачынаем плаціць сваім здароўем, лёсамі сваімі і сваіх дзяцей.

Рэжым дае зразумець, што любога нават западозранага ў апазыцыйнасьці чакае бясправаўе лукашэнкавай сілавой машыны. Калі гэтага захоча прэзыдэнт, свабода западозранага можа быць абмежаваная арыштам, забаронай выезду за мяжу або з пальца высмактанай крымінальнай справай. У яго «месцы пражываньня» ў любы момант можа адбыццаператрус з канфіскацыямі «крыніцаў інфармацыі» і другіх цікавых прадметаў.

Таму не трымайце дома нічога лішняга.

Будзь гатовыя да найгоршага.

Але не карыцеся!

Пакорай, падпарадкаваньнем вы павышаеце градус параноі ўладаў.

Мая жонка, два дні абіваючы парогі спэцпрыёмніка-разьмеркавальніка на вуліцы Акрэсьціна, пачула ад маладога здаравезнага канваіра: «Такіх сук трэба страляць!»

Сёньня гэта было пра Дынька.

Заўтра можа быць і пра цябе.

**Валер Булгакаў**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Рэдактар-хуліган

і іншыя вязьні лукашэнкаўскіх засьценкаў

Галоўнага рэдактара «Нашай Нівы» Андрэя Дынька схапілі ў аўторак на Кастрычніцкім пляцы а 10-й раніцы пры выхадзе з аўтобусу №100. Паводле словаў сьведак, журналістаў Юрася Карманава і Тацяны Каліноўскай, людзі ў чорнай форме з надпісамі «спэцназ» і «міліцыя» нават не далі яму выйсьці на прыпынку ля намётавага гарадка: запхнулі назад у аўтобус і заскочылі самі. Пасьля Андрэй тэлефанаваў жонцы з мабільніка, гаварыў, што затрыманы і што яго вязуць кудысьці спэцаўтобусам. Потым мабільнік адключыўся.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Андрэя Дынька вядуць у залю суду.

Усіх затрыманых на плошчы, нібыта, звозяць у Цэнтральны РАУС, але дзяжурны сьцьвярджае, што Андрэя Дынька там няма. Той самы эфэкт дае абзвон астатніх менскіх РАУСаў. Не да канца давяраючы дзяжурным, выпраўляемся ў Ленінскі РАУС. Па дарозе атрымліваем зьвесткі, што ўсе затрыманыя ад ночы — у спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна.

Гэта добра замаскіраваная ўстанова. Пасьля трох колаў па праспэкце Дзяржынскага дазнаёмся, што спэцпрыёмнік не на вуліцы, а на завулку Акрэсьціна, у раёне вуліцы Прылуцкай. Каля прахадной — натоўп. Выпускаюць хлопцаў, забраных 2 сакавіка падчас Казулінскага «прарыву» на ўсебеларускі сход. «Там цёпла, хлеба многа, перадаваць трэба фрукты, сокі», — па ходу даюць яны парады. Нікога з затрыманых яны ня бачылі, толькі чулі, як іх вадзілі калідорамі: «Іх вельмі многа». Ці тут Андрэй — ніхто адказаць ня можа. Ні міліцыянт, які адчыняе двухмэтровыя жалезныя вароты чарговаму аўтобусу з зацемненым шклом, ні яго калега пры дзьвярах. Тэлефон спэцпрыёмніка стабільна заняты. Калі ж ён вольны, там адказваюць, што Андрэя Дынька няма, нават ня робячы выгляд, што корпаюцца ў сьпісах затрыманых. Тая самая сытуацыя была з Анатолем Лябедзькам, які, як пасьля выявілася, быў-такі на Акрэсьціна.

«Ужо тры аўтобусы пры нас прывезьлі», — бядуе кабета, у якой на плошчы арыштавалі сына. Яна ж кажа, што ад 14-й затрыманых пачнуць судзіць. Судоў у Менску — па колькасьці раёнаў. І ўсе загружаныя ў гэтыя дні. Сьпісаў падсудных, справы якіх будуць разглядацца, у судах ня маюць аж да самага іх прывозу. Пры нас да спэцпрыёмніка пад'яжджае аўтобус зь цёмнымі накладкамі на вокнах. Гукаю: «А-ндрэй!» і абсякаюся: пад стольлю аўтобуса матляюцца амапаўскія шлемы.

## Сэанс правасудзьдзя

Аляксандра, жонка Андрэя, едзе шукаць яго ў Палац правасудзьдзя на вуліцу Сямашкі, дзе месяцца адразу тры суды. Сястра і швагер шукалі ў Цэнтральным судзе. У Палацы пра-



(Ілжэ)сьведкі Шашко (справа) і Пачценны.

васудзьдзя поўна сваякоў затрыманых. Пад'яжджаюць тры аўтобусы. Людзі памкнуліся насустрач — мо прывезьлі родных? Але падсудных, як выявілася, падвозілі з зусім іншага боку. З аўтобусаў выгрузіўся спэцназ у чорнай форме і разьмеркаваўся па паверхах: група — у Ленінскі суд, група — у Кастрычніцкі, група — у Партызанскі. Спэцназаўцы падсілкоўваюцца: топаюць па калідорах з кефірам і макаронамі. Адзін, мінаючы сваякоў затрыманых, зьдзекліва кінуў: «Міліцыя — з народам!» «Я б вас, сук, страляў!» — ашчэрыўся іншы.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Гэты чалавек (справа) рэгулярна зьяўляецца ля намётаў і нецэнзурнай лаянкай абражае прысутных. Але доблесныя Шашко і Пачценны яго не затрымліваюць.

Немаладыя муж з жонкай шукаюць сваіх сыноў. Старэйшы знайшоўся сам: у кабеты зазваніў мабільнік. Нумар незнаёмы. Пачуўшы сынаў голас, матка пачынае плакаць наўзрыд. Зьяўляецца хлопец з разьбітым тварам і апавядае, як міліцыянты, загнаўшы затрыманых у аўтобус, кідалі іх тварам на падлогу, зьбівалі і… прымушалі сьпяваць зьдзеклівыя песьні пра Мілінкевіча. Незнаёмы міліцыянт-ахоўнік даў яму пазваніць маці з свайго тэлефону. Другі сын знайшоўся пры канцы дня: яго асудзілі на 10 сутак. Твар яго таксама быў разьбіты.

Тымчасам на суд па адным водзяць затрыманых. Выракі стандартныя: 10 сутак. Павялі Тацяну Хому. Яе ўсю ноч пратрымалі ў камэры безь сьвятла. Але трымаецца мужна. У той дзень яна мусіла быць не адказьнікам, а пазоўнікам: мелася судзіцца з кіраўніцтвам унівэрсытэту з-за свайго выключэньня. Яе затрымалі ўначы, калі яна вярталася дадому пасьля выступу на Кастрычніцкім пляцы.

## Быў Дынько, стаў Зайко

Пакуль цягнуліся гадзіны чаканьня ў судзе, Беларуская асацыяцыя журналістаў спрабавала знайсьці Андрэя Дынька праз прэс-службу МУС. У дзяжурнай частцы ГУУС Менгарвыканкаму прадстаўнікоў БАЖ запэўнілі, што на Акрэсьціна яго няма. Старшыня БАЖу Жанна Літвіна цэлы дзень стэлефаноўвалася з намесьнікам кіраўніка ўпраўленьня інфармацыі і грамадзкіх сувязяў МУС Віталём Грынкевічам. Ён паабяцаў асабіста заняцца высьвятленьнем лёсу затрыманага. У 16.00 паведаміў, што ніякай новай інфармацыі няма; у 17.00 заявіў, што А.Дынька няма ні ў спэцпрымальніку, ні ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Каля 18.00 высьветлілася, што рэдактар «НН» усё ж такі хутчэй за ўсё на Акрэсьціна.

У размове з Рэдакцыяй «НН» Грынкевіч паведаміў, што, аказваецца, яму няправільна сказалі прозьвішча і ён цэлы дзень шукаў нейкага Зайко... І ўвесь час абяцаў перазваніць праз пятнаццаць хвілін. Два такія пэрыяды па пятнаццаць хвілін Аляксандра Дынько праседзела ў машыне, чакаючы зьвестак, каб не ісьці зь няпэўнасьцю дахаты, да 5-гадовага Якуба і 3-гадовай Усьціньні.

І ўсё ж да ночы нічога не ўдалося даведацца.

Праваабаронца «Вясны» Валянцін Стэфановіч не зьдзівіўся званку ў 23.00. «Дынько пэўна на Акрэсьціна, больш няма дзе. Іх там яшчэ 50 чалавек, якіх будуць судзіць заўтра».

## «Я разрешаю вам говорїть на своём родном языке»

21 сакавіка ў 9.00 Віталь Грынкевіч яшчэ «ня ведаў», дзе Дынько. І ўвогуле ня мог гаварыць — быў «на плошчы». І толькі роўна праз суткі пасьля затрыманьня паведаміў, што Дынько сапраўды правёў ноч на Акрэсьціна, а зараз яго вязуць у суд Савецкага раёну. У судзе ні часу, калі прывязуць чарговых падсудных, ні іх сьпісу ня мелі. «Дык вы ня ведаеце, каго і за што будзеце судзіць?» — «Не, ня ведаем». Журналісты, сьведкі і праваабаронцы мерзнуць ля суду.

У 11.55 ля дзьвярэй спыніўся аўтобус з затрыманымі. Яны выглядалі бадзёра: усьміхаліся, махалі рукамі, вітаючы сяброў.

У 13.30 судзьдзя Алена Крайчык пачала працэс фразай: «Я разрешаю вам говорить на своём родном языке». Рэдактару газэты «Наша Ніва», сябру Беларускага ПЭН-цэнтру, стваральніку інтэлектуальнага часопіса «Arche» інкрымінавалі хуліганства, а канкрэтна — нецэнзурную лаянку. Дынько запатрабаваў сьведкаў. Прысутнасьць за дзьвярыма замежнікаў, тэлекамэр і дыктафонаў паўплывала: судзьдзя дала «дабро». Бо прывезеную ў адным аўтобусе з Дыньком выкладчыцу ўнівэрсытэту Ірыну Дарафейчук, якую затрымалі на падыходах да Кастрычніцкай з тэрмасам, асудзілі на сем сутак за «размахваньне рукамі й прыставаньне да прахожых» безь ніякіх сьведак.

Сьведкі-спэцназаўцы ехалі ў Савецкі суд дзьве з паловай гадзіны. Падчас вымушанага перапынку Андрэя Дынька выводзілі, і ён здолеў крыху расказаць пра свае прыгоды. Калі міліцыянты даведаліся, што Дынько — журналіст, яны пачалі раіцца са сваім кіраўніцтвам, і тое загадала аформіць яго за дробнае хуліганства. Сказаў таксама, што ў камэрах турмы на Акрэсьціна ўжо не хапае месца на ўсіх затрыманых. Вязьні сядзелі, цесна пры-

Працяг на старонцы 6.

# Рэдактар-хуліган

Працяг са старонкі 5.

туліўшыся адзін да аднаго ў халоднай камэры, дзе адключылі ацяпленьне. У суседняй зь ягонай камэры сядзелі пяцёра дзяўчат. Яны прасілі ў супрацоўнікаў спэцпрыёмніку туалетнай паперы або хаця б газэты, але ім адмовілі. А.Дынько паскардзіўся, што вельмі гучна працавала радыёкропка, і калі мужчыны здолелі яго выключыць, вырваўшы разэтку, то дзяўчаты вельмі пакутавалі, але на іх просьбы дапамагчы выключыць радыё супрацоўнікі ўстановы цынічна адказалі, што яны ня ведаюць, як гэта зрабіць.

У 16.30 прыбылі сьведкі: байцы спэцназу Шашко і Пачценны. Яны распавялі суду, што Андрэй Дынько хадзіў па плошчы, нецэнзурна выражаўся і не рэагаваў на прад'яўленае яму пасьведчаньне. На пытаньне, як гэта магло быць, калі Андрэю нават не далі выйсьці з аўтобуса, уцямнага адказу сьведкі абвінавачаньня не далі. Затое судзьдзя Алена Крайчык прызнала іх сьведчаньні лягічнымі й адпаведнымі рэчаіснасьці. Вырак быў стандартны: дзесяць сутак арышту. Сьведчаньні Веранікі Дзядок і Алеся Кудрыцкага, якія ехалі ў «сотцы» разам з Дыньком, прынятыя пад увагу не былі. Сьведкаў Юрася Карманава і Тацяну Каліноўскую, якія бачылі затрыманьне, судзьдзя адмовілася выслухаць.

## У турму за булачкі

Асудзілі. Павялі ў аўтобус. Адзін з прысутных, скарыстаўшыся момантам, сфатаграфаваў Шашка і Пачценнага. Шашко, каржакаваты дзяцюк з абсечаным кавалкам вуха, раптам падскочыў да фатографа з пагрозамі: «Ня маеш права! Я прыватная асоба!..» Быў у грамадзе і яшчэ адзін фіксатар падзеяў. Непрыкметны чалавек доўга здымаў на камэру ўсіх прысутных. На патрабаваньне Жанны Літвіной назвацца, адмовіўся. (Кажуць, што са стужкі апэратыўнай здымкі пасьля раздрукоўваюць вялікія фоткі, каб «ціхары» маглі добра запомніць актывістаў.)

Любыя спробы аддаць харчовую перадачу натыкаліся на міліцэйскае «не паложана, вязіце на Акрэсьціна». На Акрэсьціне ж прымаюць перадачы толькі на тых, хто ёсьць у іх сьпісах. А ў тыя сьпісы людзі трапляюць з спазьненьнем на дзень — з-за перагрузкі сыстэмы: на вечар серады былі агалошаныя сьпісы новапрыбылых з Плошчы: сем сьпісаў па дваццаць пяць асобаў.

«Студэнтка, якую разам са мной затрымалі, — кажа Андрэй Дынько, — вучыцца на тэалягічным факультэце. У іх адмянілі заняткі ў панядзелак. Яна прыехала ў аўторак ад бацькоў зь Любані. Тэалягічны факультэт знаходзіцца ў архірэйскім палацы. Спынілі: «З сумкай? Давай! Булачкі? Давай!»

Журналістаў затрымліваюць, каб іх запалохаць. Яны баяцца затрымліваць пры журналістах. Яны баяцца затрымліваць пры камэрах. Яны хочуць, каб сьвет гэтага ня бачыў. Яны хочуць, каб гэта адбывалася ціха. Вельмі прашу ўсіх сваіх калегаў: будзьце там, дзе ваш народ. Будзьце там, дзе падзеі. Выконвайце свае прафэсійныя абавязкі».

**Сяргей Мікулевіч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Ірыну Дарафейчук асудзілі на сем сутак за тэрмас з кавай.**

# Мілінкевіч і Казулін: плюсы і мінусы супрацы




У аўторак увечары стала вядома, што Аляксандар Казулін разрывае адносіны з Аляксандрам Мілінкевічам. Яны не сышліся ў поглядах на будучыню намётавага гарадка. Казулін прапануе зьняцца і сабрацца ізноў 25 сакавіка. «Гэта выбар моладзі — стаяць да канца. І я буду зь імі», — кажа Мілінкевіч. Чаго болей у супрацы палітыкаў — плюсоў ці мінусаў?

**Алесь Анціпенка, філёзаф, культуроляг:**
У гэтым супрацоўніцтве было мала пазытыўнага. Я не прыхільнік сп.Казуліна і на яго кампанію глядзеў зь вялікім скепсісам.

**Віктар Карняенка, намеснік кіраўніка штабу А.Мілінкевіча:**
Для Казуліна было болей плюсоў, для Мілінкевіча — мінусаў. Казулін не пасьпеў стаць папулярным палітыкам і падчас кампаніі пачаў выкарыстоўваць аўтарытэт Мілінкевіча. Фактычна, ён проста заскочыў у апошні вагон цягніка, які ад яго сыходзіў.

**Анатоль Сідарэвіч, гісторык:**
Колькі сябе памятаю ў палітычнай сыстэме Беларусі, столькі сацыял-дэмакраты былі непажаданай партыяй і для БНФ, і для АГП. Сацыял-дэмакраты іх цешаць толькі слабыя, калі кладуцца пад іх. Таму тут ніякага плюсу быць ня можа.

**Анатоль Шумчанка, прадпрымальнік:**
Плюсоў я ня бачу, толькі адзін мінус, і пры гэтым вялікі. Я схіляюся перад мужнасьцю гэтых людзей, якія кінулі выклік уладам, але яны не атрымалі галоўнага для палітыка – выніку. Чаго дамагліся? Мілінкевіч і Казулін правялі палітычную піяр-кампанію, людзі іх пазнаюць. Але што далей? 19-га прыйшлі на плошчу, пастаялі — а зранку ўсе пайшлі на працу. І адзін, і другі кандыдат згулялі па правілах Лукашэнкі.

**Міхал Пліска, юрыст, палітоляг:**
Лепш, канечне, было б, каб быў адзін кандыдат ад апазыцыі. Але ў тых умовах, у якіх праводзілася перадвыбарчая кампанія, прысутнасьць другога кандыдата ня моцна нашкодзіла. Мінус, што няма дамоўленасьці пра адзіны падыход да далейшага супраціву на плошчы.

**Апытваў АШ**

# Людзі чакаюць яснай праграмы

Як будуць разьвівацца падзеі на Кастрычніцкім пляцы далей? Адказваюць культурныя і грамадзкія дзеячы.

**Лявон Вольскі, музыка:** Неабходная праграма канкрэтных дзеяньняў — стаяньне на пляцы само па сабе дае мала плёну, апроч карцінкі. Гэта добра, але перамены ў грамадзтве і бяз гэтага відавочныя. Патрэбны рух далей. Напрыклад, збор подпісаў за правядзеньне паўторнага галасаваньня ці нешта кшталту гэтага. Галоўнае — не стаяць на месцы.

**Уладзімер Арлоў, пісьменьнік:** На гэты момант галоўнае — пратрымацца да 25 сакавіка. Кожны дзень адбываюцца затрыманьні ўдзельнікаў акцыі супраціву, аднак колькасьць тых, хто штодня далучаецца да пікетоўцаў, значна большая. Рашэньні пра далейшыя дзеяньні можна будзе прымаць зыходзячы з маштабнасьці правядзеньня акцыі, прысьвечанай Дню Волі.

**Тадэвуш Гавін, заснавальнік Саюзу палякаў Беларусі:** Прабачце, я не магу пакуль адказаць на пытаньне, толькі што вяртаюся з допыту ад сьледчага. (Сп. Гавіна падазраюць у падпале вясковай хаты. — **"НН"**.)

**Генадзь Сагановіч, гісторык:** У мяне падчас знаходжаньня на плошчы склалася ўражаньне, што там зашмат стыхійнасьці. А стаяньне на плошчы мусіць быць разумным і асэнсаваным. Падзеі ад 19 сакавіка ўжо засьведчылі, што мы нарэшце ператвараемся ў паўнавартасную грамадзянскую супольнасьць, што нас не ўдалося застрашыць.

Трэба пратрымацца да 25-га. І гэтае стаяньне мусіць прынесьці плён. Я бачу такі варыянт: пры вялікай колькасьці мітынгоўцаў адбываецца фармаваньне нейкага Народнага органу кіраваньня, які будзе мець паўнамоцтвы выказваць і абараняць інтарэсы ўсіх прыхільнікаў переменаў. Менавіта такое фармаваньне магло б ініцыяваць перагляд вынікаў выбараў.

**Запісаў Сямён Печанко**

## Паралізавана праца друкарні “Мэдысонт”

У апошні перадвыбарны тыдзень улады прыпынілі дзейнасьць менскай друкарні “Мэдысонт”. Такое рашэньне было прынятае на падставе праверкі, якая выявіла, што ў “Мэдысонце” друкуецца выбарчая прадукцыя дэмакратычнага характару. Хочацца верыць, што друкарні ўдасца аднавіць сваю працу, бо інакш часопісам “Дзеяслоў”, “Абажур” і інш. давядзецца шукаць іншага друкара. За цяперашнім часам гэта нялёгка.

**ВБ**

## ДАІ загадвае 100-м маршрутам

У аўторак-сераду адбыліся зьмены ў працы аўтобуснага маршруту №100. У другой палове дня аўтобусы не спыняліся на прыпынку «Кастрычніцкая плошча», ствараючы вялікія нязручнасьці для менчукоў. Начальнік зьмены дыспэтчарскага ўпраўленьня КУП «Менсктранс» Любоў Краўцова прызналася, што зьмены ў маршруце адбыліся не па ініцыятыве прадпрыемства. Распараджэньне паступіла ад супрацоўніка ДАІ сп.Шастакова.

**Пасажыр**

# Яшчэ адзін дохлы пацук КДБ

Рэспубліканская пракуратура выставіла абвінавачваньне лідэрам незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства», якая меркавала займацца незалежным назіраньнем у часе выбарчай кампаніі.

У дачыненьні да затрыманых распачатая крымінальная справа паводле арт.193 ч.2 КК «Арганізацыя альбо кіраваньне аб’яднаньнем, якое замахваецца на асобу і правы грамадзянаў». Міколу Астрэйку, Цімоху Дранчуку, Аляксандру Шалайку, Энiры Браніцкай пагражае альбо арышт на тэрмін да шасьці месяцаў, альбо зьняволеньне тэрмінам да трох гадоў.

Фінансаваньне «Партнэрства», цытуе «Інтэрфакс» словы старшыні КДБ Сьцяпана Сухарэнкі, зьдзяйсьнялася праз рэгіянальнае аддзяленьне Нацыянальнага дэмакратычнага інстытуту пры ўдзеле грамадзяніна ЗША Дэвіда Гамільтана.

Нагадаем, што лідэры «Партнэрства» былі затрыманыя месяц таму, а на іх кватэрах учыненыяператрусы. Тады ж БТ паказала сюжэт пра нібыта знойдзеныя падчасператрусу ў офісе «Партнэрства» зьвесткі экзыт-полаў, паводле якіх на прэзыдэнцкіх выбарах перамог Аляксандар Мілінкевіч.

Юрыст Валянцін Стэфановіч мяркуе, што КДБ змагаецца з уласнапрыдуманымі хімэрамі: «Гэта цалкам у духу 1930-х — прыдумляюць сабе варожыя арганізацыі і потым «з посьпехам» іх перамагаюць. Арганізацыя «Партнэрства» мелася займацца назіраньнем, і гэта напалохала ўлады. Але ўсё, што спэцслужбы прыпісвалі арыштаваным і чым палохалі грамадзянаў — тэрарызм, дзяржаўны пераварот, — анічога ня спраўдзілася. Гэта пшык. Але ім трэба давесьці распачатую «справу» да канца, адсюль і крымінальная справа». Сп.Стэфановіч кажа, што папраўкі ў Крымінальны кодэкс паставілі яго ў супярэчнасьць з Канстытуцыяй: «Крымінальны кодэкс не адпавядае міжнародным нормам, бо фактычна абмяжоўвае правы на свабоду асацыяцыяў. Усе незарэгістраваныя і недзяржаўныя арганізацыі паводле новага Кодэксу апынуліся па-за законам, а гэта супярэчыць Асноўнаму закону, які гарантуе свабоду асацыяцыяў».

Што да пэрспэктываў арыштаваных актывістаў «Партнэрства», то тут Валянцін Стэфановіч ня пэўны ў канчатковым выраку: «Пачакем завяршэньня справы».

**Сямён Печанко**

# Дзіўны сьнег

Надвор’е 19 сакавіка было суворае: пранізьлівы халодны вецер і сьнег. Але ня гэты сьнег зьдзівіў тых, хто не збаяўся сабрацца на Кастрычніцкай плошчы. Недзе пасярод мерапрыемства ў сьвяточным натоўпе пракаціўся зьдзіўлены гул. Гэта была рэакцыя на нечаканую завіруху, што пачалася зьнянацку і ў момант запаланіла плошчу. Потым вочнікі будуць казаць, што бачылі дзіўную рэч: сьнег нібыта пайшоў з-за будынкаў Палацу Рэспублікі і музэю ВАВ. Я на свае вочы бачыў, што сьнег быццам бы струменіў з правага кута даху Палацу. А потым у паветры ўжо была суцэльная заслона сьнегу. Перад завірухай і пасьля на даху Палацу, на тым самым правым рагу, мітынгоўцы маглі бачыць некалькі чалавек. Вочнікі кажуць, што польскія журналісты, якія вялі рэпартажы ў прамым этэры, адразу ж паведамілі пра прымяненьне сьнегавых генэратараў. Шмат хто зьвярнуў увагу на тое, што сьнег быў ня ў форме сьняжынак, як той, што падаў нейкі час таму, а ў выглядзе крупаў. І яшчэ ён меў спэцыфічны пах. Прыродны сьнег ня мае паху.

У СМІ ўжо распаўсюдзілі заяву супрацоўніка Белгідрамэтцэнтру, што гэта была прыродная зьява: моцная кароткачасовая завіруха.

Скептыкі сумняюцца. Аднак нават просты пошук у беларускім Сеціве спачатку дае інфармацыю пра нібыта выкарыстаньне сьнегавых генэратараў, а потым пра тое, што такое абсталяваньне маецца ў Раўбічах і ў Сілічах.

Інтэрнэт-газэта gazetaby.com («Салідарнасьць») паведамляе пра магчымыя прычыны такой незвычайнай зьявы: завіруху маглі справакаваць пры дапамозе складанага абсталяваньня альбо пры дапамозе самалётаў, што маглі за некалькі гадзінаў распыліць на вышыні адмысловы адсарбэнт. І тое і другое каштуе немалыя грошы — гадзіна палётаў такога самалёта абыходзіцца ў 1 тысячу даляраў. Выданьне паведамляе таксама, што МУС адмаўляецца камэнтаваць магчымасьць выкарыстаньня такіх спэцсродкаў.

Варта прыслухацца й да аглушальна пераабранага Лукашэнкі, які на прэсавай канфэрэнцыі заявіў, што нават Бог на яго баку, бо паслаў на плошчу завіруху.

**Сьнегавыя машыны**
здольныя прадукаваць ад 3 да 90 кубамэтраў сьнегу. Расход вады ад 1,2 да 36 м/гадз. Максымальная тэмпэратура вады +2 градусы. Магутнасьць — ад 3 да 20 кВт. Габарыты вагаюцца ад 100х50х120 да 280х200х210 см.

**Сямён Печанко**

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32 (МТС)

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Просім ахвяраваньняў!

Вельмі просім усіх, хто яшчэ не пераказаў ахвяраваньняў на выхад «Нашай Нівы» ў другім квартале, зрабіць гэта як найхутчэй. Інакш газэта з красавіка вам ня будзе прыходзіць.

**Шчыры дзякуй за шчодрасьць**

Я.Ш. з Маладэчна.
Віктару Н. з Мар’інай Горкі.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёну.
Аляксандру Л. зь Віцебску.
Валянціне Б. з Ушацкага раёну.
А.Н., Натальлі С. з Полацку.
Міколае Б. зь Сьветлагорскага раёну.
Ларысе Ц., Сяргею З., Ганьне Ф. з Горадні.
Анатолю П. з Салігорску.
Аркадзю М. з Гомелю.
Міхалу Г. зь Берасьця.
Віктару Б., Мікалаю К., Аляксею Г., В.К., Натальлі М., Сьвятлане Ш., Ніне Ш., В.В., Барысу А., Міхалу С., Казімеру Г., Радзіму Г., Юр’ю Г., Міколе Ж., І.Б., Юр’ю М., С.Я. зь Менску

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай празь «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Ня страшна!

Чым бліжэй да выбараў, тым больш шалела ўлада. Колькасьць затрыманьняў дасягнула дзясяткаў у дзень. Актывістаў садзілі за краты, каб не было каму выйсьці на вуліцы 19 сакавіка.

Супрацоўнікі менскага спэцпрыёмніка-разьмеркавальніка 15 сакавіка адмовіліся прымаць перадачы (ежу, ваду, вопратку) для затрыманых. Адмову тлумачылі карантынам.

Палітвязьні на застрашваньне адказалі галадоўкамі ў Горадні, Гомелі, Віцебску.

У Горадні 19 сакавіка была ўведзена "камэнданцкая гадзіна" для моладзі: школьнікаў папярэджвалі, што пасьля 20-й усіх засьпетых на вуліцы будуць даставіляць у міліцыю для праверкі дакумэнтаў. Былі адмененыя масавыя вечаровыя гуляньні. Каля дому Юр'я Гуменюка выставілі міліцэйскі пост, а дадому да Вацлава Галімскага прыходзілі шукаць нелегальныя ўлёткі.

Усе школы Меншчыны мусілі падаваць зьвесткі пра адсутных на занятках старшаклясьнікаў.

Асноўны ўдар быў скіраваны супраць штабоў Мілінкевіча. 16 сакавіка ўвечары міліцыянты наведалі яго берасьцейскі штаб, а крыху пазьней, уначы, другі раз цікавіліся, што там так позна робяць актывісты выбарчай кампаніі.

Офіс АГП у Менску знаходзіўся пад пастаянным кантролем спэцслужбаў: міліцыянты ў форме і "ціхары" хадзілі ля будынку, сядзелі ў фае, каталіся ў ліфце. 18 сакавіка каля офісу АГП у Берасьці цэлы дзень стаяў мікрааўтобус з таніраванымі вокнамі: актывісты падазраюць, што зь яго вялося праслухоўваньне.

Непасрэдна ў дзень выбараў міліцыянты наведалі штабы Казуліна ў Берасьці й Менску.

Тым ня менш, акцыі пратэсту адбыліся ня толькі ў Менску, але і ў Горадні, Берасьці, Віцебску (тут яны ішлі некалькі дзён).

Рэакцыя ўладаў на вулічныя пратэсты была нэрвовая. У Менску міліцыянты ў форме і ў цывільнай вопратцы пераглядалі сумкі тых, хто ішоў на Кастрычніцкую плошчу з прадуктамі. Праводзілі нават догляд аўтамабіляў, якія ехалі ў бок плошчы: ці не вязуць кіроўцы прадукты? Аўтамабілістам забаранялі спыняцца каля мітынгоўцаў. Людзей, якія ішлі на плошчу самі, чапалі рэдка — затрымлівалі тых, хто хацеў дапамагчы мітынгоўцам ці ежай, ці вопраткай. Сотня затрыманых у першую ноч намётавага гарадка, паўсотні — у другую. Менскія суды 21 сакавіка проста не спраўляліся выносіць выракі затрыманым: на кожны судовы працэс адводзілася 10—15 хвілінаў. Абвінавачаньні стандартныя — дробнае хуліганства ("размахваў рукамі, нецэнзурна лаяўся") ды "ўдзел у несанкцыяванай вулічнай акцыі".

Хапуны з такімі ж надуманымі абвінавачаньнямі ладзіліся ў Горадні (20 сакавіка — 6 асуджаных на арышт), Віцебску (21 сакавіка — каля 15 затрыманых; суды меліся ісьці ў час, калі вярстаўся нумар).

Тым ня менш, намётавы гарадок на плошчы стаіць. Нягледзячы на затрыманьні. Нягледзячы на чуткі пра немінучую блізкую "зачыстку". На пастанныя прыезды Паўлічэнкі, які штовечара з балюстрады аглядае мітынгоўцаў. Гарадок стаіць, і ў ім ня толькі менчукі: ёсьць і віцябляне, і магілёўцы. Вось-вось абяцаліся пад'ехаць берасьцейцы.

**Аркадзь Шанскі**

# Беларуская

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

«Лукашэнка, Мілінкевіч... Усё адно ў Сітне нічога ня зьменіцца, а ўлада як нічога не рабіла, так і ня будзе рабіць». Калі шматтысячная грамада ў цэнтры Менску скандуе «Сва-бо-да!», вёска ля тэлевізара супакойваецца тым, што ад яе нічога не залежыць.

Для большасьці беларусаў, як на вёсцы, так і ў горадзе, «улада» — гэта ўлада мясцовая: начальства для іх ня столькі Лукашэнка, колькі сельсавет, «раён» альбо кантора лесапрамгасу.

Чым займаецца маласіценскі сельсавет? Адказвае на запыты вяскоўцаў, што грошай і магчымасьцяў няма. У асобе старшыні разводзіць рукамі, калі сіценцы абураюцца несправядлівасьцю на працы або адсутнасьцю ў вёсцы аб’ектаў *сацкультуры*. А яшчэ зьбірае подпісы за Лукашэнку.

Не дапамагае сельсавет — зьвяртайцеся ў раён. Што ж робіць райвыканкам? Перад выбарамі арганізоўвае самадзейны канцэрт «За Беларусь» і вывешвае на прахадной леспрамгасу распараджэньне: прызначыць адказнымі за населеныя пункты такіх і такіх супрацоўнікаў сельсавету.

Сапраўдная ўлада — начальнік леспрамгасу. Ён распараджаецца машынамі й трактарамі, выпісвае паліва й дровы... Але толькі тады, калі гэта тычыцца выкананьня пляну нарыхтовак. Для ўсіх іншых пытаньняў ёсьць сельсавет.

Іншыя віды ўлады (участковы, дэпутат, пракурор, «зялёныя»*) — шчупалкі кантрольных ды карных органаў, што заселі дзе-небудзь у Полацку ці Віцебску. Іхняя (як правіла раптоўная) актыўнасьць ніяк не зьвязаная зь мясцовым жыцьцём, а прадвызначаецца прэзыдэнцкімі ці якімісьці там «абласнымі» спазмамі й заўсёды творыць унізе вусьцішныя ды фантастычныя чуткі.

Вось чаму тутэйшыя жыхары ўспрымаюць уладу ня проста як нешта іншароднае, чужое, а як *варожае*. «Наша ўлада», «свая ўлада», «мая ўлада» — гэтага ня кажуць нават пэнсіянэры пра Лукашэнку. Але ж галоўны сэнс мясцовай улады — каб яна была *свойская*. Сіценская. Полацкая. Серабранская. Беларуская!

Як жа мусіць выглядаць такая беларуская ўлада ў Малым Сітне?

У будынку вясковага клюбу, па-над якім ужо ўзьняты бел-чырвона-белы сьцяг, зьбіраецца ўся грамада. На штогадовым сходзе абіраюцца *стараста* і некалькі *ўпраўцаў* — канцлер (сакратар), скарбнік, адказныя за сельскую гаспадарку, лес, рэлігійныя дачыненьні, адукацыю й культуру. Полацак ужо вылучыў у муніцыпальную ўласнасьць Малога Сітна колькісот гектараў ворыва, лесу, зямлі, прылеглай да вёскі, разбураныя будынкі «Вымяральніка», а таксама вызначыў долю Ўправы з падаткаў леспрамгасу. Управа вырашае, як наладзіць гаспадарку ды сацыяльную сфэру, як разьмеркаваць «сіценскія грошы». На Ўправу прыяджае полацкі войт, шумілінскі фэрмэр, наваполацкі бізнэсовец, гандляр зь Невелю, прадстаўнік швэдзкай дрэваапрацоўчай кампаніі, зацікаўленай у будаўніцтве невялікай мэблявай фабрыкі — і,

## СЬЦІСЛА

**Затрыманы рэдактар «НН»**

21 сакавіка а 10-й раніцы на Кастрычніцкай плошчы быў затрыманы галоўны рэдактар «Нашай Нівы» **Андрэй Дынько**. Судзьдзя Алена Крайчык прысудзіла яму 10 сутак арышту.

**Добруш**

11 сакавіка падчас распаўсюду агітацыйнай літаратуры за А.Мілінкевіча на рынку затрымалі **Марка Саньнікава**: яго зьвінавацілі ў незаконным распаўсюдзе друкаванай прадукцыі ды аштрафавалі на 10 б.в. (310 тыс.) «за парушэньне працы выбарчай камісіі».

У Добрушы выканкам 16 сакавіка сарваў сустрэчу **Ўладзімера Навасяда**, даверанай асобы А.Мілінкевіча, з выбарцамі: калі людзі сабраліся ў Дом культуры, чыноўнікі абвясьцілі, што сустрэча пераносіцца на паўтары гадзіны.

**Бабруйск**

13 сакавіка падчас перавозкі афіцыйна выдадзеных матэрыялаў А.Казуліна затрыманыя **Міхаіл Кавалькоў** і **Ігар Канойка**. 14 сакавіка падчас распаўсюду па паштовых скрынках агітматэрыялаў затрымалі 5 агітатараў А.Мілінкевіча, у тым ліку актывіста БНФ **Дзяніса Шэйко**: на яго склалі пратакол за незарэгістраваныя агітматэрыялы.

На 20 сакавіка атрымалі позвы ў ваенкамат актывісты штабу Мілінкевіча — **Алесь Чыгір, Дз.Шэйко, Дзяніс Буйніцкі** (тэрміны вайсковых збораў у павозах не пазначаныя). **Валер’я Мацкевіча**, які не падлягае прызыву паводле стану здароўя, 20 сакавіка выклікаюць на «перакамісаваньне».

**Кіраўск**

14 сакавіка група пазаведамаснай аховы, узброеная аўтаматамі, затрымала аўтамабіль зь пяцьцю актывістамі **групы А.Казуліна** і даставіла іх у пастарунак, дзе гадзіну вёўся допыт.

**Крычаў**

Бяз санкцыі пракурора 15 сакавіка каля 20 міліцыянтаў правялі ператрус у хаце й затрымалі **Ўладзімера Нагорнага**, выдаўца незарэгістраванай газэты «Вольны горад». Яны сканфіскавалі кампутары, дакумэнты і ўлёткі 1990-х.

18 сакавіка затрымалі рэдактара незарэгістраванай газэты «Вольны горад» **Сяргея Няроўнага**: яго выклікалі ў пракуратуру, але адразу па выхадзе з кватэры міліцыянты завезьлі ў пастарунак.

**Студэнты**

З БДПУ «за парушэньне правілаў унутранага распарадку» 15 сакавіка выключаныя **Людміла Асіпенка** і **Алесь Карцель**: «правінай» было рэдагаваньне незарэгістраванага бюлетэню «Танкісты». 17 сакавіка з той жа фармулёўкай выключылі **Рыгора Шкурынава**. Пікет у падтрымку выключаных 17 сакавіка разагналі міліцыянты й ахова ВНУ.

Намесьнік дэкана факультэту маркетынгу, мэнэджмэнту і прадпрымальніцтва БНТУ зь невядомымі ў цывільным зладзіў ператрус у інтэрнацкім пакоі студэнта 2-га курсу **Яўгена Іванюка** ў адсутнасьць гаспадара. «Госьці» забралі дыск з запісам тэлевыступу кандыдата ў прэзыдэнты А.Мілінкевіча.

**Горадня**

15 сакавіка асудзілі на 5 сутак **Вадзіма Саранчукова** і галоў-

# ўлада

натуральна, штодня заходзяць па сваіх патрэбах самі жыхары.

Управа наймае мясцовую варту, што выконвала б у навакольлі функцыі і ўчастковага, і егера, і «зялёных»: у Полацку ім афармляюцца пасьведчаньні, выдаецца зброя ды шэрыфскія значкі. Адна зь першых пастановаў Управы — запрашэньне ў Сітна праваслаўных, каталікоў, эвангелікаў з дабрачыннымі місіямі: пад міжканфэсійны сацыяльны цэнтар аддаецца закінуты будынак інтэрнату, якраз трохпавярховы.

У нацыянальнай уласнасьці застаюцца хіба чыгунка, велізарныя масівы лесу, заказьнікі, лініі электраперадачаў, пошта...

Цяпер людзі самі будуць вырашаць, як распараджацца сіценскай зямлёй, сіценскім лесам, сіценскімі грашыма. Людзі самі на сходзе акцыянэраў ці незалежнага прафсаюзу вызначаць мінімальныя тарыфы й заробкі ў леспрамгасе. Людзі самі аддадуць дзяцей на вучобу ў царкву ці касьцёл, калі не давяраюць школе, і самі праз год пераабяруць старасту, калі той ня даў рады.

Мясцовае самакіраваньне — фундамэнтальная аснова самое дэмакратыі. Гістарычна менавіта ў самакіраваных мястэчках і магдэбурскіх гарадох, рэгіянальных урадах і вольных унівэрсытэтах узьнікла, пашыралася й набыло ўсеагульны характар *народаўладзьдзе* як палітычны стандарт. Якраз на магутных падмурках мясцовага самакіраваньня (закладзеных у Беларусі ў часы ВКЛ і гвалтоўна выкараненых разам са Статутам у XIX ст.) збудаваныя грамадзтва, культура й палітыка Эўропы ды Амэрыкі. Мясцовае самакіраваньне фармуе й задзіночвае нацыю «зьнізу» настолькі ж пасьпяхова, наколькі патрыятычны ўрад, мова і нацыянальныя сымбалі яднаюць яе «згары».

Ключавы прынцып мясцовага самакіраваньня сфармуляваны і ўзьняты на сьцяг хрысьціянска-дэмакратычным рухам XX стагодзьдзя — правіла *субсыдыярнасьці*: рашэньні мусяць прымацца на тым узроўні, на якім яны найбольш эфэктыўна выконваюцца. Мясцовым уладам, сям'і, царкве, недзяржаўным арганізацыям ды прафэсійным асацыяцыям перадаецца львіная доля паўнамоцтваў, зь якімі ніколі ня здолее справіцца цэнтральны ўрад.

Таму зьмена прэзыдэнта й усёй вярхоўкі рэжыму — гэта толькі пачатак пераменаў. Сапраўдныя перамены нацыянальнага маштабу чакаюць нас у глыбіні, у гарадзкіх кварталах ды на вясковых вуліцах. Бязьвер'е, калгасная разруха, нацыянальная млявасьць і абыякавасьць па месцы жыхарства, месцы працы, месцы вучобы — галоўная спадчына злашчаснае эпохі Лукашэнкі.

...Вось чаму ў той момант, калі тысячы й тысячы беларусаў на сталічных плошчах патрабуюць свабоды, праўды й справядлівасьці — гарадзкія шматпавярхоўкі, мястэчковыя кірмашы й вясковыя хаты скаланае водгульле сапраўднай беларускай улады, якая рана ці позна, нягледзячы ні на што, па ўсёй Беларусі *пераможа.*

*Малое Сітна*

** Дзяржаўная ахова лесу*

Цяпер людзі самі будуць вырашаць, як распараджацца сіценскай зямлёй, сіценскім лесам, сіценскімі грашыма.

## СЬЦІСЛА

нага рэдактара газэты «Glos znad Niemna na uchodzstwie» **Анджэя Пісальніка** — за «дробнае хуліганства». **Мікалая Ворана** — на 7 сутак. У гэты ж дзень затрымалі праваабаронцу **Міколу Лемяноўскага**.

16 сакавіка затрымалі назіральніка **Яўгена Лясоцкага**. **Артура Сьмятаніна** затрымалі з агітматэрыяламі А.Мілінкевіча. 14-га сакавіка міліцыянты прыходзілі да Артуравых суседзяў, каб высьветліць, ці не скандаліць ён, а 15-га вартавалі каля пад'езду, аднак Сьмятанін не начаваў дома. 17 сакавіка яго асудзілі на 7 сутак.

17 сакавіка затрыманыя **Андрэй Мялешка** і былы палітвязень, адзін зь лідэраў прадпрымальніцкага руху **Аляксандар Васільеў**. **Валер'я Кісяля** асудзілі на 3 сутак за «дробнае хуліганства».

17 сакавіка пад міліцэйскі нагляд узяты дом **Тадэвуша Гавіна**.

**Групу пяцідзясятнікаў** (7 чалавек), якія ехалі ў Менск памаліцца за мірнае заканчэньне выбараў, затрымалі 17 сакавіка ўвечары ў Горадні. 18 сакавіка іх асудзілі на 3 сутак, абвінаваціўшы ў нецэнзурнай лаянцы ў міліцэйскім пастарунку. Сваякоў у залю суду не пусьцілі.

19 сакавіка да **Андрэя Пачобута**, рэдактара часопіса «Magazyn polski na uchodzstwie», асуджанага на арышт, завезьлі ў шпіталь хуткай дапамогі: у залі суду ён абвесьціў сухую галадоўку, цяпер яго стан пагоршыўся.

Журналіста **Анджэя Пісальніка**, актывіста Саюзу палякаў, які 20 сакавіка толькі вышаў на волю пасьля 5-дзённага арышту, у гэты ж дзень затрымалі за «нецэнзурную лаянку». Пасьля гэтага былі затрыманыя журналіст **Ігар Банцар** і яшчэ некалькі актывістаў дэмакратычных арганізацыяў.

21 сакавіка на 10 сутак асудзілі адміністратара сайту grodno.net **Аляксея Радса**, затрыманага напярэдадні.

**Пінск**

15 сакавіка затрымалі актывістаў выбарчай кампаніі **Віктара Ярашука**, **Сяргея Касьцюковіча**, **Канстанціна Чувака**, **Бадзевіча** (яго забралі проста з працы), **Паўла Аляхновіча** (вайсковага пэнсіянэра затрымалі, калі выгульваў сабаку). Аляхновіч абвесьціў 17 сакавіка галадоўку.

**Берасьце**

15 сакавіка затрымалі **Юрася Губарэвіча**: яго зьвінавацілі ў парушэньні правілаў дарожнага руху. 17 сакавіка ягонаму аўтамабілю прабілі колы каля міліцэйскай абласной управы: актывіст падаваў заяву на тое, што яго перасьледуюць падчас паездак па вобласьці. Калі Губарэвіч ад'ехаў ад міліцыі, яго спыніў работнік ДАІ, які зьняў нумары з аўтамабіля, заявіўшы, што машына своечасова не прайшла тэхагляд.

**Зьмітра Шыманскага** асудзілі на 10 сутак па абвінавачаньні ў арганізацыі несанкцыяванага сходу, **Рыгору Бакіевічу** далі 7 сутак арышту, зьвінаваціўшы ў дробным хуліганстве. Падчас распаўсюду агітацыйных матэрыялаў А.Казуліна ў Берасьці 15 сакавіка былі затрыманыя **Юры Бацук** і **Алесь Сацук**. 17 сакавіка міліцыянты затрымалі праваабаронцу **Уладзімера Вялічкіна** й засудзілі на 5 сутак: да таго яго некалькі гадзінаў вазілі па горадзе з пакетам на галаве і пагражалі.

У Янаве (Берасьцейшчына) 16 сакавіка затрымалі **Уладзімера Казеку**.

**Працяг на староньцы 14.**




**Без канцэрту на плошчы Бангалор 18 сакавіка**

## ХРОНІКА

**Працяг са старонкі 13**

Назіральніка **Ігара Кучынскага** 17 сакавіка выклікалі ў КДБ — потым ён адмовіўся ад назіраньня за выбарамі.

18 сакавіка затрымалі **Ю.Губарэвіча, Яўгена Пракурата** (абодвух асудзілі 20 сакавіка на 5 сутак), **Андрэя Карпука** і **Зьмітра Філіпчука** (асуджаныя на 2 сутак). 20 сакавіка судзілі кіраўніцтва гарадзкога й абласнога штабу Казуліна ў Берасьці: **Валянціна Лазарэнкава**, **Сьвятаслава Валасюка, Ігара Маслоўскага** (усіх асудзілі на 7 сутак), **Ганну Канюс** (5 сутак).

19 сакавіка міліцыянты затрымалі **Ўладзімера Радзівончыка**, заявіўшы яму, што ён праходзіць па крымінальнай справе за дыскрэдытацыю Беларусі. Затрымалі й **Сяргея Яўціфеева**: ён нёс перадачу затрыманым раней актывістам штабу А.Казуліна. Пазьней Яўціфеева асудзілі на 7 сутак арышту за «дробнае хуліганства».

21 сакавіка на 7 сутак арыштаваны **Ўладзімер Красько** — за «лаянку ў прысутнасьці дзяцей».

### Баранавічы

15 сакавіка затрымалі **Вячаслава Болбата**, актывіста групы А.Казуліна.

У баранавіцкі шпіталь 16 сакавіка АМАПаўцы перавезьлі маладзевага актывіста **Мікіту Сасіма**, якому напярэдадні выразалі апэндыцыт і яшчэ не зьнялі швы. У дачыненьні да Сасіма пачалі крымінальную справу за ўхіленьне ад прызыву ў войска.

16 сакавіка затрымалі аўтамабіль сябра АГП **Сяргея Андрушчанкі**. Яго абвінавацілі ў перавышэньні хуткасьці, а пасьля згоды заплаціць штраф склалі пратакол за хуліганства і арыштавалі на 7 сутак.

16 сакавіка **Віктара Карлінскага** асудзілі на 6 сутак, **Зьмітра Палойку** — на 3 сутак за «дробнае хуліганства». У гэты ж дзень за «несанкцыяваны сход» (так быў ацэнены збор актывістаў Казуліна на прыватнай кватэры) аштрафаваныя **Ўладзімер Гоўша, Карней Пятровіч, Мікалай Северцаў, Віктар Аляхновіч, Міхаіл Мінін** і **Аляксандар Гальковіч**. Кожны зь іх дастаў штрафу ў 20 б.в. (620 тыс.).

Міліцыянты наведваліся 17 сакавіка ў кватэры актывістаў **Алеся Пікулы** і **Віктара Мезяка**, але не змаглі іх знайсьці.

### Рэчыца

На 7 сутак 15 сакавіка асуджаны **Валеры Пуціцкі**: яго затрымалі на працы і зьвінавацілі ў хуліганстве. На 2 б.в. Рэчыцкі райсуд аштрафаваў **Алега Шабетніка** за тое, што той расклейваў на агітацыйным стэндзе налепкі А.Казуліна. 17 сакавіка яго затрымалі за «непрыстойныя паводзіны ў грамадзкім месцы». 20 сакавіка адбыўся суд, які вынес яму папярэджаньне: сьведкі пацьвердзілі, што актывіст ня лаяўся на вуліцы.

**Уладзімера Невара**, актывіста каманды Казуліна, 17 сакавіка выклікалі па тэлефоне ў міліцыю.

### Полацак

15 сакавіка падчас распаўсюду афіцыйных агітацыйных матэрыялаў Казуліна затрымалі **Сяргея Нецялёва**: яму інкрымінуюць дробнае хуліганства.

**Васіля Храмцова**, актывіста штабу А.Мілінкевіча, асудзілі на 5 сутак арышту: яго абвінавацілі, што, едучы на аўтамабілі, не прапусьціў на пешаходным пераходзе мінака. Судзьдзя ня ўзяў пад увагу, што Храмцоў хварэе на цукровы дыябэт і павінен тройчы ў суткі рабіць уколы інсуліну.

У Наваполацку 17-га сакавіка затрымалі **Васіля Верасава** падчас распаўсюду агітацыйных матэрыялаў А.Казуліна. У міліцыі ў яго папрасілі прабачэньня, калі пабачылі, што матэрыялы выдадзеныя афіцыйна, і прывезьлі на тое месца, дзе затрымалі.

### Менск

15 сакавіка моладзевых актывістаў **Вольгу Сакалову** і **Антона Столяра** асудзілі на 7 сутак арышту за дробнае хуліганства: пры аглядзе ў іх знайшлі 200 улётак.

Аўтамабіль **Паўла Жука** зь перадвыбарчымі ўлёткамі спынілі 15 сакавіка й канфіскавалі агітацыю.

16 сакавіка затрыманыя **Ігар Шынкарык** і **Анатоль Лябедзька**: у гаражы Лябедзькі адбыўся ператрус, на яго склалі пратакол за дробнае хуліганства й адпусьцілі да 21 сакавіка. 17-га



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**не было б сёньняшняга стаяньня на Кастрычніцкай плошчы.**

## ХРОНІКА

сакавіка кіраўнік КДБ С.Сухарэнка на прэсавай канфэрэнцыі зьвінавацію Лябедзьку ў датычнасьці да тэрарызму.

16 сакавіка затрымалі **Платонава**, **Бляяўскага**, **Марозава**, **Мацкевіча**, **Руміна** — актывістаў штабу А.Казуліна, якія мелі пры сабе агітацыйныя матэрыялы кандыдата ў прэзыдэнты. Пры затрыманьні ў хлопцаў адразу забралі мабільныя тэлефоны.

Палітолягу **Андрэю Суздальцаву** 17 сакавіка скасавалі від на жыхарства: да 23 сакавіка расейскі грамадзянін мусіў пакінуць тэрыторыю Беларусі. Прычыны высылкі не тлумачацца.

17 сакавіка затрымалі, а 20 сакавіка засудзілі моладзевых актывістаў **Алеся Зарамбюка**, **Сяргея Салаша** (3 сутак), **Яўгена Скрабутана** (5 сутак), **Юр'я Карэтнікава** (7 сутак), **Зьмітра Мацельскага** (5 сутак) і **Сержука Кастыленку**. У кватэры правялі ператрус і знайшлі некалькі бел-чырвона-белых сьцягоў.

Пасьля перадачы прадуктаў затрыманым грамадзянам Украіны 17 сакавіка ў Менску затрыманы сябра ўкраінскай моладзевай арганізацыі «Студэнцкае брацтва» **Дзяніс Нібіёк**: яму закідаюць дробнае хуліганства.

Падчас санкцыяванага пікету 17 сакавіка затрымалі актывістаў КХП—БНФ **Анатоля Лагутава**, **Мікалая Ўстымчука**, **Мікалая Галаўнёва** і **Алу Гуцаву**.

Падчас Народнага галасаваньня 19 сакавіка затрыманы актывіст КХП—БНФ **Уладзімер Юхо** (асуджаны на 7 сутак).

**Ігара Іванова** затрымалі 19 сакавіка за тое, што ён фатаграфаваў на выбарчым участку.

Перад сустрэчай з дэмакратычнымі кандыдатамі 19 сакавіка былі затрыманыя лідэр незарэгістраванай Беларускай партыі Свабоды **Сяржук Высоцкі**, **Ігар Гіцэвіч** (20 сакавіка абодва асуджаныя на 5 сутак арышту), **Алег Корбан**, **Павал Ялавін**, **Юры Фабішэўскі**.

Актывіста хрысьціянскага руху **Аляксея Шэіна** затрымалі 19 сакавіка ва ўласнай кватэры міліцыянты-аўтаматчыкі й прадстаўнікі КДБ: яны заявілі, што шукаюць у памяшканьні зброю ці бомбы. Не знайшоўшы нічога, журналіста абвінавацілі ў брыдкаслоўі ды затрымалі.

Пасьля мітынгу былі затрыманыя грамадзянін Расеі й 7 грамадзянаў Украіны — сяброў украінскай моладзевай арганізацыі **«Нацыянальны альянс»**. 20 сакавіка іх дэпартавалі зь Беларусі.

Уначы на 20 сакавіка ў Менску былі затрыманыя 5 актывістаў штабу А.Казуліна: вядомыя імёны толькі двух — **Ігар Несьцяровіч** і **Павал Будоўскі**.

20 сакавіка асуджаныя **Сьвятаслаў Сокал**, грамадзянін Расеі **Аляксей Сьцяпанаў**, **Дзяніс Дзюба** (усе па 10 сутак), **Зьміцер Сюдак** (15 сутак). Затрыманыя **Сяргей Міхноў** (зьбіты пры затрыманьні), **Уладзімер Кішкурна, Сяргей Лукін, Валер Мазынскі, Аляксей Януkевіч, Зьміцер Гурневіч, Бірук, Рышытоўскі, Буклей, Уладзімер Казак, Юлія Касьпер, Кухарава, Сяргей Касько, Алег Жлутка, Юры Чавусаў, Зьміцер Хілько** (адпушчаны), **Аляксей Таболіч** (адпушчаны), **Тацяна Хома, Анатоль Лябедзька, Аляксандар Дабравольскі, Тацяна Елавая, Юры Сідун, Вольга Кузьміч, Валянціна Палевікова, Людміла Гразнова** (адпушчаная).

### Магілеў

14 сакавіка затрымалі моладзевага актывіста **Максіма Дварэцкага** — за «дробнае хуліганства», яму прысудзілі 6 сутак.

19 сакавіка затрыманы **Аляксандар Сілкоў**.

20 сакавіка на 5 сутак арышту асудзілі моладзевага актывіста **Алега Мяцеліцу**: яго абвінавацілі ў брыдкаслоўі на вуліцы. Мяцеліцу павінны былі выпусьціць 18 сакавіка пасьля другой запар 15-дзённай адседкі, але жонка так і не дачакалася яго на выхадзе з ізалятару часовага ўтрыманьня.

### Палітвязьні

Да палітвязьня **Паўла Севярынца** ў інтэрнацкі пакой 15 сакавіка падсялілі супрацоўніка камэндатуры.

Палітвязьня **Сяргея Скрабца** 17 сакавіка адвезьлі ў папраўчую калёнію Віцьба Віцебскай вобласьці. Два тыдні таму яго клалі ў турэмны шпіталь у Менску, каб

**Працяг на старонцы 16.**

# Лукашэнка дзеліць газэты на «благія» і «харошыя»

Прэс-канфэрэнцыя Аляксандра Лукашэнкі 20 сакавіка для журналістаў, чальцоў ураду, прадстаўнікоў вэртыкалі і першакурсьнікаў Акадэміі кіраваньня, якія занялі пустыя месцы ў залі, засьведчыла: новаабраны прэзыдэнт нічым не адрозьніваецца ад стараабранага: любіць віншаваньні, не адказвае на непрыемныя пытаньні і робіць сэнсацыйныя прызнаньні.

Ён заявіў, што 19 сакавіка «Бог быў зь беларускім народам. Нідзе не было такой жудаснай завеі, як на гэтай плошчы». Потым усе пачулі, што ўдзельнікам падзеяў — 14—15-гадовым юнакам — на плошчы заплацілі па 20 тыс. рублёў. Потым Лукашэнка заявіў, што Мілінкевічу патэлефанавалі з Амэрыкі й загадалі абвясьціць сябе прэзыдэнтам. «Ён усю ноч думаў і не пагадзіўся. Вялікі дзякуй яму за гэта».

На пытаньне пра ўзровень жыцьця людзей у «зоне кантролю» ў Веткаўскім раёне, ён адрэагаваў рэзка: «Урон ад аварыі для Беларусі склаў каля 300 млрд даляраў. І мы самастойна такіх грошай знайсьці ня можам. І я параіў бы Амэрыцы, замест таго, каб укідаць сотні мільярдаў у вайну, дапамагчы Беларусі. Вось гэта будзе сяброўскі жэст».

На пытаньне журналіста «НН» (адзінае па-беларуску): «Ці залежыць ад вас як ад прэзыдэнта, каб недзяржаўныя газэты («Товарищ», «БДГ. Деловая газета», «Народная Воля») зноў друкаваліся ў Беларусі?» А.Лукашэнка адказаў разгорнута. Пачаў з таго, што «вы аплёўваеце народ. Вам выгадна друкавацца за мяжой». На крык журналіста (адразу пасьля пытаньня адключаюць мікрафон, так што апаніраваць прэзыдэнту складана) аб тым, што «НН» выходзіць у Беларусі, А.Лукашэнка дадаў: «Ну вось, бачыце — вы харошая газэта, друкуецеся ў Беларусі і будзеце друкавацца надалей».

**Зьміцер Дрыгайла**

# Супярэчнасьці чытачкі Ананіч

Сярод імпрэзаў, што прайшлі ў Інфармацыйным цэнтры ЦВК у дзень выбараў, была прэс-канфэрэнцыя першага намесьніка міністра інфармацыі Ліліі Ананіч. Яна выказала некалькі выразных антыноміяў.

Па-першае, паведаміла, што «па невядомых Міністэрству інфармацыі прычынах адзін з кандыдатаў у прэзыдэнты не скарыстаўся сваім правам друку перадвыбарчай праграмы ў цэнтральных СМІ». Аднак потым зазначыла, што прычыны ўсё ж вядомыя: «Да 26 лютага праграма не была пададзеная ў цэнтральныя газэты адпаведным чынам. Таму яна й не была надрукаваная».

Потым спн.Ананіч выказала задавальненьне, што падчас выбарчай кампаніі міністэрства ня выказала ніводнага папярэджаньня газэтам, апрача «Згоды» зь яе карыкатурамі. «Значыцца, газэты паставіліся да асьвятленьня выбарчай кампаніі адказна», — задаволена засьведчыла Ананіч. І амаль тут жа чамусьці павяла пра супрацьлеглае: «Пасьля выбараў мы правядзём сур'ёзны аналіз публікацыяў у некаторых газэтах падчас выбарчай кампаніі, дамо ім ацэнку й разьбяромся зь іх правамоцнасьцю». І працягнула: «Некаторыя газэты дазвалялі сабе адкрытую агітацыю за таго ці іншага кандыдата. Але некаторыя і ўвогуле паставіліся да гэтага безадказна (пар. яе ж характарыстыку працы ўсіх СМІ як адказнай, дадзенай за тры хвіліны дагэтуль. — **З.Д.**), і распаўсюджвалі заклікі да маладых людзей прыйсьці на плошчу. Вось, напрыклад, як расцаніць матэрыял «Парады мітынгоўцам» у адной з газэтаў, не хачу рабіць гэтай газэце рэкляму (матэрыял Алеся Кудрыцкага ў «НН» № 9. — **З.Д.**): тут жа адкрытым тэкстам утрымліваюцца прызывы прыйсьці на плошчу й мітынгаваць. Што гэта за парады?

Мне давялося перапытаць спн.Ананіч, як яна перакладае зь беларускай слова «парады», а калі пачуў толькі: «Я разумею беларускую мову», паведаміў «правільны адказ».

**ЗД**

## ХРОНІКА

**Працяг са старонкі 15.**

падлекаваць ад бранхіту і падагры. «Выздараўленьне» палітвязьня адбылося акурат напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў.

**Ашмяна**

15 сакавіка зьбіральніцу подпісаў **Тацяну Клімовіч** аштрафавалі на 5 б.в. за выяўлены ў падпісным аркушы фальсыфікаваны подпіс.

17 сакавіка затрымалі **Пятра Явідовіча**: каля дому актывіста чакалі некалькі міліцыянтаў. Жонцы на тэлефанаваньне ў міліцыі сказалі, што Явідовіч прабудзе там 4 дні. За кратамі актывіст абвясьціў галадоўку. Яго шпіталізавалі, бо мае язву страўніка.

**Нон-грата**

15 сакавіка польскіх назіральнікаў **Войцеха Бародзіч-Смалінскага** й **Катажыну Квяткоўскую** не пусцілі ў Беларусь, хоць яны былі акрэдытаваны беларускім МЗС і мелі візы.

На беларуска-польскай мяжы затрымалі й доўга надглядалі аўтамабіль **Уладзімера Радзівончыка**, актывіста штабу Мілінкевіча ў Пружанах, не пускаючы яго на радзіму. Радзівончыка дапыталі на мытні й паведамілі, што ён фігуруе ў крымінальнай справе як абвінавачаны. Ад актывіста вымагалі фальшывых зьвестак на А.Лябедзьку.

Прадстаўніка польскай партыі «Права і справядлівасьць» **Марака Сускага**, які хацеў прыехаць назіральнікам на выбары, 17 сакавіка не пусцілі ў Беларусь. Яго дэпартавалі 18 сакавіка зранку, а ўвечары — грузінскіх парлямэнтароў, затрыманых 16 сакавіка.

У Горадні 18 сакавіка затрыманыя расейскія грамадзяне **Вольга Гарэлік** і **Якаў Шэгідэвіч**, якія прыехалі як журналісты. Іх адпусьцілі пасьля праверкі дакумэнтаў. Расейскіх дэмакратаў з моладзевага руху «Абарона» **Аляксандра Гальмакова**, **Аляксея Навасёлава**, **Андрэя Хачапурава** і **Дзьмітрыя Волава**, якія прыехалі як карэспандэнты газэты «Правое дело», затрымалі 18 сакавіка ў Гомелі й дэпартавалі ў Расею без тлумачэньня прычынаў. У гэты ж дзень затрымалі прадстаўніцу міжнароднай арганізацыі «Моладзь — грамадзяне сьвету» расейку **Вольгу Ўласаву**, якая прыляцела авіярэйсам зь Екацярынбургу. У Салігорску карэспандэнтаў расейскай газэты «Правое дело» **Ўладзімера Іванова**, **Аляксандра Болдырава** і **Генадзя Панкова** затрымалі 19 сакавіка. Іх выслалі зь Беларусі, а Іванова й Болдырава яшчэ й асудзілі на штраф у 20 тыс.руб.

Уначы з 17 на 18 сакавіка на ўкраінска-беларускай мяжы быў высаджаны зь цягніка актывіст украінскай арганізацыі «Нацыянальны Альянс» **Руслан Конеў**: яго накіравалі назад ва Ўкраіну.

У карэспандэнта «Украинской газеты» **Аляксандра Цынкевіча** 19 сакавіка на беларуска-ўкраінскай мяжы канфіскавалі 750 даляраў, падазраючы, што ён вязе іх «для рэвалюцыі».

20 сакавіка на акцыі пратэсту затрыманы грамадзяне Грузіі **Лада Гагіяшвілі**, дзякан **Басіл Кабахідзэ**, кіраўнік баптысцкага аб'яднаньня Грузіі **Малхаз Сангулашвілі**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Штодня моладзь ладзіць на катку Кастрычніцкай плошчы фэерычнае шоў сьцягоў.**

## ХРОНІКА

На мяжы затрыманая здымачная група ўкраінскага **«Новага каналу»**, якая вярталася ва Ўкраіну зь Менску: у журналіста **Міхаіла Шаманава** і апэратара **Сяргея Дарохіна** канфіскавалі 4 відэакасэты.

### Віцебск

На 7 сутак арышту 16 сакавіка засудзілі **Валер'я Шчукіна**, які праводзіў назіраньне за выбарамі: яго зьвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы на сяброў камісіі й «неахайным выглядзе» — Шчукін прыйшоў на ўчастак у джынсах. На выбарчым участку затрымалі 16 сакавіка й **Дзяніса Латыша**, які развозіў агітацыйныя матэрыялы А.Мілінкевіча: некалькі гадзінаў у міліцыі цягнулася разьбіральніцтва, якое высьветліла, што агітатар не парушаў закону.

На 4 сутак засудзілі **Кастуся Смолікава**, актывіста кампаніі А.Мілінкевіча: яго зьвінавацілі ў непадпарадкаваньні міліцыянтам.

Назіральнікам **Тацяне** і **Канстанціну Севярынцам** і **Ніне Кавалёвай** дазволілі назіраць за выбарамі на ўчастку №18 па відэаманіторы: на самім участку ім быць забаранілі «ў сувязі з малой плошчай памяшканьня» (40 м²). Толькі 17 сакавіка камэра была прыбраная з участку, і назіральнікаў зарэгістравалі нармальным чынам.

17 сакавіка ўвечары затрымалі **Хрыстафора Жаляпава**: міліцыянты выказалі прэтэнзіі да яго нага аўтамабіля.

18 сакавіка міліцыянты правялі несанкцыяваны ператрус дому ў актывіста **Сяргея Салодкіна** ў ягоную адсутнасьць: спасласяліся на сыгнал ад суседзяў, што тут раздаюць «забароненую газэту». Знайшлі 250 асобнікаў краязнаўчага выданьня «Покліч волі», якое Салодкін выдае ў дазволеных законам памерах (299 асобнікаў) і бясплатна распаўсюджвае.

Назіральніка **Сяргея Парсюкевіча** затрымалі 19 сакавіка, 20 сакавіка ён быў асуджаны на 5 сутак і за кратамі абвясьціў галадоўку.

Сябра КХП—БНФ **Сяргея Кушнярова**, які хацеў забраць свой бюлетэнь, згодна з Народным галасаваньнем, 19 сакавіка пасадзілі за краты. На яго склалі пратаколы за дробнае хуліганства і непадпарадкаваньне работнікам міліцыі. Суд перанесены на 4 красавіка.

### Жодзіна

На 7 сутак за дробнае хуліганства 16 сакавіка асуджаныя маладзевыя актывісты **Сяржук Гудзілін**, **Яўген Ваўкавец** і **Алесь Чырэйка**. У кватэры С.Гудзіліна адбыўся ператрус: у пошуках «кампрамату» міліцыянты ўзламалі падлогу ў кватэры й разабралі на часткі шафу.

У гэты ж дзень на 7 сутак засудзілі 17 сакавіка **Зьмітра Чарткова**: яго прывезьлі ў пастарунак з дому і склалі пратакол пра непадпарадкаваньне патрабаваньням работніка міліцыі.

### Барысаў

Папярэджаньне ад пракуратуры атрымаў 16 сакавіка **Леў Марголін**: яму пагражалі судовай адказнасьцю, калі адбудзецца запляnаваная на гэты дзень сустрэча Мілінкевіча з выбарцамі. На наступны дзень яго засудзілі на 10 сутак.

20 сакавіка на выезьдзе з Барысава затрыманыя **Віктар Гарба-**

# «Дадзеныя не адпавядаюць...

Раніца 19 сакавіка. Цэнтравыбаркам. Некалькі дзясяткаў журналістаў з БТ блукаюць па фае малой залі. Наперадзе — суткі цяжкай працы па асьвятленьні «яскравай і бясспрэчнай». Рэпартаж Зьмітра Дрыгайлы з Палацу Рэспублікі.

Першая прэс-канфэрэнцыя Лідзіі Ярмошынай. Па стане на 10.00 яўка выбарцаў склала фантастычныя 40%. Кіраўнічка Цэнтравыбаркаму адмаўляецца назваць лічбы датэрміновага галасаваньня, заявіўшы, што ЦВК іх адмыслова не лічыў. Праз нейкі час на сайце ЦВК зьяўляюцца лічбы ўдзелу ў датэрміновым галасаваньні: 31,3%. У 2001 г. было 14,3%.

Пасьля зьяўляецца кіраўнік аналітычнага цэнтру «Экаом» Сяргей Мусіенка і прэзэнтуе вынікі экзыт-полу: у Лукашэнкі — больш за 82%, астатнія разам набіраюць 7%. Супраць усіх — 10%. Але на паперцы не прастаўлены час апытаньня. Мусіенка бянтэжыцца: «Забыліся паставіць». Журналісты дзеляцца на два лягеры. Прадстаўнікі першага бягуць па інтэрвію да Мусіенкі, другога — едуць правяраць на выбарчыя ўчасткі, як працуюць «экзыт-полеры».

Выбарчы ўчастак у школе па вул. Куйбышава, 19. Дзьве трэцякурсьніцы БДУ і мужчына гадоў пад пяцьдзясят апытваюць выбарнікаў паводле звычайнай мэтодыкі — аднаго празь дзесяць чалавек, намагаючыся ўлічваць пол і ўзрост. Але людзі адмаўляюцца гаварыць. За паўгадзіны апытана 19 чалавек. 16 — адмовіліся, адказалі тры. Бабуля — за Лукашэнку, кабета — за Мілінкевіча, дзядзька — супраць усіх. Паказваем дзяўчынам з «Экаому» вынікі, прэзэнтаваныя Мусіенкам зранку, просім пракамэнтаваць: ці розьняцца ад тых, што маюць яны. Дзяўчыны мяняюцца ў твары. Адна зь іх, Кацярына, мармыча: «Гэтыя дадзеныя... не адпавядаюць... і адпавядаюць таксама. Я не магу нічога гаварыць...»

Па стане на 14.00 яўка па краіне складае ўжо 71,1%. Журналіст БелаПАН Юры Пацёмкін у сэрцах запытвае ў сакратара ЦВК Мікалая Лазавіка, ці можа яўка скласьці 103%? Лазавік адказвае: «Дзякуй апазыцыі за спробы дэстабілізацыі».

У Палацы Рэспублікі сумна. Задарма прапануецца кава-гарбата, печыва, газэта «Советская Белоруссия» за 15 сакавіка на крэйдаванай паперы, *The Minsk Times*, розныя афіцыйныя часопісы і даведнікі. Усё астатняе — за грошы. У тым ліку і Інтэрнэт для журналістаў. Гэта зразумела. Журналістаў акрэдытавалі 750, кампутараў — толькі 50.

Пад вечар зладзілі некалькі прэс-канфэрэнцый розных назіральнікаў запар. Усе яны засталіся задаволеныя й не заўважылі ніякіх парушэньняў. Сярод міжнародных назіральнікаў — сябры Камуністычнай рабочай партыі Вугоршчыны, малдаўскі дзеяч, які першы раз назірае за выбарамі, ды «штатны» брытанец Марк Элманд, які наадварот назірае за ўсімі выбарамі ў Беларусі ад 1994 г. і прызнае, што яны праводзяцца штораз лепей. Ужо ня кажам пра задавальненьне ад хады й вынікаў місіяў назіральнікаў ад СНД і Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расеі.

Тымчасам на Кастрычніцкай сталі зьбірацца людзі, і дзяржаўныя журналісты пабеглі глядзець на дзіва, якога ў жыцьці ня бачылі. Праўда, пабеглі глядзець самыя сьмелыя, рэшта пайш-

## ХРОНІКА

чоў, **Анатоль Бякасаў** і **Людміла Шчарбакова**, якія ехалі ў Менск з матэрыяламі незалежнага назіраньня за выбарамі.

### Ператрусы ў Луньне

У мястэчку Лунна Мастоўскага раёну 16 сакавіка з санкцыі пракурора адбыліся ператрусы ў дамох актывістаў — **Уладзімера Брыцька** й **Лявона Карповіча** (абодва — КХП—БНФ) і дэпутата райсавету **Аляксандра Пудаўкіна** (ПКБ): канфіскавалі сыстэмныя блёкі кампутараў, друкаваныя палітычныя матэрыялы за некалькі гадоў. Міліцыянты заявілі, што ператрусы адбываюцца ў рамках сьледзтва па незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі «Партнэрства».

### Штраф за ўлёткі

Падчас распаўсюду ўлётак «Хопіць!» у вёсцы Валадзько Глыбоцкага раёну 16 сакавіка міліцыянты затрымалі мясцовага актывіста **Юр'я Буку**: яго аштрафавалі на 5 б.в.

### Налёты на грамадзкія арганізацыі

Зранку 16 сакавіка міліцыянт і чалавек у цывільным спрабавалі ўварвацца ў памяшканьне, дзе месьціцца аршанскія дэмакратычныя актывісты, у тым ліку прадстаўнікі зьліквідаванага ўладамі **Цэнтру імя Філона Кміты**. Аршанскія актывісты, якія не пусьцілі праваахоўнікаў, падазраюць, што тыя меліся канфіскаваць кампутарную тэхніку.

У Менску 18 сакавіка адбыліся налёты супрацоўнікаў сілавых структураў на офісы моладзевых арганізацыяў. На штаб-кватэры незарэгістраванага «Маладога фронту» супрацоўнікамі КДБ былі затрыманыя **Барыс Гарэцкі, Зьміцер Хведарук, Алена Ігнацік, Іван Шыла**: іх назвалі падазраванымі ў крымінальнай справе па прыналежнасьці да незарэгістраванай арганізацыі, якая парушае правы грамадзянаў. Позна ўвечары такі ж самы налёт адбыўся на офіс незарэгістраванага **«Задзіночаньня беларускіх студэнтаў»**: затрымалі **Васіля Лепеша** й **Івана Марозава**. 20 сакавіка іх асудзілі: Марозаў — 5 сутак, Лепеш — 3 сутак, Гарэцкі — 7 сутак.

У Менску ў будынку, дзе знаходзіцца офіс недзяржаўнага **Прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП)**, сапёры шукалі «выбуховую прыладу». У офісе правялі ператрус. Без тлумачэньня прычынаў затрымалі прафсаюзнага актывіста, журналіста **Івана Романа**. Журналісту прыстаўлялі да патыліцы пісталет, патрабуючы прызнацца ў шпіянажы. Потым вывезьлі ў кайданках у Ліду, дзе аштрафавалі на 2 б.в. «за брыдкаслоўе».

19 сакавіка адбыўся несакцыяваны ператрус у офісе незарэгістраванай **«Асамблеі няўрадавых арганізацыяў»**: міліцыянты шукалі выбухоўку і зброю.

### Перасьлед газэтаў

Газэту ПКБ **«Товарищ»** (85 600 ас.) арыштавалі 17 сакавіка менскія міліцыянты. Рэшта 200-тысячнага накладу была ў гаражы лідэра партыі **Сяргея Калякіна**, які адмовіўся адкрываць памяшканьне бяз санкцыі на ператрус. У адказ міліцыянты апячаталі гараж. Адзіная прэтэнзія міліцыянтаў — разгрузка накладу газэты не на юрыдычным адрасе рэдакцыі.

Уначы на 17 сакавіка на расейскай мяжы затрыманы 50-тысячны наклад газэты **«Народная Воля»**, які везьлі з Смаленску. Нумар дастаўлены ў Віцебскую міліцыю.

Вышэйшы гаспадарчы суд 17 сакавіка ліквідаваў недзяржаўную газэту **«Згода»** на патрабаваньне Мін'юсту. Рашэньне судзьдзя Аксана Міхнюк прыняла, не зважаючы, што газэта яшчэ мела час згодна з заканадаўствам абскардзіць апошняе папярэджаньне

# і адпавядаюць таксама»




**Пратаколы выбарчых камісіяў з суседніх участкаў падаюць моцна адрозныя лічбы.**

ла ў бар, дзе і правяла дзьве гадзіны перад абвяшчэньнем першых вынікаў. У бок плошчы, на якой віраваў натоўп у дзясяткі тысяч людзей, не павярнулася ніводная афіцыйная камэра. Папярэднія вынікі галасаваньня ўразілі. Найперш яўка: 92,6% (у 2001 г. — 83,8%).

Выніковай прэс-канфэрэнцыі Л.Ярмошынай дачакаліся ўсяго 40 чалавек. Старшыня ЦВК абвясьціла вынікі каля трох гадзінаў ночы: за Аляксандра Лукашэнку — 82,6% выбарнікаў (5 460 000), за Аляксандра Мілінкевіча — 6% (394 693 чалавекі), за Сяргея Гайдукевіча — 3,5% (250 000 чалавек), за Аляксандра Казуліна — 2,3% (154 000). У 2001 г. галасоў за Лукашэнку было на 800 тыс. меней. Найбольшую колькасьць галасоў А.Лукашэнка атрымаў па дадзеных з 338 закрытых участкаў (ваенных частак і больніцаў) — 92,2%.

Удзень па пустой Кастрычніцкай плошчы хадзілі міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў з намесьнікам Віктарам Філістовічам. На пытаньне «Як прэсе працаваць увечары?» Навумаў паказвае адмысловае месца на прыступках Палацу культуры прафсаюзаў, адкуль будзе потым прамаўляць Мілінкевіч: «Вось тут будуць абазначаныя месцы для прэсы, тут будзеце пачувацца ў бясьпецы». Але ўвечары месцы для прэсы былі адгароджаныя на супрацьлеглым баку плошчы — пад вялікім экранам. Зьяўленьне на ім Л.Ярмошынай было сустрэтае шматтысячным воклічам «Ганьба!».

## ХРОНІКА

Мін'юсту.

Галоўнага рэдактара «Местной газеты» ў Ваўкавыску **Андрэя Шантаровіча** затрымалі 18 сакавіка на вуліцы. Наступнага дня асудзілі на 3 сутак.

**Гомель**

Моладзевы актывіст **Сяргей Сямёнаў**, асуджаны на 10-дзённы арышт у адным з гомельскіх ізалятараў за «абразу чыноўніка», 17 сакавіка абвесьціў галадоўку.

18 сакавіка асудзілі **Юрася Захаранку** (7 сутак) і **Ўладзімера Шыцікава** (10 сутак). У гэты ж дзень затрымалі **Андрэя Толчына**, як толькі ён выйшаў з кватэры, і **Ўладзімера Кацору**, якога 20 сакавіка асудзілі на 8 сутак (абвінавачаньне — бойка на вуліцы).

**Жлобін**

На моладзевага актывіста **Эдварда Зелянкова** 17 сакавіка распачалі крымінальную справу за хуліганства (палітычныя графіці) і стварэньне незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі. За напісаньне графіці ён быў затрыманы на 3 сутак, выйшаў на волю 16 сакавіка: адпусьцілі на час сьледзтва.

**Шчучын**

У працоўным кабінэце доктара Шчучынскага раённага шпіталю **Васіля Бязьмена** 17 сакавіка адбыўсяператрус: забралі падшыўку старых газэтаў і Канстытуцыю СССР. Яго арыштавалі на 10 сутак за «нецэнзурную лаянку ў грамадзкім месцы».

**Смургоні**

17 сакавіка атрымалі па 5 сутак актывісты кампаніі А.Мілінкевіча **Алесь Дзергачоў** і **Юры Кутузаў**: іх абвінавацілі ў непадпарадкаваньні работнікам міліцыі. Дзергачова судзілі па заканчэньні працоўнага дня: прысуд быў абвешчаны ў 19.40.

**Камянец**

17 сакавіка міліцыянты наладзілі ператрус у **Мікалая Баброва**, актывіста штабу Мілінкевіча.

**Вялейка**

Актывіста АГП **Уладзімера Малярчука** 17 сакавіка выклікаў старшыня выбарчай камісіі, які да гэтага адмаўляўся нават рэгістраваць яго назіральнікам. Актывіст, да якога дайшлі чуткі, што на яго хочуць распачаць крымінальную справу (ці то за «змову супраць улады», ці то за «тэрарызм»), пакінуў Вялейку.

12 сакавіка без прычыны затрымалі падлеткаў **Аляксандра Бутэра**, **Ганну Валынец** і **Вадзіма Зайца**, якія стаялі ўвечары на прыпынку: яны адмовіліся паказаць міліцыянтам зьмесьціва сваіх сумак. У пастарунку іх пратрымалі 4 гадзіны.

**Ворша**

Моладзеваму актывісту **Ігару Казьмерчаку** 17 сакавіка прыйшоў пазоў у ваенкамат на 20 сакавіка — трэці ад пачатку году. Яму пагражае звальненьне з працы. Выкладчык школы мастацтваў узяў адгул на 18—19 сакавіка і зьехаў з гораду. Аднак дырэктар школы затэлефанаваў на мабільны, заявіў, што не адпускаў з працы, ды прыгразіў звальненьнем.

18 сакавіка з працы быў звольнены настаўнік Роска-Сялецкай школы Аршанскага раёну **Ігар Крыштон**. Яго зьвінавацілі ў прагулах. Актывіст адпрасіўся з працы для ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Дырэктар школы адпусьціў яго, але пазьней заявіў, што мусіць звольніць: такі загад прыйшоў з раённага аддзелу адукацыі.

**Мазыр**

17 сакавіка затрыманы **Ўладзімер Целяпун**. Наступнага дня яго й **Дзяніса Ванюшкіна**, затрыманых падчас раздачы праграмы А.Мілінкевіча, асудзілі на 5 сутак — за «непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі».

# Дні і ночы волі

Хроніка Кастрычніцкай плошчы

## Панядзелак, 20-га сакавіка

Тысячы людзей ізноў маніфэстуюць у панядзелак. На Кастрычніцкай плошчы пануе эўфарыя: нямногія чакалі, што зьбярэцца столькі людзей. Адмысловую атмасфэру ствараюць гудкі аўтамабіляў — большасьць кіроўцаў так выяўляюць салідарнасьць зь мітынгоўцамі. Моладзь коўзаецца на каньках зь бел-чырвона-белымі сьцягамі за плячыма. Сьцягоў, сьцяжкоў і сьцяжочкаў шмат — людзі скарысталіся магчымасьцю спакойна пранесьці іх да плошчы. Недзе на падыходзе да цэнтру затрымліваюць Уладзімера Кішкурну й Валера Мазынскага.

Пераважную большасьць мітынгоўцаў складае моладзь. Яна бярэ ініцыятыву ў свае рукі: сёй-той прыносіць і раздае стужкі, сінія балёнікі. У тэрмасах людзі прыносяць чай.

Мітынг пачынаецца з выступу Аляксандра Мілінкевіча, якога людзі вітаюць воклічамі: «Мі-лін-ке-віч! Мі-лін-ке-віч!» «*Яны* нам сёньня аб'явілі *іхныя* вынікі. Ім здаецца, што хтосьці паверыць. Большасьць нармальных людзей сьмяецца над гэтымі працэнтамі. Гэта ня выбары, гэта — дзяржаўны, антыканстытуцыйны пераварот! Ганьба!» — Мілінкевіч заклікае лічыць Лукашэнку незаконным прэзыдэнтам.

Аляксандар Казулін разам з прыхільнікамі ўсталёўвае на плошчы зроблены мастакамі «Звон свабоды» ды заклікае ўхваліць «Дэклярацыю народу Рэспублікі Беларусь». Лідэр БСДП (Грамада) прапануе лічыць выбары 19 сакавіка не адбытымі і правесьці паўторныя 16 ліпеня. А.Казулін абяцае, што будзе на плошчы, покуль на ёй будуць людзі.

На мітынгу выступаюць Анатоль Лябедзька, акадэмік Аляксандар Вайтовіч, дэпутат Дзярждумы Ўладзімер Рыжкоў.

Людзі з захапленьнем сустракаюць стайкі белых чаек у небе — вястунак вясны. Падпяваюць Лявону Вольскаму, Зьмітру Бартосіку. Горача віталі Ўладзімера Арлова, Андрэя Хадановіча. Пляскаюць Іне Кулей. Адзіны кандыдат некалькі разоў бярэ слова, хоць зусім хрыплы. Народ вітае яго авацыяй. Мітынг ідзе жвавей, дзякуючы лепшаму гукаўзмацненьню і чаргаваньню музыкі й выступаў.

А.Мілінкевіч заяўляе пра рашэньне

## ХРОНІКА

**Узда**

**Віктара Крываля** выклікалі ў раённую пракуратуру за ягоныя выказваньні пра фальсыфікацыю вынікаў выбарчых кампаніяў.

**Гарадок**

На выбарчым участку затрыманы 17 сакавіка дэпутат райсавету, назіральнік **Леанід Гаравы**, актывіст каманды А.Казуліна. Яго зьвінавацілі, што «перашкаджаў працы выбарчай камісіі». Суд у выхадны дзень, 18 сакавіка, аштрафаваў яго на 5 б.в.

**Лельчыцы**

Дадому да **Мікалая Гаўрыленкі**, актывіста Мілінкевіча, 13 сакавіка прыйшлі ўначы міліцыянты, пакінулі позву да пракурора.

**Масты**

На 15 сутак арышту асуджаныя 17 сакавіка актывісты з Мастоў **Зьміцер Кухель** і **Зьміцер Панасік**.

**Шклоў**

18 сакавіка затрымалі актывіста **Аляксандра Шчарбака**: у хаце адбыўся несанкцыяваныператрус, знайшлі старыя нумары незарэгістраванай газэты «Шклоўскія навіны» і налепкі. З Шчарбака спрабавалі ўзяць падпіску пра нявыезд.

**Астравец**

18 сакавіка на 5 сутак арыштавалі **Мікалая Аўласевіча**: на вуліцы да яго падышлі міліцыянты й прапанавалі прайсьці ў пастарунак. Калі ён спытаў, навошта, яго абвінавацілі ў непадпарадкаваньні міліцыянтам.

**Жыткавічы**

17 сакавіка затрыманыя Міхаіл Козел і Мікалай Румянцаў: у іх канфіскавалі афіцыйныя друкаваныя матэрыялы. Міліцыянты кажуць, што пасьля гэтага адпусьцілі актывістаў, але дадому яны не аб'явіліся й тэлефоннай сувязі зь імі няма.

**Крупкі**

У сваёй хаце ў мястэчку Бобр 18 сакавіка а 17-й быў затрыманы мастак **Алесь Пушкін**.

**Ваўкавыск**

Ад 17 сакавіка пачалося дзяжурства міліцыі каля дамоў мясцовых актывістаў штабу Мілінкевіча — **Мікалая Аксаміта** і **Аляксандра Барадаўкіна**, якога папярэдзілі, што затрымаюць, калі ён паспрабуе выехаць з гораду.

**Лунінец**

18 сакавіка затрымалі за «дробнае хуліганства» **Віталя Карытыша**.

**Горкі**

**Эдуарда Брокарава** міліцыянты спынілі 18 сакавіка й агледзелі яго сумку. Пасьля гэтага ў двары дому, дзе жыве актывіст, быў выстаўлены пост.

**Верхнядзьвінск**

**Аляксея Шафрана** (в.Валынцы) 15 сакавіка арыштавалі на 15 сутак: ён зрабіў палітычныя графіці ды паставіў пад імі сваё прозьвішча.

**Лепель**

**Алега Тычыну** спрабавалі затрымаць 19 сакавіка за тое, што забраў бюлетэнь і пайшоў з выбарчага ўчастку. Калі А.Тычына, **Аляксандар Маляўка** і **Вячаслаў Малаханаў** паехалі пасьля выбараў у Менск, іх затрымалі.

**Слонім**

Назіральніка **Алеся Масюка** затрымалі 19 сакавіка на выбарчым участку, заявіўшы, што ён пачаў бойку. 20 сакавіка яго двойчы вазілі ў суд, але штораз адпускалі.

**Гарадзенскія суды**

21 сакавіка ў Горадні асудзілі затрыманых напярэдадні «ўдзельнікаў несакцыяванага шэсьця»: па 10 сутак арышту атрымалі **Пятро Анісімовіч**, **Кірыла Жалудок**, журналісты **Анджэй Пісальнік**, **Ігар Банцар**; на 7 сутак асуджаны **Юры Клімчук**. Затрымалі **Яўгена Лясоцкага**, які толькі выйшаў у гэты дзень пасьля 5-дзённага арышту. **Андрэй Панасік** знаходзіцца пад хатнім арыштам: на яго распачалі крымінальную справу за прыналежнасьць да незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы «Партнэрства».

**Тадэвуша Гавіна** выклікалі 21 сакавіка ў Гарадзенскі РАУС: яго спрабуюць абвінаваціць у падпале вясковай крамы. Калі сьледчы даведаўся, што да міліцыі прыехала і здымачная група Польскай тэлевізіі, ён ня стаў сустракацца з Гавіным.

**Суткі для пратэстанта**

5 сутак арышту прызначыў 21 сакавіка судзьдзя Маскоўскага раённага суда Менску Ўладзімер Аўдзеенка пратэстанту **Аляксею Шэіну,** абвінавачанаму ў нецэнзурнай лаянцы.

**Масавыя арышты**

21 сакавіка ў Менску адбыліся суды над затрыманымі ўначы і ўдзень дэмакратычнымі актывістамі. Некаторых затрымалі каля

застацца на плошчы на ноч ды заклікае людзей прыносіць чай, каву ды цёплыя рэчы. Яго падтрымліваюць прадстаўнікі руху «Хопіць!», што заклікаюць прысутных на плошчы прыносіць з дому намёты і разьбіць на плошчы палатачны гарадок.

Намёты паўстаюць, нягледзячы на спробу агентаў у цывільным перашкодзіць. Вакол намётаў шчыльным шэрагам выстаўляецца ахова. У 22.30 намётаў ужо восем. Мілінкевіч асабіста наведвае гарадок, вітаецца з насельнікамі. Ён заклікае да бестэрміновага пратэсту.

Выступаюць ня толькі менчукі. Слова бяруць і прыежджыя зь іншых гарадоў. Сьмех і воплескі зрывае палкоўнік-камуніст з Талачына Мікола Петрушэнка, які абураецца цэнамі на бульбу, што вырасьлі пад 1000 рублёў. Прамаўляе дэпутат Гомельскага гарсавету Юры Глушакоў. Прадстаўніца Бабруйску распавядае, што іхную машыну затрымлівалі па дарозе, але яны здолелі прарвацца на плошчу.

Сяргей Салаш, які 20 сакавіка выйшаў з прыёмніка-разьмеркавальніка, кажа, што за Мілінкевіча на Акрэсьціна прагаласавала 90%.

Пляменьнік Ніла Гілевіча перадае вітаньні ад народнага паэта Беларусі, які хварэе. Сын Міхаіла Марыніча Ігар зачытвае пасланьне ад бацькі: «Я веру ў перамогу».

Дэпутат парлямэнту Нарвэгіі заяўляе: вочы сьвету сёньня прыкаваныя да гэтай плошчы. Мітынгоўцы авацыямі вітаюць паведамленьне, што ЗША, Польшча, Літва не прызнаюць вынікаў выбараў.

Вакол плошчы ўлады забараняюць продаж гарачых напояў (чаю, кавы), іх не прадаюць нават у «Макдоналдсе». У адказ людзі распачынаюць падвоз на пляц кавы, прадуктаў і цёплых рэчаў. Міліцыя пагражае млявымі заявамі пра «адміністрацыйную адказнасьць». На 23.00 на плошчы застаецца пару тысячаў чалавек.

Мілінкевіч заяўляе, што дасягнутая дамоўленасьць зь міліцыяй: людзі застаюцца на плошчы, аднак музыку выключаюць — каб не парушаць грамадзкага парадку.

Вынікі дня: часам складалася ўражаньне, што лідэры апазыцыі ў сваёй тактыцы некрытычна капіююць украінскі сцэнар пратэсту. Але таксама ёсьць уражаньне, што людзям на плошчы мала абыходзіць тактыка палітыкаў — яны настроеныя пратэставаць і не здавацца.

Пуцін віншуе Лукашэнку зь перааб-раньнем. Прыходзіць віншаваньне з Тэгерану, у сераду — з Гаваны.

ЗША не прызнаюць вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі і падтрымліваюць заклікі правесьці паўторныя выбары,— з адпаведнай заявою выступіў прэс-сакратар адміністрацыі Скот Макклелан.

Генэральны сакратар Рады Эўропы Тэры Дэвіс назваў перавыбары Аляксандра Лукашэнкі фарсам. Канцлерка Нямеччыны Ангела Мэркель заявіла пра рашучую падтрымку беларускай апазыцыі.

Прэзыдэнт Літвы Валдас Адамкус паабяцаў падтрымку беларускаму народу.

Дэлегацыя Эўрапарлямэнту заяві-

**Працяг на старонцы 7.**

## ХРОНІКА

намётавага гарадка, некаторых — калі яны з сумкамі ішлі на пляц, каб перадаць прадукты мітынгоўцам.

Прысуды былі жорсткімі. Аштрафавалі **Вольгу Дземчанку** (журналістка газэты «Однако») — на 20 б.в. За краты на 10 сутак патрапілі **Даніл Пажараў, Тацяна Хома, Гец, Лугін, Ляхава, Пінчук, Уладзімер Каўбаска, Алег Гаўрылаў, Лявон Маліноўскі, С.Бабіцкі, Вольга Чарных, Андрэй Церашкоў, Юры Сідун, Кострычаў, С.Кардаш, Віталь Алейнік, Грыбовіч, Анушкевіч, Лучына, Юры Чавусаў, Аляксандар Дабравольскі, Вольга Кузьміч**. Па 12 сутак атрымалі **Аляксей Янукевіч** і **Андрэй Малаш**. На 15 сутак асуджаныя **Валер Мазынскі, Анатоль Лябедзька, Грабавы, Уладзімер Жараў, Андрэй Дзенісевіч, Алег Жлутка**. **Кацярыну Легізу** пасадзілі на 3 сутак. Пасьля суду над Лябедзькам у Дом правасудзьдзя не пусьцілі адваката **Аляксандра Галіева**, які выйшаў перапаліць.

Прысудаў засталіся чакаць затрыманыя **Зьміцер Федаровіч, Канстанцін Віктаровіч, Канстанцін Руткоўскі, Пятро Церашэнкаў, Ражкоў, Сьцепанцоў, Андрэй Сьцяпанаў, Сяргей Сьцяпанаў, Усьцінаў, Вайда, Бірук, Жаўток, Шаўчук, Гурко, Вехтаровіч, Антаніна Гулько, Канстанцін Чыкалаў, Пятро Дудановіч, Наста Кавалёва, Арцём Золатаў, Аляксей Валяеў, Зьміцер Шаўчэнка, Валеры Астраверхаў, Ільля Кульбіцкі, Мікалай Мяцельскі, Аляксандар Лычаўка, Сяргей Паходня, Вадзім Александровіч**, непаўналетні **Аляксей Папокаў, Юры Вінаградаў, Сяргей Марчык, Уладзімер Кучвальскі, Алена Мядзьведзева, Міхаіл Уласаў. Аляксандра Касько** 20 сакавіка зьбілі, забралі пашпарт і адпусьцілі. Уначы на 21 сакавіка разам з Звонам Свабоды на ўсю ноч былі затрыманыя скульптар **Алесь Шатэрнік** і пісьменьнік **Алесь Пашкевіч**.

Удзень затрымалі дэпутата польскага сейму **Ярослава Ягелу**: паводле папярэдняй інфармацыі, яго вінавацяць ва ўдзеле ў несанкцыяваным мерапрыемстве. Затрыманыя й эстонскія назіральнікі **Эрык Мора** і **Тарма Лехт**.

Увечары 21 сакавіка па дарозе на плошчу затрыманы дырэктар кавярні «Лёндан» **Юры Вінаградаў**.

### Віцебскія затрыманьні

21 сакавіка ў Віцебску затрымалі каля 15 дэмакратычных актывістаў, якія ўдзельнічалі ў акцыі пратэсту. Як паведаміў затрыманы **Сяргей Серабро** па мабільным тэлефоне з пастарунку, удзельнікаў акцыі завезьлі ў аддзяленьне міліцыі, не выказаўшы ніякіх абвінавачаньняў. З Затрыманых знаёмы яму быў толькі **Ўлад Токараў**, астатнія — невядомыя.

Прэвэнтыўна міліцыянты затрымалі **Хрыстафора Жаляпава**: каля кавярні «Ўсход» яму заявілі, што ён падобны да злачынцы, які знаходзіцца ў вышуку. З гэтымі ж тлумачэньнямі былі затрыманыя дэмакратычныя актывісты **Вадзім Баршчэўскі** й **Аляксей Гаўруцікаў**.

### Апісалі маёмасьць БХК

У офісе **Беларускага Хэльсынскага камітэту** 21 сакавіка адбыўся вопіс маёмасьці. Прэзыдыюм Вярхоўнага гаспадарчага суду Беларусі налічыў падаткаў і штрафаў праваабарончай арганізацыі прыкладна ў памеры 75 тыс. даляраў за дапамогу, атрыманую паводле праграмы TACIS.

### Прафсаюзны актывіст за кратамі

У Баранавіцкі ізалятар часовага ўтрымання 19 сакавіка патрапіў актывіст Беларускага незалежнага прафсаюзу з Горадні **Сяргей Ліпніцкі**. Ён з таварышамі ехаў у Менск электрычкай, пасьля праверкі дакумэнтаў яго затрымалі й асудзілі на 3 сутак. Прычыну супрацоўнікі Баранавіцкай управы міліцыі назваць адмаўляюцца.

### Бабруйск

Актывіста Зьмітра Доўгаля ўвечары 18 сакавіка затрымалі міліцыянты, завезьлі ў пастарунак, дзе пратрымалі амаль 2 сутак, абвінаваціўшы ў нецэнзурнай лаянцы. У той самы дзень затрымалі **Ігара Ходзьку**, актывіста БНФ.

### Сьветлагорск

Натальлю Бордак, зьбіральніцу подпісаў за Мілінкевіча, 21 сакавіка вымусілі звольніцца па ўласным жаданьні зь Сьветлагорскага цэнтру сацыяльнага абслугоўваньня насельніцтва.

### Берасьце

На 15 сутак 21 сакавіка асуджаны **Іван Спасюк**, актывіст каманды А.Казуліна.

# Дні і ночы волі

Працяг са старонкі 21.

ла, што Аляксандар Лукашэнка ня можа быць прызнаны легітымным прэзыдэнтам Беларусі.

Падтрымку мітынгоўцам выказалі старшыня Рады БНР Івонка Сурвілла і Зянон Пазьняк.

Намесьнік дзяржсакратара ЗША па краінах Эўразіі Дэніэл Фрыд заявіў, што выбары былі сфальсыфікаваныя.

Тым часам кіраўнікі Гомельскага і Берасьцейскага абласных штабоў Аляксандра Мілінкевіча Ўладзімер Кацора і Юрась Губарэвіч асуджаныя адпаведна на 8 і на 5 сутак арышту.

У Менску на розныя тэрміны арышту пакараныя 10 затрыманых 17—19 сакавіка грамадзкіх актывістаў.

У спэцпрымальніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна застаецца каля 60 палітычных актывістаў, арыштаваных за ўдзел у масавых акцыях. Некалькі зьняволеных пачынаюць галадоўку.

### Пастыры з пастваю

Напярэдадні нядзельнае імшы каталікі, што ходзяць да менскае катэдры, пераймаліся пытаньнем: ці можна будзе вольна патрапіць у храм? Але ўсё абышлося. Урачыстыя гукі сьвятое імшы ўзносіліся пад пярэстыя скляпеньні, зь якіх пазіраў разьятраны Хрыстос, які гоніць прэч гандляроў са сьвятыні. І пра гэтую гісторыю можна было пачуць зь нядзельнага казаньня. І яшчэ: «...Не ствары сабе куміра і ніякай выявы таго, што на небе ўверсе, і што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй зямлі. Не пакланяйся ім і не служы ім; бо Я Гасподзь, Бог твой, Бог апякун, які карае дзяцей за віну бацькоў да трэцяга і чацвёртага роду, ненавідзячых Мяне, і творачы міласьць да тысячы родаў любячым Мяне і саблюдаючым запаветы Мае...»
Імша адбылася паважная. Людзі, сьцяўшы вусны, лавілі кожную рэшту рэха праўдзівага слова. Пасьля дружнаю гурмою людзі рушылі пад Ратушу, засьпяваўшы. «Магутны Божа». Па нейкім часе купка каталікоў распусьцілася ў натоўпе на Цэнтральным пляцы. А яшчэ па нейкім часе ўжо было там відаць і нашых ксяндзоў, у звычайных строях.

## Аўторак, 21 сакавіка

Зранку адбылося праваслаўнае багаслужэньне, якое правёў а.Леанід (Акаловіч) зь Беларускай аўтакефальнай народнай праваслаўнай царквы, ён асьвяціў намёты.

Міліцыянты пачалі затрымліваць тых, хто нясе прадукты і цёплае пітво на плошчу. У мінакоў праглядаюць сумкі, спыняюць аўтамабілі — каб не правезьлі паесьці пратэстоўцам. У службовым запале некаторыя работнікі ДАІ спыняюць машыны ня толькі па дарозе на плошчу, але і — зь яго. Імгненна нараджаецца жарт: «Стой! Што вязеш? Прадукты ёсьць? — Няма, толькі наркотыкі. — Праяжджай». На выхадзе з аўтобуса на плошчу затрымліваюць рэдактара «НН» Андрэя Дынька і звозяць у невядомым кірунку. Штаб Мілінкевіча падлічыў страты Пляцу за першую ноч: 108 затрыманых.

Удзень колькасьць намётаў вырастае да двух дзясяткаў. Мілінкевіч прыяжджае на плошчу і заклікае сабрацца ўвечары: «Калі вы прынялі рашэньне тут заставацца, то я буду да канца салідарны з вамі». Кіраўнік палка міліцыі спэцыяльнага прызначэньня Ю.Падабед палохае: маўляў, на Пляцы ня больш за паўтары тысячы чалавек. «Хіба гэта намёты? Калі ўзьнікне пільная неабходнасьць, яны будуць вельмі хутка прыбраныя». Пратэстоўцы пачынаюць складаць сьпісы затрыманых.

Тым часам беларускія ўлады пачынаюць паляваньне на замежнікаў: затрымалі трох грамадзянаў Грузіі ды польскага парлямэнтара Ярaслава Ягелу, апошняга ўначы высылаюць з краіны.

### З Расеі зь любоўю

Тыя, хто ў пятніцу спрабаваў злавіць хоць каліва інфармацыі пра Беларусь на расейскіх тэлеканалах, былі расчараваны. Самай важнай падзеяй для Расеі было пахаваньне Мілошавіча. Затое тыя, хто пераключыўся на канал ТДК, дзе штовечар круцяць наўпраставае шоў «Сэксуальная рэвалюцыя», убачылі Ірыну Хакамаду, якая выказвала свае сымпатыі беларускай апазыцыі! На тэлефоннае пытаньне ў жывым этэры, як яна ставіцца да лідэраў беларускае апазыцыі, Хакамада адразу сказала, што яна за Мілінкевіча. Бо ён — лідэр аб'яднанае апазыцыі, якой вельмі цяпер цяжка. А па-другое — ён, на яе думку, вельмі прывабны мужчына. У вядоўцаў «Сэксуальнае рэвалюцыі» бровы ў той момант ад нечаканасьці папаўзьлі ўверх. Дзякуй, Ірына!

Увечары на плошчы сабраліся 5000 чалавек. Чакаюць прыезду Мілінкевіча, Казуліна ды «N.R.M.». Прыяжджаюць паслы Эўразьвязу, каб на свае вочы пабачыць падзеі. На гэты час раптоўна ўключаюцца вялізныя ліхтары на пляцы, якія да гэтага былі вымкнутыя.

На пляцы Мілінкевіч і Казулін заклікаюць абавязкова прыйсьці 25 сакавіка. Мілінкевіч абяцае заставацца зь людзьмі да апошняга. Ідзе сьнег. Уладзімер Арлоў у сваім выступе прапануе надаць плошчы імя Кастуся Каліноўскага.

Казулін перадае чуткі, што на ноч плянуецца жорсткі разгон намётавага гарадка. Датэрмінова (пасьля 20.00) зачыніліся ўнівэрсам «Цэнтральны» і Макдоналдс. Бліжэйшыя кавярні ўзьвінчваюць кошты на гарбату.

Абяцанага канцэрту «N.R.M.» не атрымалася праз адсутнасьць добрай апаратуры. Вольскі сьпявае адну песьню ўжывую, потым пачынаюць круціць песьні ў запісе.

Машыны па-ранейшаму вітаюць Пляц гудкамі, хоць міліцыянты й запыняюць такія аўтамабілі. Прапанова Казуліна разысьціся, каб сабрацца 25-га, не праходзіць. «Застаёмся», —



скандуе Пляц.

Вакол намётавага гарадка зьяўляюцца сьвечкі, выстаўленыя паўколам. Ноч у гарадку перабываюць Мілінкевіч з жонкай і сынам, Кася Камоцкая. Каб даставіць ваду і ня быць затрыманымі, моладзь выбіраецца групай у 40 чалавек.

Пад раніцу прыяжджае Ўладзімер Колас: «Віншую вас і лічу, што мы знаходзімся ў найлепшым месцы Беларусі — бо тут нараджаецца яе будучыня. Трэба стаяць да канца, і мы пераможам».

## Серада, 22 сакавіка

Раніца пачынаецца гімнам «Магутны Божа» — гэта ўжо традыцыя. Ля намётавага гарадка зьяўляецца купка агрэсіўных пэнсіянэраў, якіх асабліва разьюшваюць бел-чырвона-белыя сьцягі. На просьбу насельнікаў гарадка суняць хуліганаў-пэнсіянэраў, якія нецэнзурна лаюцца, міліцыянт адказвае: «У нас дэмакратыя».

Прынятае рашэньне не пускаць на тэрыторыю гарадка прадстаўнікоў афіцыйных СМІ. У другой палове дня падыходзяць спэцназаўцы з супрацоўнікамі Водаканалу: маўляў, трэба знайсьці й праверыць люк, праз які вада залівае мэтро. Аглядаюць усе намёты, люк выяўляецца пад самым апошнім. Падганяюць экскаватар.

Мілінкевіч заяўляе, што самая галоўная перамога ў тым, што ў Беларусі зьявілася грамадзянская супольнасьць.

У бальшыні замежных журналістаў, якія прыехалі асьвятляць выбары ў Беларусі, 23—24 сакавіка заканчваюцца акрэдытацыі МЗС. Яны будуць вымушаныя альбо зьехаць, альбо перастаць займацца прафэсійнай дзейнасьцю.

Увечары Мілінкевіч абвясьціў пра намер стварыць шырокі грамадзянскі рух «За свабоду»: абвяшчэньне яго прымеркаванае да Дня Волі — 25 сакавіка. Рух мае даць рэпрэсаваным студэнтам магчымасьць вучыцца за мяжой, стварыць надзейную сыстэму распаўсюду праўдзівай інфармацыі, стварыць умовы для свабодных і празрыстых выбараў. «Улада нахабным чынам скрала ў нас перамогу, таму за яе яшчэ трэба змагацца», — заявіў Мілінкевіч і заклікаў сабрацца на Кастрычніцкім пляцы 25 сакавіка а 12-й.

**Сабралі Сяргей Харэўскі, Аркадзь Шанскі**

**Амэрыка з намі**

Напярэдадні выбараў сьвет абляцела гучная навіна: Джордж Буш падтрымаў ЭГУ: «Я высока цаню імкненьне адміністрацыі, студэнтаў ды іншых прыхільнікаў унівэрсытэту да адукацыі, не зважаючы на цяжкую сытуацыю. Вашая сьмеласьць — гэта крыніца натхненьня для тых, хто імкнецца да свабоды ўва ўсім сьвеце». Цяпер для сотняў студэнтаў зь Беларусі, якія вучацца паўкансьпірацыйна, спатрэбіцца сьмеласьць. Адна рэч — штудыяваць у Вільні гісторыю мастацтва ці філязофію, бо ў Менску няма як атрымаць гэткія веды. А іншая — апынуцца зьнянацку саюзьнікамі Буша. Спазьнілася і публікацыя Бушавага дакладу пра даходы Лукашэнкі. Даклад, што мусіў стаць бомбаю, стаўся хлапушкай. У той самы час амэрыканцы выявілі нечуваны спрыт, заявіўшы ад імя Дзяржсдэпу пра несапраўднасьць выбараў яшчэ да падліку бюлетэняў. Ад заявы афіцыйнага Вашынгтону, галосна агучанай на засьнежанай Цэнтральнай плошчы, цяплей ня стала.



# Выбух на Кастрычніцкай плошчы

Плошча вымагае ня толькі рамантыкі, але й суворай прозы пад шыльдай «Біяпрыбіральня». Піша Аляксандар Класкоўскі.

Маскоўскі карэспандэнт «Комсомолки» пацешыўся, як «бацька» надурыў апазыцыю. Тая, маўляў, хацела ў нядзелю нарвацца на дручкі, але — аблом. Не атрымалася «карцінкі» для Захаду...

*Таварыш не разумее*, што для тысячаў беларусаў сам выхад на плошчу пасьля таго, як ім паабяцалі пакараньне аж да «вышкі», быў учынкам геройскім.

Дарэчы, борздаму газэтчыку варта было б пачытаць дасьведчаных камэнтатараў. Тыя сьцьвярджаюць, што ўстрымацца ад гвалту 19 сакавіка настойліва параіў Пуцін. Не ад вялікага дэмакратызму, а таму, што прыціснулі партнэры па «вялікай восемцы», у якой Маскве акурат выпала старшыняваць.

Зрэшты, пэўна, спрацаваў і чыньнік масавасьці. Наўрад ці наверсе чакалі, што столькі люду наплюе на страшылкі пра выбухі ды атруту з дохлых пацукоў. Народ толькі сьмяяўся, калі ў натоўпе раптам бабахаў балёнік. У той вечар многія зьведалі катарсіс ад разьвітаньня з хімэраю страху.

Плошча расставіла кропкі над «і».

Яна падвяла рысу пад спрэчкай, ці варта «ўдзельнічаць у фарсе». У выпадку байкоту нічога й фальшаваць ня трэба: агучвай сабе рэальны лік матчу з Гайдукевічам…

І тады б не было Плошчы.

Паўзучы таталітарызм мае ўласьцівасьць пакрысе акупаваць усе нішы, якія добраахвотна здае сьвядомая грамада. І наадварот: прайшоўшы праз усе колы перадвыбарчага пекла, маеш непараўнальна мацнейшы маральны грунт, каб патрабаваць новых, сумленных выбараў.

На Кастрычніцкай жа плошчы сапраўды адбыўся выбух. Толькі не паводле вэрсіі КДБ. Выбухнулі пратубэранцы грамадзянскай энэргіі.

Іншая рэч, што гэта сталася раптоўна і для лідэраў палітычнай апазыцыі. Пэўна, у ейных штабох не было дэталёвых распрацовак на выпадак беларускага Майдану (які вымагае ня толькі рэвалюцыйнай рамантыкі, але й суворай прозы пад шыльдай «Біяпрыбіральня»). Патэнцыял першага дня быў у значнай ступені змарнаваны.

Між тым, зазначаюць аналітыкі, чым яшчэ наканавана так пільна займацца апазыцыйным стратэгам у беларускіх умовах, калі не карпатлівай распрацоўкай вееру сцэнароў вулічнай дэмакратыі?

Мілінкевіч цьвяроза кажа, што ў нас болей імаверны ня ўзьнёслы ды тэлегенічны варыянт Памаранчавай рэвалюцыі, але цярністы шлях польскае «Салідарнасьці».

Сьвядомыя палякі паказалі тады ня толькі моц духу, але й дасканалае ўжываньне таго, што цяпер называюць палітычнымі тэхналёгіямі. Валоданьне імі надзвычай важнае для арганізатараў беларускага дэмакратычнага руху. Бо найхутчэй, што наперадзе цэлая эпапэя барацьбы з рознымі паваротамі сюжэту, прылівамі ды адлівамі палітычнае актыўнасьці.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Рэцэпт рапсавай рэвалюцыі



Прыгадаўшы, як падчас Памаранчавай рэвалюцыі ў пік Майдану Януковіч спрабаваў стварыць свой бела-сіні, падумаў, чаму б нашым уладам не адкалоць падобны фокус? Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Кропля камень точыць. Улада сама ўжо мусіць публічна разбураць міт пра стабільнасьць ды маналітнасьць. Калі ў 2001-м Лукашэнка абвесьціў пра элегантную перамогу, то гэтым разам мусіў пачаць сыпіч трыюмфатара фразай аб правале рэвалюцыі.

Дый дзяржаўная тэлевізія ўжо не абмяжоўваецца паказам пратэстаў у Францыі (памятаеце савецкі анэкдот «Мяне непакоіць Гандурас»?). Хай сабе скрозь зубы, але загаварылі пра намёты побач з рэзыдэнцыяй.

Энэргетыку Плошчы ня зьнішчыш. Можна спляжыць бульдозэрамі намёты, але маральны пляцдарм ужо заваяваны.

**19 сакавіка невядомы маладзён праехаў верхам на «сотцы» ўздоўж усёй Кастрычніцкай плошчы. Шматтысячная грамада вітала яго воплескамі.**




Распарадак дня жыхароў намётавага мястэчка «Мерзьні за бацьку!» і плян дзеяньняў на 22.03.06 — 23.03.06

22.00. Зьяўленьне на Кастрычніцкім пляцы моладзі з чырвона-зялёнымі сьцягамі, якая пратэстуе супраць агучаных ЦВК вынікаў выбараў. Плякаты: «Ярмошына хлусіць!», «Дастала!», «Нас кінулі!». Натоўп канцэнтруецца на прыступках Палацу Рэспублікі.

22 гадзіны 16 хвілін 33 сэкунды. Вядоўца агучвае зьвесткі незалежных экзыт-полаў. Аказваецца, за Яго прагаласавала не 82%, а 99,998%. Натоўп абураецца хлусьнёй ЦВК. Чуюцца сьвіст і крыкі.

22.30. Вядоўца прапаноўвае паставіць на плошчы намёты і стаяць, пакуль ЦВК не абвесьціць сапраўдныя вынікі галасаваньня. Бурныя воплескі.

22.45. Вядоўца абвяшчае пра пачатак беларускай «рапсавай рэвалюцыі», прыхільнікі якой мусяць набываць і насіць бутэлькі з айчынным рапсавым алеем.

22.46—23.32. Усталёўка намётаў. Адказны за дастаўку намётаў і іх усталёўку — інжынэрны полк Мінабароны.

23.47. Выстаўленьне аховы лягеру. Адказны за людзей і іх выстаўленьне — Цэнтральны РУУС.

00.02. Адбой. Удзельнікаў лягеру спэцаўтобусамі перавозяць на начоўку ў гатэль «Юбілейны».

8.00. Пад’ём. Удзельнікі перавозяцца з гатэлю і займаюць свае месцы ў намётах.

9.00. Правакацыі баевікоў апазыцыі. Жыхар лягеру пакінуў мястэчка, каб скарыстацца прыбіральняй па-за яго межамі, і вярнуўся… жывы-здаровы. Спэцрэпартаж БТ наконт таго, якімі таннымі сродкамі апазыцыя намагаецца манапалізаваць імідж пакутнікаў і перасьледаваных.

11.00. Спантанны прыход менчукоў да лягеру. Усе трымаюць бутэлькі рапсавага алею — сымбалю рэвалюцыі, — горача дэманструюць падтрымку жыхаром мястэчка і таксама перадаюць ім ежу. Заўвага: рэктарам ВНУ забясьпечыць яўку студэнтаў і жорстка яе пракантраляваць. Да тых, хто паспрабуе зафілоніць або зьесьці «хаўчык», прызначаны для жыхароў лягеру, ужыць гэткую меру, як выключэньне.

15.00. Абед жыхароў лягеру ў рэстарацыі «Журавінка».

17.00. Візыт у лягер замежных дыпляматаў з Узбэкістану, Туркмэністану і Ірану. Туркмэнскі амбасадар прапаноўвае прысутным у лягеры былым студэнтам ЭГУ, якіх выключылі па палітычных перакананьнях, закончыць вучобу ў Ашгабадзкай Найвышэйшай Акадэміі Конегадоўлі імя Туркмэнбашы.

18.31. Стыхійны масавы мітынг. Дастаўка ўдзельнікаў з прадпрыемстваў пад пагрозай прыпыненьня кантракту.

18.46. Гайдукевіч заяўляе, што не нясе адказнасьці за маладых людзей, якія могуць замерзнуць на пляцы. Усе дружна скандуюць «Ганьба!».

19.00. Канцэрт гурту «Сябры», які вянчае гіт «Слухай Бацьку». Публіка слухае мэлёдыю з запальнічкамі. Адказны за пажарную бясьпеку — Міністэрства па надзвычайных сытуацыях.

21.00. З экрану Ярмошына вызнаецца, што падтасавала выбары. Сапраўдная лічба — 99,999%. Агульнанародная радасьць. Беларуская «рапсавая рэвалюцыя» перамагла!

*Зацьвярджаю*

*Камэндант намётавага лягеру*

*Лелік Ушкін*

# Дабыць да сьвітаньня

Першая ноч на Кастрычніцкай плошчы.

Вечар 20 сакавіка. Жахлівы холад, вецер і вільгаць. Нібы надвор'е адмыслова загартоўвае Плошчу. Ноч пачалася, калі выключылі гучную музыку, што лілася, бадзёрачы, з калёнак. «Мы законапаслухмяныя людзі й ня будзем перашкаджаць жыхарам навакольных дамоў», — сказаў Аляксандар Мілінкевіч. Але беларускі Майдан ня спаў. Зыкі беларускага року гучалі ў самадзейным выкананьні; некалькі групак з гітарамі — наколькі хапала голасу й імпэту. «N.R.M.», «Крама», Віктар Цой — і «Магутны Божа». Пратэстант-вернік адзін сьпяваў шчымлівы рэлігійны гімн.

Калі А.Мілінкевіч увечары 20-га абвесьціў, што ўсю ноч правядзе зь людзьмі на плошчы, першай думкай было: зараз спэцназ выцісьне людзей з майдану і паскідае ў аўтобусы, што стаяць ля адміністрацыі прэзыдэнта. Незадоўга да 23-й была першая правакацыя: спэцслужбісты-«ціхары» на выхадзе з мэтро схапілі хлопца, які нёс на плошчу намёт. Людзям удалося яго адбіць. Аляксандар Казулін усклаў адказнасьць за гэта на Паўлічэнкаў СОБР.

Сам Паўлічэнка сачыў за разбудовай лягеру (спачатку — чатыры намёты, потым — яшчэ шэсьць, нарэшце — яшчэ восем) з балькончыку над уваходам у мэтро каля Дому афіцэраў. У малінавым барэце. У стылёвай форме. Усе сілавыя ведамствы — у поўнай баявой гатоўнасьці. А тым часам на плошчу вязуць цёплыя коўдры, спальнікі, гарбату ў тэрмасах. Ад тых некалькіх тысячаў, што былі на мітынгу ўвечары, засталося каля 500 чалавек. «Большасьць людзей, якія начавалі на пляцы ў першую ноч — гэта 16—20-ці гадовыя, — кажа ўдзельніца стаяньня ў свабодзе Ларыса Бухаленка. — Дзяўчаты і юнакі выглядалі як анёлы, якія нічога не баяцца. Ды і чаго баяцца? Мы не парушалі ніякіх законаў. Мы стаялі на пляцы і патрабавалі справядлівасьці». Таксама засталіся Аляксандар Мілінкевіч з жонкай і Аляксандар Казулін. Пачалася першая ноч супрацьстаяньня.

Сілавікі, зразумеўшы, што людзі застаюцца, вырашылі перакрыць канал паступленьня гарачага пітва й ежы. Упершыню ў гісторыі людзі атрымлівалі суткі арышту за тое, што маюць пры сабе тэрмасы. Байцы спэцназу даглядаюць усіх, хто йдзе на плошчу з заплечнікамі й пакетамі. Але ўсіх ня спыніш.

Другой мішэнню спэцслужбаў былі актывісты. Хто адышоў у інтэрнэт-кавярню ці ў пункт сувязі Белтэлекаму, іншыя, што жывуць непадалёк, хацелі схадзіць дадому па гарбату і ежу, трэцiя невялікімі групамі спрабавалі дабрацца да Ўправы БНФ — папіць гарачай гарбаты й схадзіць у прыбіральню. Людзі ў спартовых штанах і куртках чорнага колеру, што трымалі варту з усіх бакоў плошчы, затрымлівалі й грузілі ў машыны. Часам разгортваліся цэлыя міні-апэрацыі. Каб узяць Аляксея Янукевіча, які а трэцяй ночы пайшоў у інтэрнэт-кавярню «Саюз-онлайн», да яе падагналі аўтобус зь цёмным шклом. Апэрацыя заняла некалькі імгненьняў. Выскачылі чатыры-пяць браткоў у чорным — і Янукевіч пабачыць волю праз 12 сутак. А каля ГУМу ў гэты ж час затрымалі старшыню АГП Анатоля Лябедзьку й яго намесьніка Аляксандра Дабравольскага, якія пайшлі папіць гарбаты. Дарэчы, гарбата ў той вечар ва ўсіх навакольных месцах скончылася надзіва хутка.

«Як выйсьці зь лягеру і вярнуцца?» — запыталася знаёмая ў амонаўцаў. «Вазьміце з сабою замежнага журналіста, а лепей двух. І з тэлекамэрай», — адказалі тыя. У другой палове ночы, калі стала відавочным, што людзей хапаюць пачкамі на бліжэйшых падыходах, журналісты ўзялі актывістаў пад сваю апеку і суправаджалі іх у адлучках зь лягеру.

Падалося, што такія затрыманьні — рэзэрвовая стратэгія. Міліцыянты відавочна спадзяваліся, што натоўп рассмокчацца сам сабой. Апошнія спадзевы рухнулі, калі ў лягеры была вырашаная праблема прыбіральні: з каналізацыйнага люку зьнялі накрыўку ды паставілі над ім намёт.

Моладзь, каб сагрэцца, ладзіць прабежку вакол намётаў са сьцягамі. Спачатку бягуць адзін за адным восем чалавек, потым усё болей, урэшце, каля 30 чалавек утвараюць бегавое кола. Выглядае вельмі прыгожа. Скончаецца гарачая вада. Трэба неяк уцяпляцца. Алькаголь катэгарычна забаронены. Аксакалы рэвалюцыяў на чале зь Вячаславам Сіўчыкам паказваюць комплекс практыкаваньняў, каб не замерзнуць. Яшчэ грэюцца, скандуючы лёзунгі. Самыя папулярныя: «Жыве Беларусь!», «Мы пераможам!», «Свабода! Свабода!», «Праўда!», «Разам!», «Не сыходзім!», «Міліцыя з народам!».

Знайшліся цёплыя рэчы і ежа. Чакаляда, печыва, нават курыца. У кагосьці быў тэрмас з надзвычай смачнай гарбатай.

Хлопец тэлефанаваў сябрам зь Берасьця: «Прыяжджайце, усё спакойна й добра». Панавала атмасфэра салідарнасьці і сьвята свабоды.

Але а трэцяй ночы зьявіліся зьвесткі, што праз гадзіну лягер будзе затакаваны. «Ня бойцеся, гэта толькі псыхічная атака, як у «Чапаеве». Узмацніце кола вакол намётаў». Ніхто і не баяўся. Ніякай атмасфэры страху.

Чацьвертая гадзіна. Нічога не адбылося. Мянчук Ігар пашкадаваў: «Эх, была б дадатковая разнастайнасьць». Уначы час цягнецца марудна.

Разнастайнасьць унесла жанчына, якая называла сябе нашчадкам графа Патоцкага. Яна спрабавала прарвацца да намётаў праз кола і крычала: «Я супраць Лукашэнкі, але хто вы такія? Хто вашыя лідэры? Нічога не атрымаецца!» Зь першым сьвятлом яна зьнікла.

Раніцу сустрэлі воклічамі: «Ранак!» З калёнак прагучаў гімн «Магутны Божа». Першы аўтобус №100 Плошча сустракае моцным «Далучайся». Пасажыры дзівяцца, прывітальна махаюць рукамі. У другую ноч людзей было ўдвая болей. Задача мітынгоўцаў — пратрымацца як мінімум да 25 сакавіка. Задача Мілінкевіча — дамагчыся перавыбараў 16 ліпеня. Супрацьстаяньне ўлады й новай дэмакратычнай апазыцыі працягваецца.

**Зьміцер Дрыгайла,**
**Андрэй Расінскі,**
**Алесь Козік**

# Як выжыць у намёце

У ноч на 21 сакавіка моладзь у намётавым гарадку на Кастрычніцкім пляцы трымала выпрабаваньне холадам і вільгацьцю — уначы тэмпэратура сягала –7, ранкам пайшоў вялікі сьнег. Як зьберагчы здароўе, жывучы на вуліцы ўзімку? Досьведам дзеліцца прафэсійны альпініст Валянцін Акудовіч.



Юлія Дарашкевіч

**Намёты.** Каб засьцерагчыся ад намаканьня, трэба пад намёт ці яго сярэдзіну пасьцяліць поліэтылен. Калі тэнт працякае, то зьверху таксама пажадана накрыць кавалкам поліэтылену — гэта і цяпло зьберажэ. Паветра ў сярэдзіне можна нагрэць адной сьвечкай. Варта памятаць, што самае халоднае месца ў намёце — падлога. Таму проста неабходна паклапаціцца пра наяўнасьць дыванка!

**Вопратка.** Цёплыя рэчы. Пажадана некалькі зьменных камплектаў (абавязкова некалькі параў цёплых шкарпэтак, сьвежыя шкарпэткі неабходна апранаць перад сном). Каб засьцерагчы ногі ад холаду, паверх шкаркэтак трэба адзець цэляфанавы пачак. Цэляфанам можна накрывацца ад сьнегу, ён таксама добра захоўвае цяпло. Спаць неабходна ў шапачцы, пажадана вязанай. Вопратка мусіць быць цёплай і ў той жа час па магчымасьці вольнай, каб нідзе нічога не перацінала, асабліва падчас сну.

**Харч.** Раз на дзень проста неабходна гарачы суп. У такіх сытуацыях ён лепей саграввае і засьцерагае ад абязводжваньня. Можна прыносіць з сабою кіпень у тэрмасах і булёны, ці хутка-супы. Плюс гарачая кава і гарбата.

**Што рабіць, калі пачынаеш мерзнуць.** У такіх выпадках трэба рабіць кругавыя рухі рукамі і нагамі. Гэта палепшыць кровазварот і дапаможа сагрэцца. Але ня трэба забывацца пра тое, што варта берагчы энэргію. Таму парухаліся, сагрэліся, і на нейкі час спыніцеся. Неблагі варыянт — рухавыя гульні, ці танцы пад музыку.

Варта сачыць за дыханьнем, бо на халодным паветры вельмі хутка можна застудзіць горла.

**Спаць у намёце** варта галавой да выхаду — у выпадку нападу так прасьцей зарыентавацца і выбрацца з спальніка.

Галоўнае — цёплая вопратка, гарачая ежа і сіла духу!

**Запісаў СП**

# Першы дзень рэвалюцыі

Калі людзей спачатку просяць не разыходзіцца, а цераз некалькі хвілінаў прапануюць сустрэцца наступным днём, ім ня можа не перадацца няўпэўненасьць арганізатараў. Піша **Віталь Тарас.**

Адным з самых фантастычных успамінаў для тых, хто сабраўся ўвечары 19 сакавіка на Кастрычніцкай плошчы, застанецца сьнежная віхура. Зарад сьнегу імгненна ахутаў плошчу шчыльным палотнішчам. Людзі ў засьнежанай вопратцы пад бел-чырвона-белымі й сінімі сьцягамі, якія ярасна шкамутаў вецер, нагадвалі нейкіх казачных пэрсанажаў. Сьнег, насуперак законам прыроды, ляцеў амаль гарызантальна, нібы разагнаны нябачным гіганцкім вэнтылятарам. Частка натоўпу пачала скандаваць: «Нас не засыпеш! Нас не засыпеш!»

Некаторыя пачалі мацаць сьнег рукамі і нават каштаваць яго на смак, каб зрабіць выснову — не, гэта ня можа быць натуральны сьнег. Нехта жартам выказаў меркаваньне, што за Палацам рэспублікі ўрубілі сьнегамёты — такія, што выкарыстоўваюць звычайна на лыжных трасах, як у Сілічах. У рэпартажы на адным з апазыцыйных сайтаў пра сьнегавую атаку гаварылася як пра відавочны факт. І хоць ніхто на свае вочы сьнегамётных машынаў нідзе ня бачыў, наступным днём апазыцыя заявіла нежартоўны пратэст з нагоды ўжываньня супраць мітынгоўцаў, так бы мовіць, неканвэнцыйнае зброі.

І яшчэ адно тлумачэньне можна было пачуць у натоўпе. Нехта ўздыхнуў з горыччу: ну вось, нават Бог яму дапамагае... Адразу ўспомнілася славутае: «Вы прасілі ў мяне дажджу — вось вам дождж!»

Але тут, зразумела, пра нейкае абагаўленьне ці дэманізацыю тырана гаворкі няма. Проста людзям у той вечар так хацелася стаць сьведкамі цуду, што нават стыхійная зьява таксама ўспрымалася як свайго роду цуд, адкрыцьцё. Толькі гэта быў цуд з прыстаўкай «анты».

І мала каму на плошчы прыходзіла ў той момант да галавы, што галоўны цуд — гэта яны самі. Іхная прысутнасьць на плошчы. Уся моц прапаганды, узброенай мільённымі накладамі газэтаў і дзясяткамі тэле- й радыёканалаў, усе пагрозы, у тым ліку й пагроза сьмяротным пакараньнем, разьбіліся, ператварыліся ў нішто, у пазалеташні сьнег. Проста людзі, якія стаміліся верыць бясконцым ілжывым абяцанкам улады, не паверылі гэтым разам і іхным пагрозам. Бо за гэтымі пагрозамі, акрамя рэпрэсіўнага апарату, снайпэраў, міліцэйскіх дручкоў, службовых сабакаў, вагон-закаў і спэцпрыёмнікаў-разьмеркавальнікаў, няма нічога — толькі агромністая пустэча, адсутнасьць фантазіі й бясконцая нудота.

### У нядзелю й больш ніколі

Колькі тысяч выйшлі на плошчу — 20 альбо 30, насамрэч, ня мае вялікага значэньня. Ніхто ня выйшаў на вуліцы бараніць «усенароднаабранага». Ніхто з 82-х ярмошынскіх адсоткаў. Калі б у афіцыйных зьвестках ЦВК было б хоць каліва праўды, мільёны выбарцаў выйшлі б на ту самую плошчу й раструшчылі б у пыл жменьку прыхільнікаў «фашыствуючага нацмена» Мілінкевіча.

Людзі, якія жывуць толькі дзеля сябе й свайго дабрабыту, зразумела, таксама людзі. Але назваць іх народам, нават грамадзтвам, нельга. Пакуль яны існуюць у сваім замкнёным сьвеце, дзе ёсьць толькі «чарка й скварка», іх як бы не існуе для грамадзтва, зь іхнымі галасамі можна рабіць што хочаш. А калі яны добраахвотна і самаахвярна выходзяць на плошчу, яны робяць крок насустрач да саміх сябе, да таго, каб стацца народам, нацыяй. Але ім яшчэ не хапае ўсьведамленьня сваёй сілы. І галоўнае, разуменьня таго, на чым палягае гэтая сіла. Ім здаецца, што чым болей іх будзе, тым лепш. І ў гэтым — частка праўды. Калі людзі на плошчы скандуюць «Сва-бо-ду!» у дзесяць тысяч галасоў, здаецца, само слова набывае матэрыяльную моц, і сьнежная завіруха пачынае аціхаць сама сабой.

Часам усяго некалькі чалавек могуць сваім учынкам зрабіць больш, чым агромністы натоўп. Калі, зразумела, гэтыя некалькі чалавек ведаюць, чаго яны хочуць, і могуць перадаць свае веданьне, сваю ўпэўненасьць іншым.

Журналісты, якія асьвятлялі падзеі на Кастрычніцкай плошчы, сышліся на тым, што галоўнай прычынай, з-за якой колькасьць удзельнікаў мітынгу пачала хутка зьмяншацца, стала адсутнасьць якаснай гукаўзмацняльнай апаратуры. Пачуць нешта з адлег-



Ніхто ня выйшаў на вуліцы бараніць «усенароднаабранага». Ніхто з 82-х ярмошынскіх адсоткаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ласьці далей за пяцьдзясят мэтраў ад прыступак Палацу прафсаюзаў было цяжка. Але гэта было толькі сьледзтвам, а не прычынай.

Калі б лідэрам апазыцыі ў той вечар было што сказаць сваім прыхільнікам па вялікім рахунку, паставіць перад імі канкрэтную мэту замест таго, каб чарговы раз лаяць рэжым — то ідэя авалодала б масамі і без гукаўзмацняльнікаў. А калі людзей спачатку просяць не разыходзіцца, а цераз некалькі хвілінаў прапануюць сустрэцца наступным днём, ім ня можа не перадацца няўпэўненасьць арганізатараў. Тым больш, калі ўсім зразумела, што наступнага разу можа й ня быць.

## Рэвалюцыя forever

Такое ўражаньне, што, загартаваныя рэпрэсіямі й жорсткім процідзеяньнем улады цягам усяе выбарчай кампаніі, штабы апазыцыйных кандыдатаў, сутыкнуўшыся з адноснай свабодай дзеяньняў, разгубіліся. Яны рыхтаваліся сутыкнуцца з АМАПам, а ўбачылі перад сабой тысячы прыязных твараў вольных людзей.

Яны ня ведалі, што з гэтай неспадзяванай падтрымкай і свабодай рабіць — як і тыя, хто прыйшоў на плошчу ў чаканьні цуду. Чаканьня цудаў можна даравацъ плошчы. Але арганізатары альбо тыя, хто прэтэндуе на ролю арганізатараў, павінныя цуды арганізоўваць, а не прыдумляць у сваё апраўданьне байкі пра чароўныя сьнегамёты.

Увесь час да выбараў большасьць журналістаў недзяржаўных мэдыяў трымаліся няпісанага правіла — не крытыкаваць аб'яднаную апазыцыю ды адзінага кандыдата на выбарах. Зараз, калі апазыцыя даказала сваю здатнасьць выводзіць людзей на плошчу, яна нясе поўную адказнасьць перад гэтымі людзьмі. Цяпер за свае памылкі яны адказваюць ня проста сваімі галовамі, яны адказваюць галовамі дзясяткаў тысяч людзей і іхных сваякоў. Мала дэкляраваць сваю гатовасьць стаяць да канца, трэба даводзіць гэта на справе штодня.

І тут ужо на паблажлівае стаўленьне грамадзтва, у тым ліку журналісцкай супольнасьці, разьлічваць ня варта.

З другога боку, трэба крыху суцішыць свой імпэт апантаным крытыкам у стане тых, хто прагнуў большага ды сьпяшаўся назваць 19-га сакавіка пачаткам «джынсавай рэвалюцыі». Калі нехта лічыць, што лідэр аб'яднанай апазыцыі ня спраўдзіў спадзяваньняў, дзейнічаў і дзейнічае недастаткова рашуча, дык хто перашкаджае камусьці іншаму ачоліць рэвалюцыйны рух і павесьці народ за сабой? Калі вас не задавальняе лідэр — вылучыце са сваіх шэрагаў свайго.

Але ж вядома, што дзевяць цяжарных жанчын не народзяць дзіця за адзін месяц. Таму перш, чым рыхтавацца да рэвалюцыі, трэба доўга займацца чорнай паўсядзённай працай. І не займацца самападманам накшталт таго, што «мы ўжо прачнуліся ў вольнай краіне». Вольная краіна — гэта ня казачнае каралеўства, гэта мы самі. Прынамсі, такія, якімі можам стаць.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Як нас палохалі

макетам Кастрычніцкай плошчы. Піша **Сямён Печанко.**

Цягам усёй прэзыдэнцкай гонкі апанэнты ўлады зазнавалі шалёны ўціск ды запалохваньне. Відэаздымкі на сустрэчах зь Мілінкевічам (мы ўсё бачым!), праслухоўваньне офісаў апазыцыі (мы ўсё чуем!),ператрусы і арышты актывістаў штабоў альтэрнатыўных кандыдатаў (дабяромся да кожнага, знойдзем што заўгодна!).

Пры канцы прэзыдэнцкай гонкі ў ход пайшлі элемэнты інфармацыйнай вайны. Спадзяецца апазыцыя на вулічныя акцыі — спэцслужбы папярэджваюць (ці намякаюць) пра брутальныя наступствы. Часам ім ненаўмысна-добраахвотна дапамагалі незалежніцкія ды партыйныя сайты. Яшчэ да прызначэньня выбараў пайшлі чуткі пра вучэньні пад Менскам з удзелам вялікай колькасьці міліцыі. Маўляў, нават ёсьць макет Кастрычніцкай плошчы, каб імітаваць разгон «дэманстрантаў».

У апошні тыдзень кампаніі ў Інтэрнэце зьявіліся лісты нібыта ад ананімных супрацоўнікаў МУС і КДБ. Сайт АГП апублікаваў ліст такіх нязгодных з рэжымам ананімаў-кадэбэшнікаў, якія прадказвалі масавыя арышты, правакацыі падчас вулічных акцыяў, адлучэньне Інтэрнэту ды мабільнай сувязі. Перад выбарамі belaruspartizan.org, naviny.by і сайт АГП паведамлялі пра пляны сілавікоў ужыць супраць дэманстрантаў спэцсродкі, кінолягаў ды вадамёты, пра сьцягваньне ў сталіцу жывой сілы і спэцтэхнікі. Каб пасеяць страх, былі пушчаныя чуткі пра магчымыя правакацыі на плошчы: выбухі ў месцах найбольшай канцэнтрацыі мітынгоўцаў, «мачылава», разьвязанае 500-мі (па іншых плётках — 400-мі) вэтэранамі спэцназу, засланымі ў натоўп асабіста экс-міністрам Сіваковым.

У пэўным сэнсе рэпэтыцыя адбылася 2 сакавіка: зьбіцьцё Аляксандра Казуліна, страляніна па аўтамабілі яго актывіста, арышт журналістаў, канцэнтрацыя міліцыянтаў і вайскоўцаў у цэнтры сталіцы, іхныя манэўры падчас сустрэчы Мілінкевіча з выбаршчыкамі.

Зразумеўшы, што запалохваньне слаба дзейнічае на мэтавую аўдыторыю, і адчуўшы, што ў палітыку ўцягваецца шырокае кола грамадзянаў, улады пайшлі на нечуваны крок — вуснамі кіраўніка КДБ фактычна абвесьцілі, што кожны, хто асьмеліцца выйсьці на вуліцу, абвяшчаецца тэрарыстам. І адпаведная кара за «дэстабілізацыю сытуацыі ў краіне»: ад васьмі год зьняволеньня да сьмяротнага пакараньня. Па БТ паказалі нібыта стажэраў у грузінскіх баевікоў, якія рыхтавалі тэракты ў менскіх школах. На думку палітоляга Валер'я Карбалевіча, гэта значна абмежавалі свабоду дзеяньняў апазыцыі падчас нядзельных мерапрыемстваў на плошчы.

Апагею гістэрыя страху дасягнула непасрэдна ў дзень выбараў. Праз sms-паведамленьні невядомыя папярэджвалі грамадзянаў пра «небясьпеку знаходжаньня на плошчы ўвечары ў нядзелю. (Паводле інфармацыі www. afn.by, нумар, зь якога рассылаліся паведамленьні, быў зарэгістраваны раніцай 18 сакавіка на БРСМ.) Зноў-такі некаторыя апазыцыйныя сайты паведамлялі пра тое, што на плошчу сьцягваюцца прадстаўнікі працоўных калектываў для «ўсенароднага сьвяткаваньня аглушальнай перамогі Лукашэнкі». Увечары на прылеглых да Кастрычніцкай плошчы вуліцах была сканцэнтравана неверагодная колькасьць міліцыянтаў, спэцназу, вайскоўцаў. У раёне вуліцы Першамайскай выпадковыя мінакі налічылі 32 вайсковыя грузавікі, 22 аўтобусы МАЗ з экіпіраванай для разгону дэманстрантаў жывой сілай. Сярод тых, хто кіраваў гэтай армадай, быў нібыта заўважаны Дзьмітры Паўлічэнка. На вуліцы К.Маркса былі заўважаныя паўтара дзясятка аўтобусаў МАЗ ды «Ікарус», на вул. Я.Купалы — каля 30-ці аўтамабіляў. Іншыя сьведкі кажуць пра запоўненыя дарэшты вайсковай тэхнікай вуліцы Інтэрнацыянальная ды Энгельса.

Ад раніцы па сталіцы хадзілі чуткі пра шчыльнае блякаваньне цэнтру гораду, зьнікненьне прыватнага транспарту з бліжэйшых вуліцаў.

І вось якое зьдзіўленьне напаткала сьмелых, што адважыліся прыйсьці на плошчу а 20-й — вольны ад кардонаў АМАПу пляц і тысячы па-сьвяточнаму настроеных «тэрарыстаў».

# Бяз вас

Уяўляю чэскую аксамітную рэвалюцыю, калі б Гавал адседжваўся на Захадзе, чакаючы, пакуль «народ захоча пераменаў», а ня быў дысыдэнтам, не сядзеў у турме і не рабіў бы *сам* гэтыя зьмены. Так адгукаецца наш чытач на артыкул Б.Янкевіч «Ратаваньне нацыі, ці Эміграцыя» («НН», №2).

Каля двух дзясяткаў маіх знаёмых удзельнікаў нацыянальнага руху выехалі за мяжу — хто вымушана, хто добраахвотна. І зь іх амаль *ніхто* нічога зараз ня робіць для самой Беларусі (акрамя Глыбоўскага ў Чэхіі). Нельга так казаць пра ўсіх эмігрантаў — я кажу пра сваіх знаёмых. Там яны маюць свае асяродкі ды падтрымліваюць адзін аднаго, але тут, у Беларусі, ад іх дапамогі — нуль. Безумоўна, яны нам патрэбныя там: калі зьвяртаесься да іх па дапамогу, у межах магчымасьцяў заўжды атрымліваеш яе. Але пераважная большасьць проста жыве сваім прыватным жыцьцём — вучацца, зарабляюць грошы. Гэта нельга асуджаць, але і апраўдваць іх бязьдзеяньне таксама ня варта.

## Калябарант Быкаў

Сваё жаданьне эканамічнай эміграцыі спн.Янкевіч апраўдвае «народнай апатыяй». Гэта яшчэ можна зразумець. А вось што зусім абуральна — гэта стаўленьне да тых, хто яшчэ спрабуе хоць нешта зрабіць, як да маргіналаў і калябарантаў. Хоць спн.Янкевіч і ня кажа так наўпрост, але мой асабісты досьвед паказвае, што менавіта так пераважная большасьць добраахвотных эмігрантаў і ўспрымаюць усіх, хто застаецца. Дый як разумець такія ацэнкі нашых сучасьнікаў як людзей, якія «*...штодня замбуюцца (а значыць, жадаюць замбавацца) БТ пра сваё ўласнае шчасьце*»? Калі падыходзіць з такімі ацэнкамі, дык у савецкія часы нашыя бацькі былі калябарантамі, якія толькі і жадалі, што замбавацца камуністычнай ідэалёгіяй. А ўзначальвалі гэтае калябаранцкае асяродзьдзе галоўныя зь іх — Коласы, Купалы, Быкавы, Караткевічы — а як жа, яны ж не парвалі адкрыта з камунізмам і ў савецкіх выдавецтвах выдаваліся! Адназначна, калябаранты! Толькі незразумела, як у такіх бацькоў зьявіліся мы, маладыя нацыянальна сьвядомыя эўрапейскія дэмакраты.

## Калі б Гавал падаўся ў эміграцыю

Замест таго, каб пераняць самаахвярную тактыку дактароў-гуманістаў, што з рызыкай для свайго жыцьця дапамагаюць хворым і такім чынам рэалізоўваюць свае каштоўнасьці (як рабілі адраджэнцы пачатку XX ст. — узгадайце беларускія ўцякацкія камітэты Першай сусьветнай), нам прапануюць тактыку пацукоў, што загадзя бягуць з карабля — «ратуюць гонар нацыі», «эліту». Уяўляю чэскую аксамітную рэвалюцыю, калі б Гавал адседжваўся на Захадзе, чакаючы, пакуль «народ захоча пераменаў», а ня быў дысыдэнтам, не сядзеў у турме і не рабіў бы *сам* гэтыя зьмены, разам са сваім народам.

З досьведу Цэнтральнай Эўропы XX стагодзьдзя і з нашага найноўшага досьведу зразумела — Беларусь можна зрабіць свабоднай толькі знутры Беларусі.

Усе гэтыя фразы аб «захаваньні эліты», бо сам народ «*жадае замбавацца*», — гэта толькі фігавы лісток, што прыкрывае простае апраўданьне ўласнай баязьлівасьці, ці псыхалягічнай стомленасьці, ці няздольнасьці пэўнай часткі маладых па-іншаму змагацца ва ўмовах відавочнай перавагі сілаў рэжыму (і на працягу невядома колькіх гадоў!), а таксама нежаданьня ўпускаць тыя магчымасьці, што дала папярэдняя праца ў руху. Гэтыя людзі згубіліся недзе ў расколіне паміж сваім імкненьнем добра жыць і сваімі ідэаламі, адстойваць якія штодня цяжка. Таму і ня бачаць яны выйсьця: «*Што яшчэ рабіць у краіне, дзе нікому (...) нічога не патрэбна, дзе апатыя стала проста нацыянальнай рысай, — я ня ведаю*».

А можа гэта такім, як спн.Янкевіч, ужо нічога *тут* не патрэбна? Скажыце, такая пазыцыя — гэта і ёсьць пераможны мэсыдж маладой беларускай дэмакратыі, зь якім мы пойдзем па падтрымку да сяброў-палякаў ды чэхаў? І каго яны будуць падтрымліваць — людзей, што канчаткова расчараваліся ў сваёй барацьбе, якія ня бачаць ніякай пэрспэктывы змаганьня за ўласны народ, пра «шчасьце» якога яны так актыўна галосяць? На самай жа справе гэта пазыцыя нейкіх духоўных трупаў, якія ўжо ня вераць ні ў сябе, ні ў свой народ.

## Адна кропля поту

Ніхто з такіх змагароў ня думае катэгорыямі «а чым я магу зараз дапамагчы, каб зьмяніць сытуацыю?». Усе яны толькі кажуць: «Досыць, мы ўжо і так дастаткова ўкалывалі і нічога з гэтым народам не зрабілі, ён так і не разумее перавагі дэмакратыі, ЭЗ і рынкавай эканомікі!» (цытата з адной размовы). І ніхто ня хоча шчыра прызнацца, што менавіта такая пазыцыя — гэта і ёсьць тая самая апатыя, толькі ўжо не ў самой нацыі, а тых, хто называе сябе яе *элітай*. Канечне, прасьцей заўважыць нешта ў чужым воку, чым у сваёй галаве. Менавіта пра такіх сказаў Пілсудзкі: «Яны хочуць свабоды, набытай адной кропляй поту і адной кропляй крыві».

Давайце будзем шчырыя — ніхто з такіх «змагароў за свабоду» і ня хоча разумець той народ зь яго праблемамі, і галоўнае — яны сапраўды лічаць яго неда-

Працяг са старонцы 32.




**Ноч 20 сакавіка. Усталяваньне намётаў на Кастрычніцкай плошчы.**

# Бяз вас

Працяг са старонкі 31.

лёкім, а сябе — не інакш ільвамі-лідэрамі, якія павінны тым народам кіраваць. Уяўляю сабе Купалу, які б проста зьехаў у эміграцыю ад тутэйшых праблем! Досыць прачытаць «Нашу Ніву» 100 гадоў таму, каб адразу ўбачыць, які ў іх быў аптымізм, як яны верылі ў свой народ, як яны ахвяравалі сабой, часам, сродкамі, а то і жыцьцямі на выцягненьне свайго любага Беларускага краю з багны, у якой ён быў. І менавіта таму цяпер мы яшчэ ёсьць як нацыя, хоць і з праблемамі самаідэнтыфікацыі.

## Прылёт упырхлікаў

Стагодзьдзе таму нашы папярэднікі мелі тыя ж праблемы, што і мы цяпер, — але яны мэтадычна спрабавалі іх вырашаць, хаця б праз асьветніцтва, і шмат што ім удалося. Ці мог бы сказаць Купала ў 1910 г. нешта падобнае да спн.Янкевіч: «*Таму час лепш выкарыстаць для падрыхтоўкі таго моманту, калі грамадзтва ўсё ж вырашыць, што яно хоча зьменаў... Тады сапраўды будзе неабходна адукаваная эліта для кіраўніцтва дзяржаўнымі структурамі на розным узроўні...*»?!

Трэба разумець, што нашыя добраахвотныя ўпырхлікі, адседзеўшыся ў замежжах ды атрымаўшы эўрапейскія адукацыі, менавіта сябе бачаць тымі кіраўнікамі дзяржаўных структур, якіх тэрмінова выклікае на радзіму народ пасьля рэвалюцыі. Праўда, незразумела, хто ж будзе ў грамадзтве рабіць тыя зьмены, калі эліта падасца ў эміграцыю «*рабіць свой маленькі бізнэс, каб пасьля зь яго зрабіць вялікі*»... І прыклад Купалы і іншых, што 100 гадоў таму сваёй штодзённай працай набліжалі жаданыя ім зьмены, а не адседжваліся па замежжах, у прынцыпе, нічому ня вучыць.

Можа быць, спн.Янкевіч, проста перастаць хлусіць самім сабе і разрывацца паміж ідэаламі Адраджэньня і ўладкаваньнем уласнага дабрабыту? Ніхто ж не абвінавачвае іх. Але і ня трэба падаваць усіх астатніх, што сьвядома застаюцца тут, лохамі, якія толькі і жадаюць, што замбавацца (ці па-іншаму — калябарантамі). Юдыф увогуле добраахвотна стала наложніцай Аляфэрна, каб выратаваць свой народ. І была ўвекавечана ў Бібліі. Ведаеце, калі я размаўляю з сваімі калегамі — грамадзкімі актывістамі, што яшчэ ня ўсё спалілі і сьвядома не жадаюць адсюль зьяжджаць, я бачу — вось гэта і ёсьць гонар нацыі, з такімі людзьмі мы ня можам не перамагчы. Справа толькі ў часе і ў тактыцы. І я ганаруся, што я знаёмы з гэтымі людзьмі, я ганаруся, што ў мяне ёсьць такія аднадумцы.

## The show must go on

Панове былыя маладыя лідэры, а цяпер добраахвотныя эмігранты! Калі на сёньня вы прайгралі і ня можаце ўладкавацца ў цяперашняй Беларусі — гэта бяда, якая з кожным з нас можа здарыцца. Едзьце, вас ніхто не трымае і не асуджае! Аднак ня трэба недарэчных апраўданьняў пра ратаваньне гонару нацыі ў эміграцыі.

Мы — ня першая і не апошняя старонка тысячагадовай гісторыі Беларусі. Не на нас яна пачалася і ня ў нас заключана. І таму ня трэба замыкаць увесь шматвяковы супраціў на асобах няспраўджаных лідэраў.

Супраціў тут працягнецца і калі вы зьедзеце. The show must go on. І калі Беларусь вас яшчэ сапраўды цікавіць, дык засуньце як мага далей і назаўжды такія дзіцячыя амбіцыі, як бачаньне сябе ў будучыні ў шэрагах «*адукаванай эліты для кіраўніцтва дзяржаўнымі структурамі*». Бо калі мы ня зможам *тут*, вас *адтуль*, з вашымі элітнымі адукацыямі, ніхто *сюды* не пакліча. Таму падумайце лепей над формай бескарыснай дапамогі, якую б вы асабіста маглі *сёньня* аказаць тым, хто *тут* яшчэ застаецца, над формай вашай *салідарнасьці* зь імі.

## Мы ўсе былі, але ня ўсе будзем

Нагадваю, што за 200 баксаў можна зрабіць летнік, за 500 — правесьці канцэрт, за 2000 — выдаць кнігу, за 40 000 — выратаваць Быхаўскі замак. І забудзьцеся пра сваю фанабэрыю і былыя лідэрскія дасягненьні! Усё гэта *было*, але ўсё гэта ўжо *ў мінулым*.

5—10 гадоў таму мы ўсе былі маладымі і патэнцыйна вялікімі лідэрамі. Праз 5—10 гадоў лідэрамі будуць толькі тыя, хто зараз застанецца тут працаваць. Прыміце той факт, што вас, верагодней за ўсё, у гэтым пачэсным шэрагу ня будзе.

І яшчэ. Як людзям з пэўным лідэрскім досьведам, вам даўно ўжо трэ было навучыцца адмаўляцца ад сваіх амбіцый дзеля дасягненьня супольных мэтаў, падпарадкоўвацца і працаваць на іншых, а ня толькі быць начальнікамі і кіраваць іншымі. Зь першага кроку на эміграцыі вы вызваляецеся ад лукашызму і ягонага замбаваньня, але з гэтага часу вы дакладна больш ня гонар і не эліта нацыі.

Эліта — заўжды з нацыяй, прымае яе беды, трагедыі і яе посьпехі як свае асабістыя. У лепшым выпадку вы цяпер — толькі элемэнт у вялікім мэханізьме змаганьня. Гэта ваша плата за той дабрабыт, які атрымоўваеце *там* замест непазьбежных праблемаў ад супрацьстаяньня рэжыму *тут*.

**Абрахман Узьбекаў, тутэйшы беларус**

**P.S.** Можа здарыцца так, што і я ў канцовым выніку прайграю. Тады і прыеду да вас і стану адным з вас. Але зараз я асабіста абіраю працу ў Беларусі, хоць бы тую мінімальную, што я яшчэ магу зрабіць. Вада і камень точыць. У мяне яшчэ засталіся магчымасьці нешта рабіць, нават калі мне штодня прыходзіцца размаўляць са сваім сумленьнем. Вельмі спадзяюся, што рэжым ня здолее мяне ператравіць, і ў мяне яшчэ стане сілаў прасьпяваць палянэз над ягоным трупам.

# Дні Волі

у кожнай эпохі яны свае. Пра сьвяткаваньне 25 Сакавіка ад 1919 да 2006 году піша **Алег Раявец.**

## «Ва ўзорным парадку»

Першы раз Дзень Волі адзначылі адразу цераз год пасьля прыняцьця гістарычнага акту — 25 сакавіка 1919 г., кажа гісторык Уладзімер Ляхоўскі. У Горадні, дзе знаходзіўся Ўрад БНР, была зладжана ўрачыстая імпрэза. У Менску тады сядзелі бальшавікі і, натуральна, сьвяткаваць было немагчыма. Дзень Волі тут адзначылі ў **1920 г.**, за часамі польскай улады. Стараньнямі Беларускага Нацыянальнага Камітэту, зазначае У.Ляхоўскі, у горадзе было зладжана вялікае сьвята. У менскіх школах былі адмененыя заняткі, у касьцёлах і цэрквах прайшлі ўрачыстыя набажэнствы. Протаярэй Уладзімер Біруля падчас сьвяточнай багаслужбы прамовіў казань па-беларуску. Ёсьць нават згадкі, што ва ўрачыстасьцях браў удзел Зьмітрок Бядуля, у форме маёра Беларускай Вайсковай Камісіі.

Потым цягам дваццаці гадоў Дзень Волі сьвяткавалі ў Заходняй Беларусі, а ў БССР калі й адзначалі, то цішком, прыватна. Старшыня Рады БНР Вінцэнт Жук-Грышкевіч апісаў сьвяткаваньне ў **1921 г**. у Вільні, якая тады ўваходзіла ў склад Сярэдняй Літвы. «Пасьля багаслужбы ўсе ўдзельнікі выходзілі з [Сьвятадухаўскай] царквы й затрымоўваліся на царкоўнай плошчы. Тут уфармоўваліся гімназія й пачатковыя школы, а таксама беларускі батальён, а за імі й маса грамадзтва й доўгім шнурам маршыравалі па вуліцах Вільні ў касьцёл Сьв. Мікалая на беларускую каталіцкую службу. (...) Па багаслужбе ўсе ў камплекце й узорным парадку вярталіся ў Базылянскія муры, дзе месьцілася Беларуская гімназія, у залі якой адбывалася ўрачыстая акадэмія».

У **1920—1930**-я Дзень Волі шырака адзначаўся ў Празе і Бэрліне, гарадах найбольшай канцэнтрацыі беларускай дыяспары. У пачатку 1940-х у Менску нават галоўную вуліцу гораду перайменавалі ў вуліцу 25 Сакавіка. Самае ж масавае сьвяткаваньне прайшло ў 1944 г., з урачыстай дэфілядай цераз Пляц Волі.

## У час нацыянальнага ўздыму

Наступным разам Менск масава сьвяткаваў Дзень Волі толькі ў **1989 г.** Паўсотні маладых людзей, згадвае Сяргей Харэўскі, сабраліся ля помніка Купалы зь бел-чырвона-белымі сьцягамі ды плякатам «Беларусь савецкая — Беларусь бяз будучыні». Але некалькіх міліцыянтаў акцыя не зацікавіла. І сьцяг нейкі незразумелы, ды яшчэ транспарант напісаны лацінкай. Мо паблыталі з замежнікамі.

У **1990 г.** на Дзень Волі ўжо сабралося некалькі сот чалавек, былі дзясяткі сьцягоў. Да сьвята нават выпусьцілі спробны (нулявы) нумар газэты «Свабода» — «Дзень Волі», што раздавалі між прысутных. З гэтага часу Дзень Волі стаў галоўным сьвятам беларускай інтэлігенцыі ў адрозьненьне ад афіцыйнага сьвята, 27 ліпеня.

Знакам яднаньня мэтраполіі і дыяспары стаў **1993 г.**, калі ўдзел у сьвяткаваньні Дня Волі ўзялі ажно два кіраўнікі Беларусі: старшыня Вярхоўнага Савету Станіслаў Шушкевіч і старшыня Рады БНР Язэп Сажыч.

Апошні спакойны ды традыцыйны Дзень Волі грамадзкасьць адзначыла ў **1995 г.** Мітынгоўцы прайшлі ад плошчы Перамогі на Опэрнага тэатру, дзе зладзілі імправізаваны мітынг. Зянон Пазьняк папярэджваў тады пра магчымы антыбеларускі рэфэрэндум па сымболіцы і мове.

## Дзень зачыстак

Ад **1996 г.** Дзень Волі стаў днём змаганьня. У той год ён сабраў ад 30 тыс. да 50 тыс. чалавек. Людзі прайшлі ад плошчы Незалежнасьці, дзе адбыліся першыя сутычкі са спэцназам, да Опэрнага тэатру. На мітынгу выступілі Васіль Быкаў, Генадзь Карпенка, Зянон Пазьняк, Ніл Гілевіч. Сяргей Антончык прапанаваў сабраць для Лукашэнкі грошай на квіток да Масквы ў адзін бок. Прысутныя з энтузіязмам ухвалілі прапанову. Потым дэманстранты рушылі да будынку тэлевізіі на Камуністычнай — патрабаваць этэру для апазыцыйных палітыкаў. Аднак спэцназ з дапамогай шчытоў і дубінак вельмі жорстка спыніў людзей. Потым насупраць будынку КДБ быў разгон тых, хто вяртаўся зь мітынгу. У гэты дзень усё было ў першы раз: дзясяткі затрыманых, першыя суткі, першая кроў, пралітая на акцыях супраць рэжыму. Гэта быў першы дзень Менскай Вясны, якая скончылася жорсткімі травеньскімі зачысткамі. Гэта таксама быў апошні Дзень Волі, які мы сьвяткавалі зь Зянонам Пазьняком у Беларусі. У ноч на 26 сакавіка лідэр БНФ «Адраджэньне» і ягоны намесьнік Сяргей Навумчык, унікаючы арышту, пакінулі Беларусь, нелегальна перайшоўшы ўкраінскую мяжу.

Напярэдадні Дня Волі ў **1997** г. — сьвяткаваўся 22 сакавіка — у сталіцы зьявілася 20 нацыянальных сьцягоў, у тым ліку на асьвятляльнай мачце стадыёну «Дынама». Некалькі тысячаў дэманстрантаў спрабавалі прайсьці пешкі ад плошчы Незалежнасьці да плошчы Якуба Коласа. Вынік — 100 затрыманых.

Дарэчы, у Горадні ў аналягічнай акцыі ўзялі ўдзел 3 тыс. чалавек, а падчас мітынгу Сямён Домаш заявіў, што «асноўным мэтадам барацьбы мусяць стаць вулічныя акцыі. Дыктатуру можа зьнішчыць толькі сам народ».

У **1998 г.** Дзень Волі, калі сьвяткавалася 80-годзьдзе БНР, сабраў 10 тыс. чалавек. Дэманстранты маршам прайшлі ад плошчы Я.Коласа да Опэрнага тэатру, дзе адбыўся мітынг. Маладафронтаўцы потым зладзілі сваю акцыю. Тры сотні маладых людзей паспрабавалі прарвацца на Кастрычніцкую плошчу, закідваючы амапаўцаў сыгнальнымі дымавымі шашкамі. Міліцыя прымяніла спэцсродкі. Яшчэ на той Дзень Волі Беларускі народны фронт пачаў акцыю «Грамадзянства БНР». Але стварыць супольнасьць грамадзянаў БНР не ўдалося, і акцыя не прынесла вынікаў.

У **1999 г.** у сакавіку дэмакратычная грамадзкасьць была занятая альтэрнатыўнымі прэзыдэнцкімі выбарамі. Самай яркай акцыяй на Дзень Волі стаў учынак легендарнага Мірона ў Менску. У ноч на 25 сакавіка ён вывесіў бел-чырвона-белы сьцяг на даху шматпавярховага дому на рагу праспэкту Скарыны й вуліцы Варвашэні. Нацыянальны штандар правісеў цэлы дзень.

У **2000 г.** здарыўся сумнавядомы гвалт у Менску. У апошні момант гарвыканкам адмяніў дазвол на акцыю. Раніцай Менск нагадваў лацінаамэрыканскі го-




**Жыхары намётавага гарадка цьвёрда настроеныя сустрэць Дзень Волі на Кастрычніцкай плошчы. Аляксандар Мілінкевіч абвесьціў, што сьвяткаваньне 25 сакавіка пачнецца а 12-й гадзіне.**

рад. На вуліцах дзяжурылі бронетранспартэры з кулямётамі, а праспэкт Скарыны быў аточаны спэцназам. Апоўдні на плошчы Якуба Коласа — меркаваным месцы зборы дэманстрантаў — пачалася масавая зачыстка. Усяго былі затрыманыя 420 чалавек, у тым ліку айчынныя і замежныя карэспандэнты. У журналістаў паразьбівалі фотаапараты і дыктафоны. Усіх затрыманых зьвезьлі ў вайсковую частку на Грушаўскай і ангар на Маякоўскага. І толькі пад вечар пачалі адпускаць. Акцыі, прысьвечаныя 25 Сакавіка, прайшлі ў двух дзясятках гарадоў Беларусі.

У **2001** г. 5 тыс. чалавек сабраліся на Юбілейнай плошчы ў Менску. Пасьля АМАПаўскіх спробаў пацыфікацыі людзі праз вуліцы Максіма Танка і Дразда прабраліся на праспэкт Машэрава, да стэлы «Горад-герой». Там, на ўзгорку, і адбыўся імправізаваны мітынг і канцэрт.

У **2002 г.** Дзень Волі адсьвяткавалі ў сквэры імя Янкі Купалы. Супрацьстаяньне з АМАПам доўжылася некалькі гадзін. Тых, хто выбіраўся з парку, міліцыя і людзі ў цывільным арыштоўвалі. У парку выступалі «N.R.M.», «Уліс», Зьміцер Сідаровіч, самадзейныя музыкі.

У **2003 г.** прайшло ажно два Дні Волі — два крылы БНФ тады разьядналася. У нядзелю 23 сакавіка акцыю ля Галоўпаштамту зладзіў КХП—БНФ. Міліцыя перашкодзіла невялічкай калёне рушыць па праспэкце. «Адбыліся некалькі сутычак, у выніку якіх дасталося і амапаўцам, адзін зь якіх нават апынуўся на асфальце і атрымаў колькі разоў па нырках», — пісала тады «НН».

25 сакавіка сваю акцыю ладзіла і Партыя БНФ. Мерапрыемства, у якім удзельнічалі 400 чалавек, не ўдалося. Мітынг з ускладаньнем кветак да помніка Якубу Коласу доўжыўся некалькі хвілінаў — удзельнікаў акцыі разагнаў АМАП. Дзясяткі затрыманых.

У **2004 г.** вырашылі адмовіцца ад ранейшага фармату і сьвяткаваньняў і задаволіцца гуляньнямі ля гарадзкой ратушы. Мауляў, на гэта не патрабуецца санкцыя гарвыканкаму. Аказалася, патрабуецца. А 17-й ля Ратушы сабраліся 300 чалавек, якіх потым «зачысьціў» АМАП.

Валянцін Баранаў, Вячаслаў Сіўчык, Дзяніс Буйніцкі зладзілі на Кастрычніцкай плошчы сваю акцыю. Яны прыкавалі сябе ланцугамі да ліхтароў, пратэстуючы супраць парушэньня правоў чалавека ў Беларусі. Дэманстрантаў, натуральна, арыштавалі, а на наступны дзень суд Цэнтральнага раёну сталіцы выпісаў ім вялікія штрафы.

Не ўдалося і правесьці вечарыну ў Доме культуры вэтэранаў. Адміністрацыя ўстановы разарвала кантракт, спаслаўшыся на тое, што ня мае ліцэнзіі на правядзеньне канцэртаў прафэсійных творчых калектываў.

**Летась** замест Дня Волі грамадзянам была прапанаваная «рэвалюцыя Андрэя Клімава». Экс-дэпутат і бізнэсовец заявіў, што на Кастрычніцкай плошчы зьбярэцца 500 тыс. чалавек. На ходніках ля ўнівэрсаму "Цэнтральны" сабраліся дзьве тысячы чалавек. Калі амапаўцы пачалі выціскаць людзей на вуліцу Леніна, дэманстранты закідалі міліцыю сьнежкамі. АМАП сьмяяўся, але працягваў ціснуць далей, да Палацу спорту, паціху арыштоўваючы людзей. Дзясяткі ўдзельнікаў атрымалі суткі і штрафы, а А.Клімаў, як арганізатар акцыі, — паўтара году «хіміі».

Увесь цэнтар Менску пранізаны ўспамінамі аб Дні Волі: тут мы ішлі, тут стаялі супраць АМОНу, тут слухалі Вольскага, тут уздымалі сьцяг. Сёлета дадаецца шчэ адно месца: Кастрычніцкі пляц. Жыхары намётавага гарадка цьвёрда настроеныя сустрэць Дзень Волі там. І тым самым запачаткаваць новую традыцыю сьвяткаваньня.

# Мамантовас замест Мэладзэ

У літоўскай папулярнай музыцы склалася ўнікальная сытуацыя.

Сёлета ўся Літва сьвяткуе 15-годзьдзе аднаўленьня Незалежнасьці. Дырэктар буйнога літоўскага лэйблу «Зона» Давід Блюўштэйн паралельна адзначае «карпаратыўнае» сьвята — 15 год таму зьявілася ягоная «Зона», што адыграла ролю ў фармаваньні літоўскага шоў-бізнэсу. Дзейнасьць лэйбл пачаў з выданьня ў краінах Балтыі рэлізаў замежных зорак — *Joy Division, Pixies, Cocteau Twins* ды іншых, а потым заняўся працай зь мясцовымі гуртамі. Справы пайшлі добра, і лэйбл падзяліўся на дзьве фірмы — адна займаецца канцэртнымі справамі і выдавецтвам, другая — працуе з гуказапісам. Сакрэтам посьпеху дзеліцца адзін са стваральнікаў «Зоны», дырэктар *Zona Records* у Рызе Давід Блюўштэйн.



**Папулярны літоўскі поп-сьпявак Андрыус Мамантовас здольны сыграць такога Гамлета, які задаволіў рэжысэра Эймунтаса Някрошуса.**

«Мы верым, што балтыйская музыка мае што прапанаваць сусьветнаму музычнаму рынку», — кажа сп.Блюўштэйн. У «Зоне» вераць, што кожны чалавек — таленавіты па-свойму, а ягоны посьпех — пытаньне чыста якаснай вытворчасьці прадукту. Першымі кліентамі лэйблу сталі ня толькі легендарныя *Antis* і *Bix*, але і расейскія «Ва-Банк» і *Avia*. «Зона» ніколі не займалася «дзеравенскай» папсой», — кажа прадусэр.

З поп-музыкай у Літве — унікальная сытуацыя. Песьні Алсу, Кіркорава, Мэладзэ стала прысутнічаюць у літоўскай музычнай прасторы, і ня толькі ў іх выкананьні. Як толькі зьяўляецца расейскі гіт, мясцовыя музыкі перапяваюць яго па-літоўску. Давід кажа пра разьвітасьць літоўскага шоў-бізу: «Поп-канвэер працуе шпарка і эфэктыўна, нашы вядомыя папсавікі прадаюць да 30 000 дыскаў». Літоўскі альбом становіцца «залатым», калі разыходзіцца накладам у 10 000 (у Беларусі — на парадак меней). Нядаўна на лэйбле былі выдадзены альбомы гурту *IR*, які на «Літоўскай альтэрнатыўнай прэміі» (аналяг нашай «Рок-каранацыі») перамог у намінацыі «Лепшы рок-гурт». Але нацыянальную рок-музыку ў тэле- і радыёэтэры ў Літве не пачуеш. «Літоўская папса круціцца паўсюль», — наракае Блюўштэйн. Але літоўцы ня схільныя да стварэньня куміраў, таму фэн-клюбаў літоўскіх выканаўцаў вобмаль, а з усёй плоймы эстраднікаў, як правіла, вылучаецца толькі адзін — Андрыюс Мамантовас — актор, паэт і поп-зорка.

**Ковенскі юнак Ромас Каланта, які ў 1972 г. спаліў сябе, пратэстуючы супраць савецкай акупацыі Літвы.**



Сп.Блювштэйн кажа, што гэта адзіны літоўскі выканаўца, здольны сабраць на свой канцэрт некалькі тысячаў гледачоў. Сам Андрыюс кажа, што гэта праблема маленькай тэрыторыі: «Кожны ваюе за слухача, але іх патэнцыйная колькасьць — невялікая». Таму складаецца сытуацыя, падобная да беларускай — нават самыя папулярныя музыкі маюць другую працу, каб забясьпечыць сябе ў фінансавым пляне. Мамантовас грае ў кіно і тэатры (самая вядомая яго роля ў «Гамлеце» ў пастаноўцы Някрошуса), а таксама перакладае на літоўскую тыя самыя ра

сейскія поп-гіты. І Мамантовас, і Блювштэйн адчуваюць, што трэба рухацца далей у пошуках новых слухачоў: «Але на Захад, бо на Ўсходзе, у тым ліку і ў Беларусі, можна займець болей клопату, чым грошай, бо там дыскі вельмі танныя», — кажа Давід. Андрыюс бачыць выйсьце ў зьмене падыходу: «Мы не павінны капіяваць тое, што папулярна на Захадзе, не яны нас павінны зьдзіўляць, а мы — іх».



WWW.ANTIS.LT

**Кожны выступ гурту *Antis* — фантасмагарычнае шоў.**

Першыя рок-гурты зьявіліся ў Літве ў 1965—1966 гг. У Вільні — «Vienuoliai» і «Antanliai», у Коўне — «Aitvarai» і «Kertukai». Яны існавалі ў глыбокім падпольлі. Сытуацыя зьмянілася ў 1972 г., калі перад Музычным тэатрам у Коўне у знак пратэсту супраць савецкай акупацыі ў Літве зьдзейсьніў самаспаленьне 19-гадовы рок-музыка Ромас Каланта. Улады выставілі Каланту як гіпі-псыхапата, што сядзеў на наркотыках. Але ўчынак Ромаса абудзіў людзей: у Коўне прайшлі антысавецкія акцыі, на вуліцах зьявіліся нацыянальныя сьцягі і гучалі адраджэнскія песьні. «Тады КГБ крута зацягнула гайкі: на вуліцах вінцілі за доўгія валасы і тутсама іх састрыгалі ў варанках, а выступ і нават рэпэтыцыі прагрэсіўных камандаў былі немагчымыя», — узгадвае Давід Блюўштэйн, які на той час падпрацоўваў ды-джэем на школьнай дыскатэцы.

Менавіта ў сьценах таго Музычнага тэатру ў Коўне пачалася гісторыя аднаго зь літоўскіх гуртоў, папулярнасьць якога сяганула далёка за межы Літоўскай ССР. Гурт «Арго» выконваў складаную музыку, экспэрымэнтаваў з гукам — іх знаходкі прыйшліся дарэчы да тэатральных і кінасаўндтрэкаў. Яго кіраўнік — Гедрус Куправічус — пры канцы 1980-х стаў намесьнікам міністра культуры Літвы.

На базе самадзейнага тэатру Віленскага ўнівэрсытэту ў 1981 г. паўстала яшчэ адна легенда літоўскай музычнай сцэны — гурт «Ад Лібітум». Райманд Паўлс прызнаўся, што іх музыка паўплывала на ягоную творчасьць. «Ад Лібітум» можна параўнаць з нашым «Сузор'ем» у часы іх арт-рок- экспэрымэнтаў. Паступова музыкі перайшлі да электроннай музыкі з выкарыстаньнем «жывога» саксафону.

Але галоўныя героі літоўскага року — група *Antis* (па-беларуску «качкі») — адкрыцьцё фэсту «Літуаніка-87», які зьбіраў лепшыя рок-сілы СССР. Прэса з захапленьнем апісвала іх выступы: іх фантасмагарычныя шоў з выкарыстаньнем рознакаляровых прасьцін, клетак з папугаямі. Стыль *Antis* вызначаны як «інтэлектуальны нэа-панк». Цяпер літоўскія музыкі могуць выбіраць: у Літве працуе ля 10 лэйблаў (для параўнаньня — у Беларусі іх колькасьць ніколі не перывышала пяці), усе яны займаюць сваю нішу і маюць добры прыбытак. 15 лютага 2006 г. у Вільні прайшла цырымонія «ALT-2005» — аналяг нашай «Рок-каранацыі», — якая адкрыла імёны новых рок-герояў: альбомам году прызнаны *Voyage* (*Pieno Lazeriai*), а лепшым рок-гуртом — *IR*.

**Сяргей Будкін**

**Давід Блюўштэйн** (нар. 1959, Вільня). Прадусэр літоўскіх фэстываляў «Літуаніка» (1985), «Блюз-форум» (1987), *Lithuania Rock March* (1986—1988). Арганізатар фэстываляў «Вільня-Рок» (1989, 2003), *Shok Parade* (1998) ды інш.

Быў арганізатарам балтыйскіх тураў савецкіх, літоўскіх і замежных рок-зорак (зладзіў туры гуртоў «Кино», «Звуки Му», Горана Брэгавіча, *Sonic Youth*). Выкладаў курсы «Гісторыя поп-музыкі» і «Музычны мэнэджмэнт» у Віленскай кансэрваторыі (1996—2004). Аўтар артыкулаў з гісторыі сусьветнай і літоўскай поп- і рок-музыкі.

З 2005 г. дырэктар *Zona Records* у Рызе, Латвія.



JULIJA GOYD

**Давід Блюўштэйн падчас уручэньня «Літоўскай альтэрнатыўнай прэміі».**

# Канстытуцыйны патрыятызм?

Мусульманізацыя Эўропы і русіфікацыя Беларусі: некаторыя паралелі. Піша **Пётра Садоўскі.**

Пачынаючы з канца 1970-х у Эўропе сталі гаварыць пра *канстытуцыйны патрыятызм* (асабліва ў Нямеччыне, абцяжаранай злачынствамі нацыянал-сацыялізму). У мяне асабіста гэтыя асацыяцыі зьвязаны з імёнамі Карла Шміта, Дольфа Штэрнбэргера і Юргена Хабэрмаса. Гэты тэрмін тады добра пасаваў да дыскурсаў пра *постнацыянальныя дзяржавы і канец гісторыі*. Гэта былі шчасьлівыя гады: 1968 год даўно мінуў, бум росту яшчэ працягваўся. Пазьней распад СССР дадаў новай эўфарыі.

## Bildungsbürger

У наш час, калі пачалі наноў спрачацца пра эўрапейскія каштоўнасьці і гаварыць пра небясьпеку мусульманізацыі Эўропы, тэрмін *канстытуцыйны патрыятызм* зноў замільгаў на старонках нямецкіх пэрыёдыкаў і спэцыяльных дасьледаваньняў побач з такімі наватворамі і гальванізаванымі спалучэньнямі, як *разбурэньне карэннага этнасу імігрантамі* (Unterwanderung), *дзяржаўныя праграмы інтэграцыі іншаэтнічнага насельніцтва* (positive discrimination), *асноўная культура* (Leitkultur), *дзяржаватворчы народ* (Staatsvolk), *культурна інтэграваны грамадзянін* (Bildungsbürger), *паралельнае грамадзства* (Parallellgesellschaft).

І для Беларусі ў гэтых спрэчках можна знайсьці нешта карыснае, хаця стан рэчаў у нас зусім іншы. Ці можам мы аптымістычна чакаць адзінства нацыі, спадзеючыся ўсё ж на паступовую інтэграцыю — у тым ліку і культурную — не-аўтахтонаў ва ўмовах спэцыфікі нашай «рэгіянальнай глябалізацыі»? Беларусы-аўтахтоны гістарычна ня маюць права пагадзіцца на трасянку ды крэольства: беларуская нацыянальная спадчына — цэлы кантынэнт. Дык дзе ж выйсьце?

## Межы адкрытасьці

Вернемся да Эўропы. Я буду гаварыць галоўным чынам пра Нямеччыну, бо ведаю тут сытуацыю лепш, чым у іншых краінах ЭЗ. У дачыненьні да імігрантаў яна была ў пасьляваеныя гады, асабліва на пачатку 1960-х, такая ж лібэральная, як у Францыі, Італіі, Ангельшчыны. Два выбітныя прыклады таму: Нікаля Сарказі (сёньняшні міністар унутраных справаў Францыі, францускі грамадзянін у першай генэрацыі, бацька — вугорац, маці — грэцкая габрэйка) і Уда ды Фабіё (сёньня чалец канстытуцыйнага суду ФРН, нямецкі грамадзянін у першай генэрацыі, бацька — італьянскі сьлесар). Пра такую кар’еру імігранту, грамадзяніну ў першым калене, можна толькі сьніць.

Аднак на сёньняшні дзень Эўропа зайшла далёка ў сваёй хрысьціянскай адкрытасьці. Паводле нямецкай інфармацыйнай агенцыі *Globus Infografik*, сёньня ў старых фэдэральных землях ФРН, дзе на працягу апошніх 45 гадоў іміграцыя была найбольш дынамічная, 40% школьнікаў — дзеці імігрантаў (у 2020 годзе чакаецца больш за 50%), у 50 школах Бэрліна больш паловы дзяцей — ня-немцы. У 3-х школах Бэрліна — у раёнах Бэрлін-Вэдынг (пралетарскі Вэдынг, пра які некалі сьпяваў антыфашыст Эрнст Буш), Бэрлін-Кройцбэрг, Бэрлін-Нойкёльн — няма ніводнага нямецкага дзіцяці. Першая небясьпечная ластаўка прыляцела два гады таму: у Эбэргард-Кляйн-Обэршуле ў Бэрлін-Кройцбэргу атрымалі абітуру тры апошнія нямецкія дзіцяці.

## Немкі ў хіджабах

Малыя нямецкія гарады набываюць аблічча турэцкіх мястэчкаў зь вежамі мінарэтаў і ўсходнімі базарамі. Маладыя немкі пераходзяць на другі бок вуліцы, саступаючы дарогу купкам агрэсіўных турэцкіх мачо. На школьных перапынках турэцкая мова заглушае нямецкую. З прыблізна 8 млн імігрантаў мусульмане складаюць у Нямеччыне каля 3,5 мільёну. Дарэчы, у самой Турэччыне мусульманства менш «фундамэнтальнае», чым у Нямеччыне. Напрыклад, за зьяўленьне на лекцыях у хіджабе, адмову наведваць урокі плаваньня ў басэйне турэцкіх студэнтак выключаюць з унівэрсытэтаў (Турэччына дэманструе ЭЗ сваю сьвецкасьць). У Нямеччыне ж турэцкія школьніцы амаль усе ходзяць у хустках. У вялікіх гарадах, лічаць нямецкія аналітыкі, старэйшае пакаленьне немцаў будзе яшчэ доўгі час большасьцю. Аднак пры сёньняшняй дынаміцы гадоў праз 25 больш чым палова маладых грамадзянаў ФРН, асабліва ў малых гарадах, будуць ужо ня-немцы. Кар’ера, добрае жытло і падарожжы замест дзяцей — даволі распаўсюджаны лёзунг. Ды яшчэ мода немцаў на аднаполыя шлюбы. Па стане на 2004 г. у Нямеччыне зафіксавана 160 000 нетрадыцыйных сямейных параў (54% мужчынскіх, 46% жаночых). А мусульманкі нараджаюць у сярэднім па 5—7 дзяцей. Сацыяльна арыентаваная дзяржава дапамагае.

## Пэсымістычная антрапалёгія

Сытуацыя аддалена нагадвае беларускую, толькі зь іншым гістарычным мінулым. Мусульманскі фундамэнталізм сёньня чымсьці нагадвае расейскі. І мусульманства, і «расейская» ідэя генэтычна грунтуюцца на партыкулярных маральных прынцыпах, што цягнуцца яшчэ з часу племяннога падзелу зь ягоным адрозьненьнем маралі ўласнай групы і чужой. Фармальна не адмаўляючыся ад магчымасьці ўласнага «ўзбагачэньня» ад кантактных культураў, і



**Пётра Садоўскі** — пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994), дэпутат ВС 12-га скліканьня, германіст.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

мусульманства, і «расейскасьць» нясуць на сабе цень пэсымістычнай антрапалёгіі і, украніўшыся ў сваю культурна-гістарычную ідэнтычнасьць, непазьбежна прасоўваюць экспансію ўласнай веры і прынцыпаў як Боскую сакральна-гістарычную місію, заплянаваную не на нейкі гістарычны момант, а на стагодзьдзі. Тут «растварэньне» ў чужым ці параза выключаюцца генэтычна. Толькі перамога.

## Мульты-культы

Пра што ж спрачаюцца немцы? Тыя, што не парвалі сувязь з сацыяльнымі і духоўна-гістарычнымі каранямі хрысьціянства і вызнаюць маральны ўнівэрсалізм і аптымістычную антрапалёгію чалавечай натуры, спадзяюцца і агітуюць у дыскурсе эўрапейскага культурнага лібэралізму за «пазытыўную дыскрымінацыю» — дзяржаўнае кіраваньне інтэграцыйнымі працэсамі, падтрымку імігрантаў, выхаваньне новых культурна інтэграваных патрыётаў з грамадзянскай сьвядомасьцю і г.д. Лібэралам гэта падабаецца, бо сьведчыць пра вялікую павагу да правоў асобы, калі, напрыклад, веравызнаньне ставіцца вышэй за Канстытуцыю.

Найменш рамантычная частка нямецкіх інтэлектуалаў схіляецца да крытыкі вынікаў палітыкі культурнай адкрытасьці, якая прывяла да так званага мультыкультуралізму (у адмоўнай канатацыі — Multikulti). Кансэрватары кажуць: Multikulti — гэта культурны Бабілён. І вядома, чым ён закончыўся, як Садом і Гамора. Праціўнікі мультыкультуралізму тлумачаць ход рэчаў так: генэтычна Эўропа была заўсёды больш адкрытай, чым Усход ці Поўдзень. Мусульманскі, будыйскі, індуісцкі, юдэйскі сьвет заўсёды быў больш гермэтычны, чым хрысьціянскі. Эўропа зь ейнай адкрытасьцю, цікаўнасьцю да іншых культураў, скепсісам, самакрытыкай пачалася за некалькі стагодзьдзяў да Нараджэньня Хрыстовага яшчэ з плятонаўскай Акадэміі ды стоікаў, якія імкнуліся будаваць жыцьцё ў гармоніі з прыродай ды ўладай «Ўсясьветнага Розуму». Хрысьціянская Эўропа, пераняўшы ад стоікаў ідэю касмапалітызму (і грамадзяне, і барбары, і рабы — усе роўныя!), стала шматколернай, дзе, эвангелічна кажучы, не засталося ні эліна, ні юдэя. Сучасная Эўропа пачалася, відавочна, зь перамогі грэкаў над пэрсамі ў 480 г. да Н.Х. Інакш сёньня над нашымі храмамі ўзвышаліся б не крыжы, а паўмесяцы.

## Інтэграцыя ў Беларусь ці паглынаньне беларусаў

Гістарычныя апалягеты «расейскага праекту» і сёньняшнія расейскія патрыёты, як і носьбіты сучаснага мусульманства, паводзяць сябе інакш. Тут гаворка не пра растварэньне і ўзаемнае ўзбагачэньне, а пра паглынаньне праз стварэньне паралельных супольнасьцяў. Значная частка жыхароў нашай краіны жыве ў паралельным «расейскім грамадзтве»: інфармацыйная прастора, царква, культура, асацыяцыі, звычкі, бізнэс. Грамадзтва падзяляецца. Падзел паглыбляецца.

Нямеччына падыходзіць да падобнай мяжы. Вось што напісала нядаўна дэпутатка Бундэстагу турэцкага паходжаньня Ляле Акгюн (нар. у 1953 г. у Стамбуле, грамадзянка ФРН з 1981 г.): «Мы павінны пераадолець анахраністычны стэрэатып, што… грамадзтва трымаецца на традыцыі, сфармаванай стагодзьдзямі праз супольную рэлігію і адзіную нацыянальную мову. Трэба прызнаць кансэрватыўным і састарэлым уяўленьне, што імігранты-нехрысьціяне павінны прыстасоўвацца да хрысьціянскіх каранёў. У такім аднародным грамадзтве мусульманскім імігрантам няма месца паводле іхнай прыроды. Карціна грамадзтва, дзе мусульманская меншасьць павінна прыладжвацца пад нямецкую большасьць, састарэла… Нам патрэбна этнічна разнароднае і рэлігійна плюралістычнае грамадзтва, у аснове калектыўнай ідэнтыфікацыі якога не павінна быць так званай народна-нацыянальнай асновы. У цэнтры такой канструкцыі павінен стаяць канстытуцыйны патрыятызм…» (*Die Zeit*. 16.02.2006).

## Формула патрыятызму

Нямеччына трошкі запазьнілася ў параўнаньні з суседзямі, але ўсё ж адносна своечасова сфармавалася як нацыянальная дзяржава, дзе з 1871 да 1961 г. доля іншаэтнічнага насельніцтва вагалася ўсяго ад 0,5 да 1,2%. Аднак пасьля 1945 г. плян Маршала, эканамічны бум, масавая іміграцыя пачатку 1960-х, лібэралізм росквіту, самазьніштажальнае пераадоленьне віны за нацыянал-сацыялізм размылі нацыю колькасна і якасна. Яна стала закладніцай уласнай дэмакратыі і «постнацыянальнага» Эўразьвязу. Дэголеўскі лёзунг «Эўропы радзімаў» пацішу згас. Па стане на 2003 г. у Люксэмбургу было, напрыклад, больш за 35% жыхароў, што не лічылі сябе за «люцэбургер фолек». Немцы шукаюць фармулёўку патрыятызму: нямецкі, хрысьціянска-эўрапейскі ці нейкі непрадказальны канстытуцыйны патрыятызм, дзе нехта абавязкова будзе, а некага можа і ня быць?

Ці вытрывае пазытыўная талерантная антрапалёгія супраць больш пасіянарнай партыкулярнай дактрыны з элемэнтамі мэсіянства? Назіраючы за немцамі, будзем думаць пра сябе.

Марыя Вайцяшонак.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# «Ніводзін наш уздых ня згубіцца намарна»

Наталка Бабіна піша пра **Марыю Вайцяшонак.**

Хоць бы не забыць за гэтай мітусьнёй, што ёсьць дабро і зло. Што найменшае адступленьне дабра выклікае магутнае наступленьне зла.

Ёсьць людзі, якія пэрсаніфікуюць зло (і мы ўсе іх ведаем). З дабром складаней. Ня знойдзецца такога чалавека, які быў бы ўвасобленым дабром. Увасобленае дабро не сярод людзей.

Але кожнаму даводзілася бачыць людзей, якіх зло не плямуе.

Падзялюся вельмі прыемным для мяне ўспамінам. Некалькі гадоў таму «НН» надрукавала маё апавяданьне «Крыві не павінна быць відна». Пасьля гэтага пазваніў тата і сказаў, што плакаў, калі чытаў. Потым сябар з Кіева даў знаць праз электронную пошту, што праехаў у мэтро свой прыпынак, чытаючы аповед. А потым пазваніла Марыя Вайцяшонак.

Так мы і пазнаёміліся.

Вольга Бабкова гаворыць пра творчасьць Вайцяшонак заўсёды з хваляваньнем, і абзацы ўнікальнага Вольжынага голасу падкрэсьліваюць глыбіню таго, што яна фармулюе. Аднойчы Марыя сказала: «Калі ў пісьменьніка ёсьць хаця б адзін чытач-фанат, то яго ўжо па праву можна называць пісьменьнікам». Калі ў пісьменьніка ёсьць хаця б адзін такі геніяльны чытач-фанат, як Воля, то яго ўжо па праву можа называць геніем.

Але кніжкі Марыі выходзяць нячаста, а ў крамах іх можна знайсьці яшчэ радзей.

А для мяне што важней: кнігі Марыі ці тое, як яна размаўляе з маімі дзецьмі? Ці тое, які дух авявае мяне, калі я заходжу ў яе поўны сэнсу дом ды поўны нявіннасьці сад? Калі бачу кола, якое коціцца і коціцца яе сьветам?

Яна бачыць сьвет незвычайным, і гэта бачна па яе кнігах. А мо сьвет і на самай справе такі?

«Мы ўсе ідзём да старасьці, а Марыя — да маладосьці», — сказаў пра яе Леанід Галубовіч, яшчэ адзін яе геніяльны чытач.

З часам мяняюцца твары, час усё ставіць па месцах.

Жыцьцё справядлівае, як зноў-такі гаворыць Воля Бабкова.

Дзякуючы за кніжку, Даніла Жукоўскі прыслаў Марыі паштоўку, напісаную ў стылі шляхецкага XVIII стагодзьдзя.

З маёй шасьцігадовай Томцяй у яе гешэфты. Паўлінцы яна прыслала па пошце гетры — хадзіць на рэвалюцыю, ды рукавічкі — вяртацца зь яе. Тараска з задавальненьнем гаворыць ёй у трубку «этакта» — што значыць «трактар». Марыя — хросная мама майго сына, і, здаецца, яна разумее яго радасьць.

Яна многае разумее, мама майго сына.

Марыя піша пра сьвет, які адыходзіць, і піша так, як ня піша ніхто. Няма сумневу, гэта будзе належна ацэнена, і аб гэтым будзе сказана. Але, можа, занадта позна.

Хачу сказаць гэта зараз.

Марыя кажа: «Ніводзін наш уздых ня згубіцца намарна». Яна ня ходзіць на мітынгі (на што наракае Вольга Іпатава), часта плача, ня ўмее гаварыць банальнасьці. І піша.

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК

апавяданьне

# Саскочыць з ровара і спыніцца

Нас пазнаёмілі ў музэі, амаль у дзьвярах, калі я вярталася з выставы габэленаў. Там павінна была быць і мая праца, але... Пэўна, спадзеючыся на тое, што я амаль не тусуюся, запрасілі наведацца дзеля адчэпнага і забыліся. Прастаяўшы на выставе ў «запечку», я была ў такім стане, нібы ты запрошаны да ўрачыстага стала, а прыбора табе не паставілі.

Вядома, не да знаёмства, хай сабе гэта будзе і ангельская каралева.

— Ірына Жарнасек, пісьменьніца... — І, пабыўшы, нехта дабавіў: — У яе сын сьвятар...

Спыняюся, узрушанасьць на мяжы раптоўнага аплучэньня. Ёсьць месцы на зямлі, куткі, рэчы, дастаткова ўбачыць што-небудзь зблізку ці здалёк, да прыкладу, дом над вадаспадам у Пэнсыльваніі на фатаздымку, і ты ВЕДАЕШ, што гэта тваё мае быць, тваё асабістае жытло. Дастаткова пачуць, што ў Італіі працуе закон: пакінеш свайго сабаку ў машыне, не ўключыўшы яму вэнтылятар, атрымаеш штраф пяцьсот даляраў, — адчуваньне, што гэта твае землякі, і нават болей.

І ёсьць сустрэчы.

І тады на выставе — амаль момант яснабачаньня. Я разьміналася ў дзьвярах са сваім лёсам: у мяне павінен быў быць сын сьвятар, менавіта сьвятар, хаця ніколі дагэтуль пра тое ня думалася.

Тады і назаўсёды я пакідала выставу... цяжарнай, цяжарнай адкрыцьцём, суцешаная, быццам пазбавілася звыклага пачуцьця няспэўненага ў жыцьці.

Цяпер, ужо седзячы ў іншай залі, я разглядала пісьменьніцу, пэўна, пільней за іншых. Ішла першая прэзэнтацыя ейнага раману пра трагічны лёс росіцкіх сьвятароў-марыянаў: у вайну яны мелі шанец ўратавацца ад агню, але ахвярна прынялі сьмерць разам з тысячай сваіх парафіянаў.

Яна стаяла перад заляй, хвіліну маўчала, пераводзячы дух, бы вось нарэшце тут, у залі, толькі і спынілася. Нарэшцетакі во дасталася да сталіцы з Наваполацку. Мне выдавалася, ішла пехатой, напрасткі па бязьлюдных дарогах, мясьцінах, не просячыся ўнаначкі, сьпяшалася — несла сваю навіну. Засіверaны твар, засіверaныя валасы, на ёй несучасныя строі, сьпехам ускінутыя на плечы, быццам і пераапраналася недзе перад Менскам, цнатліва захінуўшыся. Гаварыла ціха, просьценька, нязвыкла да выступаў, пра тое, як гадамі зьбірала матэрыял, выяжджала, хадзіла па вёсках, сустракалася са сьведкамі, якім удалося ўратавацца ад вялікага вогнішча.

Гарэлі сьвечкі каля партрэтаў росіцкіх пакутнікаў. Амаль шэптам чытаў маладзенькі дыякан урыўкі з раману, нязмушана, без муштроўкі рэпэтыцый, вядома, бы дзеля сябе самога чыталася ўслых, спрабуючы лепей учытацца і зразумець. Гукі павольнай музыкі, ледзь чутна, то бліжэй, то далей, бы чыесьці крокі, крокі таго, хто здымаў агаркі са сьвечак, падаваў на стол шклянку вады і сядаў на аслабанёнае крэсла каля мяне — не дачакаўшыся звыклага «відовішча», мая сяброўка пакінула залю. Выйшаў і знаёмы літаратурны крытык.

Вядома, гэта была літаратура не са знакам ПОСТ, што звычайна азначае «пасьля Бога і пасьля чалавека».

Асабісты, жывы голас хутчэй гучыць традыцыйна ў цяперашнім сьвеце.

Вядома, эфэкту не было, хаця пісьменьніца момантам намагалася натурыцца на гэта. І я сама, цураючыся рэлігійнага патасу, заставалася сядзець у залі дзеля павагі да тэмы вечара, ня болей.

Але калі потым сталі гаварыць маладыя сьвятары, дыяканы Ордэну марыянаў... Адзін, другі, трэці... Яны выходзілі, зьяўляючыся, як зь нябыту — адразу і не заўважыш, што яны побач з табой, бо ў цывільным, пазнаеш, убачыўшы белую каляратку пад чорным каўнярoм. Іх было шмат, як на невядомым дагэтуль нікому гадавым сьвяце. Пасьля сваёй прамовы кожны падыходзіў да пісьменьніцы, віншаваў. Яна шырока заводзіла руку, заламаўшы ў локці, моцна абдымала за шыю, быццам толькі тут нарэшце яны, ідучы кожны сваім шляхам, і сустрэліся, доўга ня бачыўшыся. Доўга, празорліва глядзела ў твар, намагаючыся ўбачыць у кожным ахвярнасьць тых, пра каго апавядала ў рамане. Заводзіла руку, у гэтым руху было столькі звыклай жаночай адкрытасьці і той жа таямніцы, нібы віталася з кожным не прылюдна, а на парозе свайго дому, на парозе сваёй вядомасьці. Іх аб'ядноўвала нешта пераможнае над усім: гадамі пошукі сьведкаў, пошукі грошай на выданьне твору, пошукі аднадумцаў, ахвярнасьць дзеля справы сямейным спакоем і дабрабытам.

Цяпер яна ўжо абдымала ўсю залю, валодала мною. Сыпаліся на падлогу нашыя завушніцы і бранзалеты, бляклі фарбы на вуснах, румяны, бляклі дубальтовыя строі, абы хоць на момант адчуеш побач зь ёй сваю належнасьць да жаночай прыроды, да прыроды існасьці.

Потым гэтай жа рукой яна, як міністрант або званар, будзе ціха разгойдваць звон у іншых касьцёлах, аб чым прасіў перад сьмерцю адзін з росіцкіх ксяндзоў: «...пазвані па нас, звон, пазвані, раскажы сьвету, як мы... каналі ў агні».

Столь казённага памяшканьня расхінулася, вялікая жырандоля — копішчам зорак...

— Ну і як табе гэтае мерапрыемства? — запыталася на выхадзе адна знаёмая.

Мерапрыемства?! Я маўчала... я ішла... з набажэнства.

Увесь час жыву сьпяшаючыся, таропка, і ў той жа час незадаволенасьць, што ўпускаю раніцу, дзень, вечар, упускаю жыцьцё: згубы, здрады, пачуцьці нязбыўнага, і той жа мой нядаўні «запечак» на выставе габэленаў. Цяпер мяне агортвала ціша спакою. Сьціх вецер, дрэвы запаволілі свой гонкі рост, час запыніўся — усё навакольле падбірала хаду пад мае няроўныя, блытаныя крокі. Усё, з чым прыйшла, мяне нарэшце быццам выслухалі тутака, у зале — з Богам лёгка, ня трэба намагацца, даказваць, каб цябе зразумелі.

І няма быццам большага за шчымлівае жаданьне, як, ускінуўшы на плечы нешта правінцыйна-цнатлівае, саскочыць з ровару і спыніцца ў Дубраве пад Менскам, напроці магілкі забітага немцамі сьвятара (як тое дзяўчо перад нашай машынай — мы прыяжджалі туды наведаць разбураны часам касьцёл), перахрысьціцца, прывітаўшыся, як яна, і далей, па вёсцы. Магілка надзіва прыбрана, дагледжана, бы сьвежая — заўсёды на памяці вяскоўцаў.

А што сын-сьвятар? Магчыма, ім стане мой хросьнік... Вельмі ўжо дасканалае дзіця трымала я перад хрысьцільняй у Чырвоным касьцёле, бы пераняла яго пацешыцца, забавіць з рук самой Дзевы Марыі, каб даць Ёй крыху аддухі.

# Пара!

2006 год стаіць пад знакам Івана Франка. Спаўняецца 150 гадоў з дня нараджэньня Каменяра. Гэтае імя шмат што значыць для Ўкраіны. А Ўкраіна шмат значыць для Беларусі. На яе землях набіраліся духу Багушэвіч, Караткевіч... Дый ці мала яшчэ хто! Ёсьць Украіна — будзе й Беларусь.

На жаль, беларускі чытач з паэзіяй Івана Франка амаль што незнаёмы. Вершы Тараса Шаўчэнкі выходзілі ў нас чатыры разы, Лэсі Ўкраінкі ды Максыма Рыльскага — па два разы, па разу — Паўлы Тычыны, Уладзімера Сасюры, іншых клясыкаў украінскае літаратуры. А Франка — нават падборкі можна палічыць па пальцах! Юбілей, спадзяюся, стане нагодаю да выпраўленьня гэтае недарэчнасьці. Колькі гадоў таму я пачаў укладаць зборнік паэта, зьбіраць перакладзенае, перакладаць новае. Сёньня ўпершыню прапаную шырокай грамадзкасьці некаторыя свае пераклады. Хацелася б паказаць паэзію Каменяра ў розных праявах, асабліва тыя абсягі, якія былі мала кранутыя, ледзь не забароненыя.

Каб зразумець значнасьць Івана Франка — мала прачытаць адзін ці два вершы. Кожны зборнік, кожная нізка, кожны тэкст адкрываюць нам паэта з новага боку. Франко ўмеў быць простым і выкшталцоным, сьцісылм майстрам санэту і шматслоўным апавядальнікам у вершах, ён мог сумяшчаць у сабе гарачага рэвалюцыянэра і лірыка-дэкадэнта, антыклерыкала і хрысьціянскага дыдактыка, апантанага сацыяліста і шчырага нацыяналіста. І пад тое — заўжды заставацца самым сабою. Паэзія Івана Франка як вялікі аркестар, яе цяжка ацаніць, пачуўшы некалькі нотаў, але добра ўслухаўшыся, расчытаўшы — нельга ня ўразіцца. Зробленага ім ставала б для многіх, а зрабіў гэта адзін чалавек.

**Юрась Пацюпа**



## ІВАН ФРАНКО

ЦАР–БОГ

Упрошваў злога духа фараон:
«Прыйдзі, мне трэба рада й дапамога,
Каб мой народ мяне па самы скон
Лічыў за Бога».

Злы дух сказаў: «Пакуль што не пара.
Табе адкрыюць шлях твае ж учынкі,
Дзе будзе многа зла, але дабра
Ані драбінкі».

Стараўся шчыра фараон, лупіў
І мучыў люд, ажно зямля стагнала.
«Цяпер, — злы дух урэшце заявіў, —
Пара настала».

«Чаму цяпер?» — рэк фараон. «Пара,
Бо ў страху люд трымаць ужо нязмога,
Хіба што ўмовіцца яму цара
Лічыць за Бога.

Бо так тваё ярмо гняце і б’е,
Што ўжо не пратрымаесься на сіле,
Адно хутчэй намовім, каб цябе
Богам лічылі».

НАВУКА

Хоць злы тыран яе адвеку б’е
І без канца яе сьцігуе ўлада,
Хоць цемра ў дамавіну ўкласьці рада,
Аднак яна праз цэлы век жыве.

Хоць злы віхор над ёй адно шалее,
Хоць Божым імем поп яе кляне,
Хоць дэспата рука яе вызнаўцаў гне,
Яна прастаецца, расьце й мацнее.

Хоць сьвет блукае часта мінавіцай,
Яна — спакойны, шчыры павадыр
Шукае выйсьця з найцямнейшых дзір.

Хоць з роспачы і цемры крыкам ненавісным
Клянуць яе людцы, яна кляцьбы ня чуе
І для дабра іх абы час працуе.

НЕ ПАРА!..

Не пара, не пара, не пара
Маскалю або ляху служыць;
Бо распалася ўкраінскай крыўды гара —
Нам пара дзеля Ўкраіны жыць!

Не пара, не пара, не пара
Нам за выпарткаў ліць сваю кроў
І любіць, што лупіў нас, чужога цара;
Дзеля Ўкраіны наша любоў.

Не пара, не пара, не пара
Ў роднай хаце цярпець розных зьвяг.
Хай загіне праклятай нязгоды мара,
Пасьпяшай пад Украіны сьцяг!

Бо пара ўжо змагацца насьмерць
У заўзятай, цяжкой барацьбе —
Мы паляжам, каб славу, і волю, і чэсьць
Асягнуць, Родны Краю, табе!..

*3 лютага 1916 г.*

З украінскае мовы пераклаў
Юрась Пацюпа

# Ленарт Мэры

Наколькі постаць Мілошавіча сымбалічна ўвасабляе змрок тыраніі, настолькі постаць Мэры — вызваленьне ад яе. Піша **Сяргей Богдан**.



**Ленарт Мэры сыходзіць у адстаўку.**

14 сакавіка памёр колішні прэзыдэнт Эстоніі Ленарт Мэры. На тле сьмерці Мілошавіча ў камэры Міжнароднага трыбуналу гэтая вестка прайшла малазаўважнай. Былыя сэрбскі і эстонскі прэзыдэнты — поўныя процілегласьці адзін аднаму. Наколькі постаць Мілошавіча сымбалічна ўвасабляе змрок тыраніі, настолькі постаць Мэры — вызваленьне ад яе.

Ён нарадзіўся ў 1929 г. у сям'і эстонскага дыплямата і рос у Бэрліне й Парыжы. Але ўжо ў 1941 годзе сям'я Мэры была высланая саветамі ў Сібір, дзе дванаццацігадовы Ленарт працаваў на лесапавале. У 1950-я сям'я вярнулася ў Эстонію. У год сьмерці Сталіна Ленарт Мэры скончыў гістфак Тартускага ўнівэрсытэту. Пасьля рабіў драматургам у найстарэйшым тэатры Эстоніі «Ванэмуйнэ», рэжысэрам на Эстонскім радыё, езьдзіў у навуковыя экспэдыцыі, падпрацоўваў таксістам.

Л.Мэры ўвайшоў у эстонскую літаратуру перадусім сваімі падарожнымі нататкамі. Плёнам доўгіх бадзяньняў па Сярэдняй Азіі і Далёкім Усходзе сталі кнігі «Па сьлядох кобраў ды каракуртаў», «У краіну агнявых гораў». Зьняты Мэры ў СССР разам зь фінскімі і вугорскімі кінэматаграфістамі і забаронены да паказу фільм «Вятры Шляху Продкаў» атрымаў срэбны мэдаль кінафэстывалю ў Нью-Ёрку. Мэры ня толькі пісаў, але і згуртоўваў эстонцаў — мацуючы Саюз пісьменьнікаў краю, стварыўшы яшчэ ў 1988 годзе Інстытут Эстоніі, дзеля разьвіцьця сувязяў з замежжам.

З 1988 году Мэры актыўна заняўся палітычнай дзейнасьцю ў рамках Кангрэсу грамадзян Эстоніі, стаўшы таксама чальцом Канстытуцыйнай Асамблеі. У красавіку 1990 году Мэры стаў міністрам замежных спраў ва ўрадзе Народнага фронту і займаўся ўмацаваньнем міжнароднага становішча незалежнай Эстоніі да абраньня ў кастрычніку 1992 году прэзыдэнтам краіны. Адпрацаваўшы на гэтай пасадзе два тэрміны, Мэры сышоў у адстаўку, але працягнуў працу ў Міжнароднай радзе Мэмарыяльнага фонду ахвяраў камунізму і Міжпарлямэнцкай радзе супраць антысэмітызму.

Бог даў яму фантастычнае жыцьцё ў неймаверных абставінах. На захадзе Эўропы ён быў бы, відаць, проста вядомым пісьменьнікам, але «за савецкім часам у пісьменьніка, тэатру ці нават у графічнага афорту Пеэтара Ўласа, на якім намаляваны вялікі самавар, была іншая задача — тая, якую ў нармальных дзяржавах выконваюць парлямэнты, палітычныя партыі ды газэты», — адзначаў Мэры. Ён заўжды казаў, што адчувае сябе эстонскім пісьменьнікам, а Саюз пісьменьнікаў лічыў сваім домам.

Стаць эстонскім пісьменьнікам было няпроста ўжо таму, што складанае жыцьцё не дазволіла яму гадавацца ў цалкам эстонскамоўным асяродзьдзі і, атрымліваючы адукацыю, Мэры чатыры разы мяняў мову, а пасьля, каб дасягнуць майстэрства роднага слова, доўга і старанна мусіў вывучаць слоўнікі. Моўная апантанасьць заўважалася за ім да канца жыцьця, і нават на сёмым дзясятку гадоў ён наракаў, што «эстонская мова — дагэтуль мой галаўны боль», дый аднаго за адным звальняў сваіх прэссакратароў за няведаньне мовы. Мэры не трымаў сьпічрайтэраў і сам пісаў свае выкшталцаваныя прамовы. Няшмат ёсьць такіх мэйнстрымных палітыкаў, чые выступы ды інтэрвію сапраўды цікава чытаць.

Тое, што казаў Мэры, часам нагадвае роздум пісьменьніка: «У нас доўга захоўвалася ілюзія, што досыць аднавіць незалежнасьць, і жыцьцё гарманічна і пасьлядоўна працягнецца з таго, на чым яго перарвалі паўстагодзьдзя таму. Што сёньня мы будзем будаваць дзяржаву гэтаксама хутка, як і ў першыя гады першага пэрыяду незалежнасьці. Але няма сумневу, што ў параўнаньні з 1920-мі гадамі чынавенства нашае дзяржавы некваліфікаванае. Калі Эстонія тады абвесьціла аб сваёй незалежнасьці і з зброяй у руках паўстала на яе абарону, народу ў цэлым не давялося пераходзіць з адной праўнай сыстэмы ў іншую. Царская Расея была, бясспрэчна, праўнай дзяржавай з добра дзейнай судовай сыстэмай. Наадварот, у 1990—1991 гадах мы перайшлі з адной плянэты на іншую. Акурат таму будаўніцтва Эстонскай Рэспублікі забірае гэтулькі часу».

Мэры нагадвае Вацлава Гаўла. І ня толькі пакручастай біяграфіяй. Абодва яны будавалі дэмакратыю на, здавалася, безнадзейнай глебе Сярэдняй Эўропы, абодва імкнуліся ўзьняцца над падступнасьцю рэальнай палітыкі да палітыкі маральнай. Бо акурат ёй, гэтай небясьпечнай зброяй — сумленьнем і маральлю — яны перамаглі некалі магутную камуністычную тыранію. Таму і ў новай Эстоніі Мэры не стамляўся нагадваць: «Мэтай Эстонскай Рэспублікі ёсьць ня рынкавае грамадзтва як такое, мэтай можа быць толькі дэмакратычнае грамадзтва. Вольны рынак ёсьць толькі сродкам на гэтым шляху. Калі сродкі дасягненьня мэты пачынаюць супярэчыць самой мэце, неабходна выбраць новыя». Ён змог пайсьці ў сьвет іншы з спакойнай душой, Эстонія стала свабоднай і дэмакратычнай.



Бульба пад зямлёй спала,
Як пшаніцу прадала,



Але вырашыў ёй лісьце
Каларадзкі жук пагрызьці.



Ухапіўся ён зубамі,
Злосна варухнуў вусамі,



Зжэр бы бульбу з каранём,
Каб ня стрэўся зь вераб'ём.



Верабей жука скляваў,
Бульбу нашу ўратаваў.

Нас вусамі не спужаеш:
Будзеш лезьці — атрымаеш!



Капітан Танака ©

# Бабры наступаюць

Навукоўцы з Акадэміі навук цьвердзяць: колькасьць баброў у краіне перавысіла аптымальна дапушчальныя нормы. У Беларусі сёньня налічваецца больш за 45 тыс. баброў, што засялілі ўсе рэгіёны краіны. Павелічэньне колькасьці жывёлінаў прывяло да таго, што яны сталі прыносіць істотную шкоду лясам, гаспадарцы, дарогам.

Як адзначаюць заолягі, будаўнічая дзейнасьць баброў даводзіць да таго, што затапліваюцца значныя плошчы каштоўных пасадак лесу, сам лес засьмечваецца. Апроч таго, з-за павелічэньня плошчы жыцьцядзейнасьці баброў скарацілася прастора для іншых жывёлаў: аленяў, ласёў, казуляў. Гэта прывяло да таго, што палепшыліся ўмовы для зьвяроў, якія аднесеныя да катэгорыі «шкодных»: ваўкоў, лісіцаў, янотападобнага сабакі.

Чаго толькі ня робіць бабёр, каб шкодзіць беларускай эканамічнай мадэлі разьвіцьця! Яны разрылі мэліярацыйныя сыстэмы практычна паўсюдна ў краіне. Зафіксаваныя шматлікія факты, калі бабры будуюць сваё жытло ў беспасярэдняй блізкасьці ад дарог, пад інжынэрнымі збудаваньнямі, прытым хітруны ладзяць сабе норы даўжынёю да 20—30 мэтраў!

Паводле ацэнак адмыслоўцаў, штогод у Беларусі можна адлоўліваць 3—4 тыс. гэтых жывёлаў, каб аптымізаваць іхную колькасьць. Наш бабёр ужо выключаны з Чырвонае кнігі і ўнесены ў сьпіс паляўнічых відаў. Між тым, як адзначаюць заолягі, «бабры — гэта ня толькі каштоўны мех, але й смачнае й дыетычнае мяса й неабходная ў мэдыцыне «бабровая струя». Пры тым, намякаюць адмыслоўцы, дарослы бабёр можа заважыць больш як 30 кг. Калі справы гэтак пойдуць надалей, то рацыён беларусаў можна будзе істотна ўразнастаіць.

**ПС**


З АРХІВУ А.БЕЛАГА

## КАІСА

# Шах каралю!

У практычнай гульні шах — зьява звычайная. Пры складаньні этудаў творцы да яго досыць часта апэлююць на першым жа ходзе. А вось у асяродзьдзі праблемістаў яшчэ нядаўна ўважалася за ганьбу пачынаць рашэньне з простага нападу на караля. Нават у шматходоўках больш цаніліся «ціхія», бяз шаху, другія-трэція хады.

Часы мяняюцца, і кампазытары мяняюцца зь імі. Цяпер у пэўных шахматных колах усё часьцей і часьцей аднаўляюцца сярэднявечныя традыцыі, калі ў *мансубах* адпачатны шах нікога не бянтэжыў. Канструяваў падобныя задачы славуты сырыец Філіп Стама (XVIII ст.), ня грэбавалі імі і клясыкі XIX ст. — Сэмюэл Лойд, Ўільям Шынкман.

У кампазытарскіх высілках ёсьць псыхалягічны аспэкт: калі задачы рыхтуюцца адмыслова для конкурсу рашэньня, то іхныя аўтары бяруць пад увагу, што дасьведчаны рашальнік адрынае варыянты з шахам. «Цяпер шах на першым ходзе ўжываюць як найменшае ліха, калі трэба рэалізаваць складаную задуму без прыцягненьня вялікіх сілаў», — паясьняе Вадзім Жылко, трэнэр з Лунінца, які ў лютым разам з газэтай «Информ-прогулка» падвёў вынікі 5-га міжнароднага спаборніцтва па складаньні шахпраблемаў.

У трохходоўцы берасьцейскага будаўніка Сьцяпана Дземідзюка, што ў 1997 г. атрымала 1-шы прыз на юбілейным конкурсе «Цырулiку-70» (*дыягр. 1*), галоўным стаўся зьмест, ня форма. Судзьдзю падкупіла тэма

**Дыяграма 1.**



«Фэнікс» (зьнікненьне і новае зьяўленьне белага фэрзя), наяўнасьць правільных матаў пры мінімуме матэрыялу. У гэтым кантэксьце ход 1. Фg6+! выглядае прыстойна (1...Крg6 2. gfФ; 1...Крg8 2. Се6+; 1...Кре7 2. Фе6+).

Задачы з шахам складае і Мікалай Наруць, пэнсіянэр з Плешчаніц. Адну «малютку» прапануем для самастойнага разьвязаньня *(дыягр.2)*.

**Рашыце задачу**

М. Наруць. «Народная воля», 2001. Мат за 3 хады.

**Дыяграма 2.**



**Адказ:** 1. Фс5+; 1...Крb1 2. Фа5!, 1... Крd2 2. Фf4+.

## КАНЦЭРТЫ

**Garadzkija**
**27 сакавіка** (панядзелак)
Менск. Клюб «Графіці». Пачатак а 20-й.
Тэлефон для даведак 8-029-601-99-18.
**28 сакавіка** (аўторак)
Менск. Клюб «Графіці». Пачатак а 20-й.
Тэлефон для даведак: 8-029-671-58-65.

## ІМПРЭЗЫ

**AETERNA: Архаіка і Сучаснасьць**
*Stigmata* й «Крыўя» запрашаюць на І Міжнародны фэст этнічнай і нэафолкавай музыкі *Crivia Aeterna*.
**29 сакавіка** (серада). Менск. Моладзевы тэатар эстрады. 19.00. Даведкі наконт квіткоў: 8-029-646-64-97, 660-27-84; 8-029-708-31-91, 772-14-39.

## ТЭАТРЫ

**опэра**
*на сцэне Цэнтральнага Дому афіцэраў*
**25** (сб) — «Багема».
**26** (ндз) — «Набука».

**Купалаўскі тэатар**
24 (пт) — «Згублены рай».
25 (сб) — «Ромул Вялікі».
26 (ндз) — «Таполевая завея».
*Ранішнія спэктаклі*
**26** (ндз) — «Паўлінка».
*Малая сцэна*
**24** (пт) — «Балада пра каханьне».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**24** (пт) — «Кароль Лір».
**25** (сб) — «Кабала сьвятош».
**26** (ндз) — «Нязваны госьць».

**Тэатар юнага гледача**
**24** (пт) — «А зоры тут ціхія».
**25** (сб) — «Залатое сэрцайка».
**25** (сб) — «Паліяна».
**26** (ндз) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».

## ВЫСТАВЫ

**Юры Палякоў**
Да 15 красавіка ў Гарадзкой мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (Менск, пр.Ракасоўскага, 49) працуе выстава, прысьвечаная памяці скульптара Юр'я Палякова.

## СПОРТ

**Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі**
**Паўфіналы.** Гульні праводзяцца да трох перамогаў
**23 сакавіка** (чацьвер)
«Юнацтва» (Менск) — «Хімвалакно» (Магілёў). Менск. Крыты каток у парку Горкага. 18.30.
«Дынама» (Менск) — «Рыга-2000». Менск. Палац спорту. 18.30.
**24 сакавіка** (пятніца)
«Юнацтва» — «Хімвалакно». Тамсама. 18.30.
«Дынама» — «Рыга-2000». Тамсама. 18.30.
**27 сакавіка** (панядзелак)
«Хімвалакно» — «Юнацтва». Магілёўскі хакейны палац. 18.30.
«Рыга-2000» — «Дынама». Пінькі. Хакейны палац. 18.30.
**28 сакавіка** (аўторак). Чацьвертыя матчы (калі будзе патрэба).
«Хімвалакно» — «Юнацтва». Тамсама. 18.30.
«Рыга-2000» — «Дынама». Тамсама. 18.30.
**30 сакавіка** (чацьвер). Пятыя матчы (калі будзе патрэба).
«Юнацтва» — «Хімвалакно». Крыты каток у парку Горкага. 18.30.
«Дынама» — «Рыга-2000». Менскі палац спорту. 18.30.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 25 сакавіка

**СТВ, 20.15**

«Гульня».

ЗША, 1997, рэж. Дэйвід Фінчэр.

Трымценьнік.

На свой дзень нарodзінаў пасьпяховы бізнэсовец (Майкл Дуглас) атрымлівае запрашэньне на адмысловую гульню. Гульня станецца настолькі востраю, што прымусіць героя кінуцца з даху.
Матэматычна вывераны трылер Дэйвіда Фінчэра.

**БТ, 22.35**

«Віp».

Канада, 2000, рэж. Дэні Вільнёў.

Псыхалягічная мэлядрама.

Гісторыю недарэкі Бібіны распавядае… рыба. Гераіня ехала на машыне і зьбіла мужчыну. Пасьля чаго ейнае жыцьцё пераўтвараецца ў хаос. Яна спрабуе ўтапіць сваю машыну й сваё мінулае, але гераіня атрымала шанец, сустрэўшы Эвіяна…

**СТВ, 00.10**

«Самарыцянка».

Рэспубліка Карэя, 2004, рэж. Кім Кі Дук.

Драма.

Дзьве дзяўчынкі забаўляліся прастытуцыяй. Калі загінула сяброўка, гераіня знаходзіць старых кліентаў і аддаецца ім, каб вярнуць грошы загінулай. Даведаўшыся пра такую «міласэрнасьць», тата гераіні, паліцэйскі, дзейнічае па-свойму…

### Нядзеля, 26 сакавіка

**БТ, 19.10**

«Тэатар».

Вугоршчына—Канада—ЗША—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Іштван Саба.

Драма паводле аднайменнага твору С.Моэма.

Дасьціпная экранізацыя Моэма з царскай і вытанчанай гульнёй Анэт Бэнінг. Прыма, якая старэе, закахалася ў маладога шахрая. Але ён аддае перавагу другараднай актрысулі. Помста прымадонны будзе страшнай.

**СТВ, 20.25**

«Афэра Стывэна Гласа».

ЗША, 2003, рэж. Білі Рэй.

Драма.

Журналіст Стывэн Глас зрабіў імклівую кар'еру — і стаўся адным з самых пасьпяховых аўтараў. Але большасьць ягоных зорных артыкулаў былі хітрымі фальсыфікацыямі. Фільм заснаваны на рэальных падзеях.

**БТ, 22.35**

«Стоенае».

Нямеччына—Італія, 2005, рэж. Міхаэль Ганэке.

Псыхалягічны трымценьнік.

Пасьпяховы буржуа Жорж атрымлівае касэту, зь якой вынікае, што за ягоным домам нехта назірае. Да касэты дадаюцца страхатлівыя дзіцячыя малюнкі. Герой губляе спакой, а стоеныя падзеі мінулага хаваюць тайну… Арт-гаўсны экспэрымэнт М.Ганэке, працяты сацыяльнай крытыкай. Камэра па 15 хвілінаў дае адзін плян, але гэта наўмысная правакацыя гледача.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Распусьнік Джоні Дэп

Распусьнік (Libertine).

Вялікабрытанія, 2004, каляровы, 130 хв.

Жанр: гістарычная драма.

Гісторыя паэта-распусьніка Джона Ўілмата — графа Рочэстэра і фаварыта Чарлза ІІ. Паэт пражыў кароткае (30 гадоў), але надта бурнае жыцьцё ды заслужыў славу скандаліста. Аднак неўтаймаваная цяга да палюбоўных авантураў падарвала ягоныя сілы. Скандаліст памёр ад пранцаў, хоць меў усе шанцы сканаць ад алькагалізму.

Галоўная фішка карціны Лорэнса Данмара — Джоні Дэп у галоўнай ролі, які заўсёды выкшталцона граў людзей дзіўных, маргінальна-нэрвовых. Эдвард — рукі-нажніцы, баязьлівы канстэбль Крэйн, пірат Верабей, транссэксуал ці агент кубінскае дзяржбясьпекі.

Распусьнік часоў Асьветніцтва працягвае традыцыю маральна-вычварных пэрсанажаў. Дж.Ўілмат — цынік і атэіст, які жыве для сябе, і ў гэтым ягоныя жалезныя прынцыпы. Але за нястрыманым геданізмам хаваецца чуйная душа. «Ці я вам падабаюся? Ці я вам падабаюся?» — з надзеяй шэпча герой Джоні Дэпа, каб шакаваць гледачоў гнілою сыфілітычнай маскай.

Застаецца дадаць, што Чарлза ІІ сыграў Джон Малкавіч.

Варта паглядзець.

**АР**

## КІНО НА DVD

**Master Records**
Дзе хаваецца праўда.
Дэтэктыўная мэлядрама, ЗША—Канада—Вялікабрытанія, 2005, рэж. Атам Эгаян.
У ролях: Кевін Бэйкан, Колін Фёрт, Элісан Ломан.
Кар'ера пасьпяховых тэлевядоўцаў абрываецца, калі ў іхнім нумары знаходзяць жаночы труп. Праз трыццаць гадоў журналістка спрабуе высьветліць праўду…
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

**...міліянты і надалей затрымлівалі жыхароў намётавага мястэчка, якія паспрабуюць скарыстацца туалетам па-за плошчай.**




— Куды мы, мама?

— Жыць у намётах. Цяпер я ведаю, як вылекаваць цябе ад нетрыманьня мачы.




**...грузінскія пацукі даведаліся аб тым, што КДБ раскрыў падрыхтаваную спэцслужбамі Грузіі замову супраць Лукашэнкі, у якой важную ролю павінны былі згуляць мёртвыя пацукі, якімі можна атруціць менскі вадаправод.**

**...панкі цікавіліся палітыкай.**




— Гэты лаяўся матам, той меў бруднае адзеньне, той адмаўляўся падпарадкоўвацца міліцыі... Слухай, ніякія мы ня панкі! Мы давераныя асобы Мілінкевіча.

**Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна**

## У НУМАРЫ

### Выбух на Кастрычніцкай плошчы



Плошча вымагае ня толькі рамантыкі, але й біяпрыбіральняў. Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 24.**

### «Ніводзін наш уздых



ня згубіцца намарна». Натальля Бабіна — пра Марыю Вайцяшонак. **Старонка 40.**

### Бабры ідуць



з Чырвонай кнігі у сьпіс паляўнічых відаў. **Старонка 45.**

### Мамантовас замест Мэладзэ



Фэномэн літоўскага року. **Старонка 36.**

### Антымілошавіч



Пра Ленарта Мэры піша Сяргей Богдан. **Старонка43.**




## «НН»

### 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**З усіз старон. Чэнстахова.** На складзі Зігмана нехта ўкраў 67 пудоў людзкіх валасоў. Валасы гэты былі ацэнены на 44 тысячы рублёў. Вінаватых не знайшлі.

...Хоць я жыву ў Горадзі, але ведаю, колькі з нашай вёскі **Эйсьміноўцаў** (Гроодз. губэрні) выехала ў Амэрыку.Выехала ўсяго 7 хлопцаў і 2 дзяўчыны. З таго чысла адзін хлопец вярнуўся з палавінай здароўя, і дзяўчына зрабілася як гуска пасьля Амэрыкі, — значыць асталося 6 хлопцаў і адна дзяўчына. Аднаго хлопца з гэтых шасьці засыпала зямля, дзе капаюць каменны вугаль, другія зарабляюць яшчэ.

**Ільля Дзежка**

**«НН». 1911. №12. 24 сакавіка.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Алесю Ш.** Заўвагі да падручніка, у прынцыпе, прыватныя. Мо лепей накіруйце іх у Міністэрства адукацыі? Будзе больш карысьці.

**Янку Закр-ку.** Ваш ліст атрымалі. Ён будзе ўлічаны і скарыстаны належным чынам.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПЯВУЧЫ ГІБРЫД**

**Прапаную** пявучага гібрыда шчыгла і канаркі з краткамі, 8 мес., па дамове. theokla@tut.by, ICQ 250753860, тэл.: 396-20-03

КНІГІ

**“Наша Ніва”**, “Народная Воля”, кнігі, часопісы, слоўнікі, энцыкляпэдыі, духоўная ды дзіцячая літаратура, музыка ды фільмы на CD на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15:00—19:30). Т.: 707-40-01

**Прапаную кнігі**: энцыкляпэдыя “Беларуская міталёгія”, “Энцыкляпэдыя беларускай мовы”, Л.Геніюш “Споведзь”, У.Сыракомля “Добрыя весьці”, Ядвігін Ш., Ажэшка, “Першы Літоўскі Статут 1529 г.”, вялікі фармат ды шмат іншага. Т.: 294-02-15 (пасьля 18-й)

**Прапаную кнігі**: “Беларуска-польскі размоўнік”, Байкоў-Некрашэвіч “Беларуска-расейскі слоўнік”, Я.Крук “Сымболіка беларускай народнай культуры”, Беларускі кнігазбор: “Летапісы і кронікі”, Каліноўскі, Ян Баршчэўскі, Ластоўскі, Улашчык, Чачот ды іншае, гісторыя, этнаграфія, архітэктура, пераклады. Т.: 753-70-05

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. E-mail: alesknigi@mail.ru; а/с 195, 220030 Менск

**Прапаную**: Лёсік “Збор твораў”, “Беларускі клясычны правапіс”, “Нашу Ніву” (факс. выд.), “Матэматычную энцыкляпэдыю”, дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, стараруской мовах і іншае. Т.: 753-91-96

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| адказны за выпуск | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2521. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 22.03.2006.

Замова № 1458.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а